Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 9 жніўня 1985 г. № 32 (3286) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

Самых патрабавальных скрыпачоў задавальняюць інструменты, зробленыя пенсіянерам з Баранавіч Іосіфам Ульянавічам Дударэвічам. Майстар-самавук зрабіў шаснаццаць скрыпак, якія вытрымалі творчае выпрабаванне на міжнародных конкурсах. Даводзілася ўмельцу рэстаўрыраваць і скрыпкі вядомых італьянскіх майстроў.

Фота С. КРЫЦКАГА.

УНУМАРЫ:

Міхась СТРАЛЬЦОЎ
ВУЗЕЛЬЧЫКІ НА ПАМЯЦЬ
Чытацкі дзённік пісьменніка

●

Вячаслаў ДАШКЕВІЧ
Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК
Новыя вершы

●

Міхась ПАРАХНЕВІЧ
Апавяданне

●

ПРЫСЛУХАЙСЯ ДА СУМЛЕННЯ
ПРЭМ'ЕРА У БРЭСЦКІМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ ІМЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

●

ГУДЗЕВІЦКІ ВАРЫЯНТ
З ВОПЫТУ ШКОЛЬНАГА ЛІТАРАТУРНА-КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

Адстаяць мір!

6 жніўня ў Маскве адбыўся сход грамадскасці ў сувязі з 40-й гадавінай атамных бамбардзіровак японскіх гарадоў Хірасімы і Нагасакі. Ён праведзен савецкімі грамадскімі арганізацыямі ў рамках Тыдня дзеянняў за забарону ядзернай зброі і салідарнасці з ахвярамі атамных бамбардзіровак, які пачаўся ў СССР па закліку Сусветнага Савета Міру.

Выступіўшыя на сходзе расказалі аб масавых антываенных акцыях савецкіх людзей. Іх думкі і спадзяванні знаходзяць канкрэтнае адлюстраванне ў шматлікіх мірных ініцыятывах СССР, апошнім прыкладам якіх з'яўляецца абвяшчэнне ў аднабаковым парадку мараторыя на ўсе выпрабаванні ядзернай зброі, пачынаючы з 6 жніўня.

Удзельнікі сходу аднадушна прынялі рэзалюцыю, у якой гаворыцца, што для савецкіх людзей спыненне гонкі ўзбраенняў, раззбраенне, ліквідацыя ядзернай пагрозы не абстрактная мара, не утопія, а дасягальны практычны арыенцір. Яны глыбока перакананы ў тым, што сілы розуму цяпер дастаткова моцныя, каб паставіць надзейны заслон на шляху тых, хто штурхае чалавецтва да бездані.

●

У межах Тыдня дзеянняў у Кіеве, Мінску, Тбілісі, Фрунзе і Рызе адбудуцца сходы і мітынгі працоўных у сувязі з 40-й гадавінай трагедыі Хірасімы і Нагасакі. У радзе гарадоў РСФСР і Украіны пройдуць вахты міру, прадстаўнікі савецкай грамадскасці сустрэнуцца з японскай дэлегацыяй ахвяр ядзерных бамбардзіровак.

ТАСС.

● НАШЫ ГОСЦІ

МІНСК ВІТАЕ ТАМІЧОЎ

У сталіцу Беларусі яны выехалі з Віцебска ранкам першага жніўня. Ля Кургана Славы іх урачыста сустрэлі шэфы — мінскія трактаразводцы. Назаўтра прадстаўнікі Томскага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатра драмы сабраліся ў рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў на прэс-канферэнцыю. Гасцямі журналістаў, крытыкаў, тэатральнай грамадскасці Мінска былі народная артыстка РСФСР Л. Далматава, заслужаны артыст У. Варанцоў, заслужаныя работнікі культуры РСФСР С. Каралёў і У. Сямёнаў, акцёры М. Мохаў, А. Аркін, галоўны рэжысёр калектыву М. Барысаў, дырэктар А. Жаравін.

Тамічы расказалі пра гісторыю, традыцыі і надзённыя праблемы свайго краю, горада, тэатра (сёлетнімі гастролямі ён распачаў свой 127-мы сезон). Кожны пяты жыхар Томска — студэнт. Кожны дзесяты—навуковец. У горадзе чатыры тэатры, філармонія... Тут багатае культурнае жыццё, тут ведаюць і любяць, гасцінна прымаюць вядучых майстроў мастацтваў краіны.

Прыгадайма, што ў «ЛіМе» ўжо была публікацыя пра сёлетнія абменныя гастролі купалаўцаў і тамічоў, прысвечаныя 40-годдзю Перамогі: на нашых старонках выступала адна з вядучых актрыс Томскага тэатра Л. Далматава.

А гастрольнае лета тэатр пачаў у Віцебску. Ліпень у Віцебску запомніўся нашым гасцям як месяц плённых творчых і сяброўскіх сустрэч, яркіх уражанняў. Сібіракі, прынамсі, пазнаёміліся з капітанам у адстаўцы віцябчанінам Г. Блахіным. У гады Вялікай Айчыннай ён камандаваў разведротай 36-ай асобнай курсанцкай стралковай брыгады, якая была сфарміравана пад Томскам і па-геройску ваявала на Віцебшчыне.

2 жніўня спектаклем «Салёная ўпадзіна» паводле С. Залыгіна пачаліся гастролі тамічоў у Мінску. У Доме афіцэраў і на сцэне Рускага тэатра БССР імя М. Горкага нашы госці паказваюць самыя розныя свае работы, якія зацікавяць і масавага гледача, і дасведчанага тэатрала. На афішах — «Эшалон» М. Рошчына, «Завіруха» В. Раздольскага, «Толькі праўда» Ж-П. Сартра, некалькі твораў камедыйнага жанру. У спектаклі «Васа Жалязнова» М. Горкага поруч з тамічамі будуць удзельнічаць і акцёры Ленінградскага тэатра драмы імя А. Пушкіна. Бо існуе паміж гэтымі тэатрамі дагавор аб творчай садружнасці, наладжаны абмен удзельнікамі спектакля «Васа Жалязнова», які сёння ў рэпертуары абодвух калектываў.

Амаль чатыры тысячы кіламетраў паміж Томскам і Мінскам. Ды сёння гэтага «бар'еру адлегласці» мы не адчуваем. Старэйшы тэатр Сібіры — упершыню ў нас у гасцях.

С. ВЕТКА.

На здымку: сцэна са спектакля «Салёная ўпадзіна».
Фота П. КАСТРАМЫ.

● ЛІТАРАТУРНАЯ ХРОНІКА

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

У выдавецтве «Навука і тэхніка» пабачыла свет падрыхтаваная супрацоўнікамі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР кніга «Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20—30-х гадоў». Як сведчыць у прадмове П. Дзюбайла, «аўтары... імкнуліся раскрыць месца і ролю ў літаратурным працэсе 20—30-х гадоў тых пісьменнікаў, творчасць якіх яшчэ не была прадметам спецыяльнага, манаграфічнага даследавання, не ацэнена належным чынам у гісторыі літаратуры, хоць яна пакінула прыкметны след у станаўленні беларускай савецкай літаратуры».

У зборнік увайшлі манаграфічныя нарысы, у якіх аналізуецца творчасць А. Александровіча, А. Дудара, Я. Пушчы, П. Труса, У. Хадыкі, С. Баранавых, В. Каваля. Б. Мікуліча, Р. Мурашкі, Я. Нёманскага, Х. Шыннклера.

Аўтарамі з'яўляюцца Л. Гарэлік, М. Ярош, А. Верабей, Л. Савік, Т. Грамадчанка, Т. Строева, А. Лысенка.

Ю. ЛЯХОВІК.

ЛЮДЗІ І КНІГІ

Вядомы савецкі пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Дружба народов» Сяргей Баруздзін працуе і ў галіне крытыкі. У прыватнасці, двума выданнямі — у 1978 і 1982 гадах — выходзіў зборнік яго нататак «Людзі і кнігі» аб творчасці 67 паэтаў, празаікаў — прадстаўнікоў шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

Толькі што ў выдавецтве «Советский писатель» пабачыла свет новая кніга «Пісьменнік. Жыццё. Літаратура» — па сутнасці працяг папярэдняга зборніка. На гэты раз С. Баруздзін выносіць на суд чытача 44 партрэты савецкіх і замежных пісьменнікаў.

Сярод тых, да чыёй творчасці звяртаецца аўтар, народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін. Даючы высокую ацэнку творчасці І. Шамякіна, ён зазначае, што ў ёй «заўсёды захапляла і захапляе цеснае адзінства гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы і тэмы вострасучаснай. Так, відаць, і павінна быць, бо без гісторыі няма сучаснасці, а сучаснасць не існуе без позірку ў заўтрашні дзень. І ўсё ж гэта цудоўнае спалучэнне. Пачуццё арганічнай узаемасувязі гісторыі і сучаснасці дапамагае пісьменніку ў мастацкім асэнсаванні важнейшых тэм».

В. ЦЯРЭШКА.

ЗАПЛАНАВАЛА «РОМАН-ГАЗЕТА»

Рэдакцыйная калегія самага папулярнага перыядычнага літаратурнага выдання «Роман-газеты» зацвердзіла спіс твораў, з якімі чытачы пазнаёмяцца у наступным годзе. Сярод аўтараў будуць прадстаўлены і беларускія пісьменнікі. Мяркуецца надрукаваць раманы «Свае і чужынцы» І. Чыгрынава і «Петраград — Брэст» І. Шамякіна.

В. БАЛАШОЎ.

● ВЫСТАЎКІ

С. Андруховіч. «Янка Купала».

Радзіма Сцяпана Андруховіча — Міншчына. Нарадзіўся ён у вёсцы Губіна, што ў Уздзенскім раёне, у 1908 годзе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ ў даваенныя гады прымаў удзел у рэспубліканскіх выстаўках, а карціна «Арышт бальшавікоў - падпольшчыкаў» экспанавалася ў 1940 годзе ў Маскве, калі праходзіла дэкада беларускага мастацтва.

Цяпер з творчасцю С. Андруховіча можна пазнаёміцца на яго персанальнай выстаўцы, што адкрыта ў Палацы мастацтваў. У экспазіцыі прадстаўлены работы, якія сведчаць аб шматграннасці творчых інтарэсаў аўтара, яго схільнасці да жанравай і тэматычнай разнастайнасці. Нямала партрэтаў—народнага песняра Беларусі Янкі Купалы, а таксама вясковых працаўнікоў: «Цялятніца калгаса імя Дзяржынскага Я. Бандаляк», «Ветэран Вялікай Айчыннай вайны М. Севярын», «Свінарка калгаса імя Жданава Я. Галоўкіна» і іншыя.

Ю. ЛАПІЧ.

●

Не так даўно Саюз мастакоў СССР арганізаваў спецыяльную творчую групу мастакоў-акварэлістаў, якая была накіравана на гераічную Брэстчыну.

Сорак дзён працягвалася творчая камандзіроўка. Менавіта сорак, бо сама паездка прысвячалася 40-годдзю Перамогі над фашызмам. За гэты час быў створаны не адзін дзесятак работ.

Каля 70 з гэтых твораў прадстаўлена цяпер на выстаўцы, яная адкрылася ў выставачнай зале Саюза мастакоў рэспублікі ў Мінску. Агульная тэма, якая аб'ядноўвае работы, — мінулае і сённяшняе. Брэсцкая крэпасць-герой і гераізм савецкага народа ў барацьбе з нямецка - фашысцкімі захопнікамі.

Г. КОТАЎ.

●

Мацвей Беляніцкі належыць да старэйшага пакалення беларускіх мастакоў. Пражыўшы доўгае жыццё (нарадзіўся ў 1909 годзе), ён напісаў нямала палотнаў. У творчым набытку М. Беляніцкага — сюжэтна - тэматычныя карціны, якія адлюстроўваюць гісторыка-рэвалюцыйную праблематыку, як, напрыклад, «М. І. Калінін на мітынгу сярод беларускіх сялян у 1919 годзе», «Паўстанне сялян, 1905 г.», «Першы арышт Якуба Коласа» і іншыя, а таксама творы, прысвечаныя жыццю сучаснай вёскі.

На персанальнай выстаўцы М. Беляніцкага, якая працуе ў Палацы мастацтваў, можна пазнаёміцца з работамі, створанымі ў розныя гады.

Р. ПАТАПАЎ.

М. Беляніцкі. «Фашысцкая грабармія на Беларусі». 1942 г.

● АРБІТАМІ СЯБРОЎСТВА

І ЗАСПЯВАЛА ЎСЯ ЛІТВА...

Нядаўна паўнаўладнымі гаспадарамі Вільнюса адчувалі сябе Музыка, Песня, Танец. З усіх куткоў Літвы з'ехаліся лепшыя з лепшых самадзейных артыстаў на рэспубліканскае Свята песні, якое адбываецца раз у пяць гадоў. Сёлетнія ўрачыстасці прысвячаліся дзвюм слаўным датам — 40-годдзю Вялікай Перамогі савецкага народа над нямецкім фашызмам і 45-годдзю ўстанаўлення Савецкай улады ў Літве.

Тры дні ў гасцінная сталіцы Савецкай Літвы ішоў агляд лепшых ансамбляў, хораў і танцавальных калектываў.

Ганаровымі гасцямі свята былі кампазітар А. Пахмутава і паэт М. Дабранраваў. У адзін з вечароў прагучала песня «Шчасця табе, Літва», напісаная імі спецыяльна для гэтага фестывалю.

Свята песні віталі госці з Польшчы, Венгрыі, Чэхаславакіі, ГДР, Аўстрыі, Даніі, ФРГ, Францыі, Фінляндыі і Швецыі.

Разам з пасланцамі раёнаў і гарадоў Літвы ў Віль-

Гучыць шматтысячны хор у парку Вінгіс.

Жанна Іванцова — удзельніца ансамбля «Рэха».

● ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ —

ТРЭЦІ МЕСЯЦ У БЕЛАРУСІ

Пачаўся трэці месяц работы Калінінскага дзяржаўнага драматычнага тэатра ў Беларусі, і цяпер ужо можна сказаць, што гэтае гастрольнае лета для тэатра — на рэдкасць удалае. Справа тут не толькі ў прызнанні гледача, у той высокай ацэнцы, якую дае тэатру беларуская тэатральная крытыка. Галоўнае ў тым адчуванні творчай адухоўленасці, што спадарожнічае кожнаму нашаму акцёру. Акцёр жа заўжды адчувае дыханне аўдыторыі, і калі бачыць жывыя позіркі гледачоў — спазнае хвіліны шчасця і тады, здаецца, можа ўсё...

Наш трэці гастрольны месяц праходзіць у Магілёве. Мы спадзяёмся на новыя сустрэчы, думаем пра тое, а што б яшчэ маглі паказаць беларускім гледачам. Беларуская драматургія, якая апошнім часам выйшла на вядучыя пазіцыі, выклікае ў нас асаблівую цікавасць. Таму такімі важнымі для калектыву аказаліся сустрэчы з вядомымі беларускімі літаратарамі.

Першым нашым госцем быў А. Дударaў, адна з п'ес якога — «Радавыя» — пастаўлена нядаўна і калінінскім тэатрам. Драматург расказаў нам пра свой творчы шлях, падзяліўся планамі. Цікавая гутарка наладзілася ў нас з С. Алексіевіч. Як узнікае задума кнігі, які шлях да яе ўвасаблення, — гэта цікавіла калінінскіх акцёраў. І, вядома, гаворка ішла пра адказнасць мастака, пра тую ролю, якая наканавана яму ў грамадстве.

Тэатр быў запрошаны ў тэатральную гасціную імя У. Галубка. Пра гісторыю беларускага савецкага тэатра, пра людзей, што былі каля вытокаў гэтай гісторыі, паведаміў нам мастак А. Наліваеў. Думкамі пра сучасную драматургію, сваімі меркаваннямі пра сучаснага героя падзяліліся драматургі А. Петрашкевіч і А. Асташонак.

Ужо нямала сустрэч было ў нас на беларускай зямлі. Многае застанецца ў нашай удзячнай памяці. Тут мы знайшлі новых сяброў, аднадумцаў — і гэта будзе падтрымліваць нас у жыцці і ў працы надалей.

Р. ДЗКУЯ,
памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Калінінскага дзяржаўнага драматычнага тэатра.

Леанід ПРАНЧАК



Першапраходцы

Што ні лёс—
Гісторыя будоўлі.
Што ні чалавек—
То адкрыццё.
БАМ для іх—
Старонка шчаснай долі.
Іншаму—
Хапіла б на жыццё.
У тайзе іх скінуў верталёт.
У зямлю не ўбіць—
Прамерзла—
Палі.
Снег.
Мароз.
Пад настам снегу—
Лёд...
Тут дагэтуль
Людзі не ступалі.
Абжываюць новае жытло.
Іх не зразумець ніколі скнарам.
Гарадоў узведзеных святло
Свеціць іх палаткам і гітарам.
Шчырыя, харошыя сябры,
Класікі прасек,
Што трэба хлопцы.
Іх жыццё не тлее,
А гарыць.
Рыцары тайгі—
Першапраходцы.
Знаю іх
Не з фільмаў і не з кніг
Не адзін
Сумесна
Дом зрубілі.
Плечы БАМа,
Волаты!
Пра іх
Мне пісаць
Высокім самым стылем.

Задажджыла...

Маналог Сяргея ЛЯМЯКІНА

Зноў не будзе пошты.
Задажджыла...
Незапланаваны выхадны.
Закурылі хлопцы,
Затужылі
У глушы закінутай—
Адны...
Раздзірае лёгкія
Махорка.
Швэндаемся,
Нібы гультаі.
На душы ўстрывожана і горка:
Размываюць насып ручаі...
Толькі пачалі адсыпку трасы,—
Ўсё з гразёй змяшалася цяпер.
І буксуюць стомленыя МАЗы,
І вадой запоўнены кар'ер...
Дождж абложны,
Нудны і бясконцы.
Абурацца
Не хапае слоў.
Хочацца цяпла і сонца...
Сонца!
Цяжкай працы—
Аж да мазалёў.
Сварымся.
Злуемся.
Што за доля?
Мокрая распухлая зямля.
Дождж.
Туман.
Знямелая будоўля.
Рукі
Ад бяздзейнасці
Баляць...

Даеш цеплатрасу!

Даеш цеплатрасу!
Дзяўблі мерзлату.
Засмужана хмарамі сонца нядзелі.
А сівер сцінаў і закоўваў слату.
Пасёлак заціх і чакаў у надзеі...
Чакаў—
Як збавення ад сцюжы—
Цяпла.
Цягнула марознай зімой ад Байкала.
Завея вятрамі зласліва гула,
Як ведзьма насілася і бушавала
Ажно захлынаўся адбойнік наўзрыд...
Мы спрэчку вялі
З непадатлівым часам.
Вышэй асабістых пачуццяў і крыўд—
Была
Цеплатраса.
Грымелі узрывы і шырыўся роў.
І адступала тайга наравіста.
Наперадзе тых,
Хто у буру пайшоў,
Былі камсамольцы і камуністы.
Мы вырвалі трасу у маразоў.
Пра мужнасць і подзвіг пісалі газеты.
Было за цяпло—
Мо у сотні разоў—
Цяплей ад таго,
Што пасёлак сагрэты.

Нерунгры

Маналог Канстанціна ЖЫРНОВА

Завеі гулі,
Як чэрці.
Былая зямля пакут.
Стагоддзі лагчына смерці
Маўкліва ляжала тут...
Вугаль, як на далоні,
Раскрылі сховы вякоў.
Пустэча была.
А сёння—
Горад вугальшчыкоў.
Дэсантам з кастра пачаты,
Узняты на мерзлаце
Мой горад—
Мой лёс крылаты—
Будуецца і расце.
Не быў бы тут сам,
То, можа,
Сказаў бы, што веры не дам.
Праз сопкі па бездарожжы
Я вёў па Якуціі БАМ.
Юнацтву пакорны смерчы.
Мужным—
Не да ныцця.
Стала лагчына смерці
Увасабленнем жыцця.
Завеі гудуць,
Як чэрці.
Былая зямля пакут...
А для мяне, паверце,—
Родны і блізкі кут.

нюс прыехалі прадстаўнікі самадзейных калектываў РСФСР, Беларусі, Латвіі, Эстоніі. Народны ансамбль «Рэха» Столінскага раённага Дома культуры прадстаўляў на гэтым фестывалі нашу рэспубліку. Калектыў, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца М. Бараўкоў, існуе чатыры гады.

У першы дзень гаспадарамі Нагорнага парку сталі народныя ансамблі. Перад гледачамі выступіў праслаўлены калектыў — акадэмічны ансамбль песні і танца Савецкай Арміі пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Б. Аляксандрава. Цікавы факт: удзельнікі калектыву выступалі ў Літве сорак пяць гадоў назад, адразу жа пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў рэспубліцы. Адну з песень сёлетняй праграмы артысты выканалі на літоўскай мове.

Другі дзень быў прысвечаны песні. Тысячы жыхароў Вільнюса выйшлі на вуліцы, каб убачыць шэсце ўдзельнікаў свята. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі буйных гарадоў і 44 раёнаў Літвы. У кожнай дэлегацыі была свая форма, свае эмблемы. Майстры самадзейнага мастацтва прыехалі ў Вільнюс трымаць творчую справаздачу. У вялікім гарадскім парку Вінгіс і адбылося Свята песні. На ім прысутнічалі кіраўнікі Камуністычнай партыі і ўрада рэспублікі, ветэраны вайны і працы. Закончылася выступленне шматтысячнага хору, і адразу ж эстраду запоўнілі юныя спевакі. Потым гучала музыка ў выкананні духавых аркестраў, вясковых капэл. У заключэнне ўсе спевакі, усе ўдзельнікі свята, а разам з імі і гледачы падхапілі песню Б. Дварыёніса на словы Э. Межэлайціса «Дзе Нёман цячэ».

Самыя разнастайныя танцавальныя кампазіцыі ўбачылі вільнюсцы і госці на стадыёне «Жальгірыс» у трэці дзень свята. Каля васьмі тысяч танцораў паказалі гледачам сваё мастацтва.

Тэкст і фота А. КАЛЯДЫ.

Столінскі народны ансамбль «Рэха» на вуліцах Вільнюса.

Танцоры на стадыёне «Жальгірыс».

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ

Усім, хто цікавіцца культурным жыццём нашай рэспублікі, хто ўважліва сочыць за падзеямі беларускай літаратуры, тэатра, музыкі, кіно, выяўленчага мастацтва, хто кіруе ўстановай культуры альбо калектывам мастацкай самадзейнасці, — трэба ведаць, што

З 1 ЖНІЎНЯ 1985 ГОДА АДКРЫЛАСЯ ВЕДАМАСНАЯ І ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ПАДПІСКА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА» НА 1986 ГОД.

Падпіска заканчваецца 31 кастрычніка (ведамасная — 31 жніўня) 1985 года.

ДА 80-ГОДДЗЯ РЭВАЛЮЦЫІ 1905—1907 ГАДОЎ У РАСІІ

УЗОРЫ ПРАЛЕТАРСКАГА ГЕРОЙСТВА

Вясна і лета 1905 года адметныя далейшым уздымам рэвалюцыйнага руху ў Расіі. Ва ўсіх кутках краіны адбілася рэха забастоўкі рабочых Іванава-Вазнясенска, якая пачалася ў маі і працягвалася 72 дні. Для кіраўніцтва забастоўкай быў абраны Савет рабочых дэпутатаў — адзін з першых у Расіі.

Вялікую ролю ў развіцці рабочага руху адыгралі майскія палітычныя стачкі, у якіх удзельнічала 220 тысяч фабрычна-заводскіх рабочых, а ў чэрвені-ліпені — 308 тысяч чалавек. У некаторых гарадах Расіі адбыліся буйныя ўзброеныя выступленні рабочых. Вулічныя баі летам 1905 года, як адзначаў У. І. Ленін, «паказалі... узоры пралетарскага герайства і народнага энтузіязму».

Дакументы, якія сёння публікуюцца ў «Літаратуры і мастацтве», яскрава сведчаць аб шырокім удзеле працоўных мас Беларусі ў рэвалюцыйным руху. І сёння адчуваеш гонар за людзей, што, не зважаючы на жорсткі апарат прымусу — жандармерыю, паліцыю, царскі суд і турмы, самааддана змагаліся за свабоду і раўнапраўе, за сацыялізм.

І яшчэ адну акалічнасць, якая вынікае з гэтых дакументаў, хочацца падкрэсліць. Гэта актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях інтэлігенцыі. Менавіта ў такім кантэксце ўспрымаюцца дакументы аб антыўрадавых выступленнях у мінскім таварыстве выяўленчага мастацтва і музыкі, дэманстрацыях і маніфестацыях у час спектакляў, музычных і літаратурных вечароў.

Натуральна, дакументы, якія публікуюцца сёння на старонках «ЛіМа», паказваюць толькі асобныя штрыхі падзей тых векапомных дзён на Беларусі. Вось яшчэ некалькі яскравых фактаў. У Мінску 1 мая 1905 года ў розных частках горада адбыліся рабочыя маніфестацыі, у якіх удзельнічала больш як 1000 чалавек. Каля турмы дэманстранты ўзнялі сцягі-транспаранты з лозунгамі «Далоў самадзяржаўе!», «Васьмігадзінны рабочы дзень!», «Няхай жыве РСДРП!». У Гомелі, Бабруйску, Гродне і іншых гарадах баставалі ўсе прадпрыемствы. У Оршы палітычная дэманстрацыя скончылася сутычкай з паліцыяй. На працягу мая, чэрвеня, ліпеня стачачным рухам у той ці іншай ступені былі ахоплены амаль усе прамысловыя гарады Беларусі. Многія мясцовыя групы РСДРП кіравалі стачкамі, фармулявалі патрабаванні рабочых, рыхтавалі пралетарыят да ўзброенага паўстання.

З кожным днём, з кожным месяцам пашыраўся і рэвалюцыйны рух у вёсцы. Ён сведчыў пра пачатак фарміравання рэвалюцыйнага саюза рабочага класа і сялянства.

Рапарт мінскага паліцмайстра мінскаму губернатару аб супрацьурадавых выступленнях на пасяджэннях мінскага таварыства выяўленчага мастацтва і музыкі.

7 красавіка 1905 года.

У існуючым у г. Мінску Таварыстве аматараў выяўленчага мастацтва і музыкі, якое арандуе памяшканне ў доме Капеліёвіча па Захар'еўскім завулку, у апошні час збіраюцца асобы на розныя сходы, на якіх яны дэманструюць сваю злачынную дзейнасць, выступаючы супраць урада і тым самым узбуджаючы незадаволенасць існуючымі парадкамі.

Таварыства гэтае мае глядзельную залу са сцэнаю, наладжвае спектаклі, сямейныя вечары і лекцыі, на якія публіку пускаюць па білетах і па рэкамендацыях членаў таварыства. Пад прыкрыццём такіх сходаў там выступаюць прамоўцы, якія дыскутуюць на розныя дзяржаўныя тэмы і кожны раз заканчваюць прамову заклікамі: «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве свабода!» і г. д.

З такіх дзеянняў укажу наступныя: 18 лютага гэтага года ў глядзельнай зале адбывалася чытанне лекцыі. Усе білеты былі распрададзены, зала была перапоўнена. Пасля лекцыі месца лектара заняла невядомая жанчына, якая звярнулася да прысутных з прамовай, у якой, між іншым, была выказана надзея на тое, што стары рэжым у рэшце рэшт будзе звергнуты. Пры гэтым прамову сваю закончыла словамі: «Няхай жыве дэмакратызм!», на што публіка пачала крычаць: «Далоў самадзяржаўе! Ура!». Далейшыя падзеі таго вечара засталіся невядомымі, бо паліцэйскі чыноўнік, які там прысутнічаў, выйшаў, каб аб усім далажыць начальству, але наназад у залу яго не пусцілі. Калі потым публіка пайшла, у зале было падабрана 289 экземпляраў пракламацый рознага зместу.

2 сакавіка тут адбывалася гутарка аб «нацыяналізме». У залу ўвайшло без дазволу каля ста чалавек, звыш тых, хто меў білеты. Яшчэ больш гэтай колькасці асоб сабралася на вуліцы каля памяшкання таварыства, не жадаючы разысціся па патрабаванні паліцыі. Натоўп давялося разагнаць казакамі.

4 красавіка адбылося пасяджэнне літаратурнай секцыі, на якое публіка дапускалася па рэкамендацыі членаў таварыства. У ліку прамоўцаў выступіў невядомы чалавек, якога іншыя асобы называлі Грыгор'евым. Сваю прамову ён пачаў з таго, што цяпер не той час, каб займацца філасофскімі пытаннямі, калі на вайне гіне столькі народу. У заканчэнне прамоўца выгукнуў: «Няхай жыве свабода! Далоў самадзяржаўе!». Прысутныя сустрэлі гэтыя словы апладысментамі.

З данясення дырэктара Віцебскага трамвая ў Віцебскую гарадскую думу аб забастоўцы служачых. 13—17 мая 1905 г.

Забастоўка, якая адбылася 13, 14, 15, 16 і 17 мая, прывяла да спынення трамвая. Адзіным сродкам спыніць забастоўку было пагадненне з забастоўшчыкамі, і я зрабіў у гэтым напрамку ўсё, што ад мяне залежала.

У іншых месцах забастоўкі трамваяў былі больш працяглыя: у Тыфлісе — 19 дзён, у Астрахані — 9 дзён, у Жытоміры, Смаленску, Коўна, Лібаве амаль столькі ж. Забастоўка трамвайшчыкаў, якая пачалася 6 чэрвеня ў Мінску, працягваецца дагэтуль, забаставалі трамваі ў Кіеве, Варшаве і Лодзі, баставаў трамвай і ў Маскве.

З данясення начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення мінскаму губернатару аб падрыхтоўцы насельніцтва да ўсеагульнай узброенай дэманстрацыі ў г. Мінску.

7 чэрвеня 1905 г.

Па атрыманых мной агентурных звестках рэвалюцыйныя дзеячы паспяхова агітуюць сярод рабочых і інтэлігенцыі за ўсеагульную ўзброеную дэманстрацыю, якую ставяць сваёй мэтай арганізаваць у горадзе Мінску ў бліжэйшы час. Для гэтай мэты... прапанавана набыць і раздаць зброю.

Разам з тым, арганізацыя для гэтай жа мэты адпраўляе прамоўцаў трох... у горад Барысаў... Старыя Дарогі.

З рапарта рэчыцкага павятовага спраўніка мінскаму губернатару аб забастоўцы брукароў на будаўніцтве шасейнай дарогі ў мястэчку Калінкавічы.

15 ліпеня 1905 г.

Прыстаў 3 стана рапартам ад 12 чэрвеня за № 43 паведаміў мне, што 9 чэрвеня ён быў выкліканы інжынерам па дарожнай частцы мінскай губернскай управы па справах земскай гаспадаркі ў мястэчку Калінкавічы з выпадку забастоўкі рабочых, якія працавалі на шашы ва ўказаным мястэчку.

...Каб выйсці з гэтага становішча, падрадчык вымушаны быў увайсці з рабочымі ў новае пагадненне і павысіць аплату працы.

З рапарта навагрудскага павятовага спраўніка аб агітацыі селянінам М. Маркевічам сялян да забастоўкі і прад'яўленні патрабаванняў аб павелічэнні падзённай аплаты.

27 чэрвеня 1905 г.

...селянін... Райчанскай воласці М. Маркевіч... падбухторваў сялян да забастоўкі і да прад'яўлення патрабаванняў аб павелічэнні падзённай аплаты.

Рапарт лепельскага павятовага спраўніка віцебскаму губернатару аб мітынгу моладзі ў м. Бешанковічы.

12 ліпеня 1905 г.

Вечарам 9 ліпеня моладзь, пераважна рабочая, з выпадку суботы, накіравалася, як ужо павялося, на прагулку ў лес, размешчаны за паўвярсты ад м. Бешанковічы, дзе натоўп каля 200 чалавек пачаў крычаць: «Далоў самадзяржаўе, далоў урад, няхай жыве свабода! Ура!», затым з гэтым крыкам накіраваўся ў Бешанковічы.

Загад магілёўскага губернатара горацкаму павятоваму спраўніку аб арышце кіраўнікоў дэманстрацыі.

13 ліпеня 1905 г.

...Прадпісваю вашаму высокаблагароддзю не марудзячы арыштаваць і накіраваць у Магілёўскую турму галоўных завадатараў беспарадкаў, якія адбыліся ў г. Копысі 11 ліпеня, копысьскіх фабрычных рабочых: Д. Шура, К. Соркіна, С. Стрыжэвіча, С. Гарлача, Х. Лук'янава, Я. Аладзю, П. Сінельнікава, З. Мільто, Л. Хайкіна, Н. Гарлача, П. Сазоненка, В. Міронава.

Рапарт слуцкага павятовага спраўніка мінскаму губернатару аб мітынгу у м. Капылі, арганізаваным групай сацыял-дэмакратаў.

16 ліпеня 1905 г.

10 ліпеня ў 9 гадзін вечара ў м. Капыль у розных месцах заўважаны ўзмоцнены рух асоб, якія належаць да мясцовай сацыял-дэмакратычнай партыі, у выніку чаго быў узмоцнены ваенны патруль.

Пры абходзе паліцэйскім ураднікам мястэчка з патрулём у колькасці 7 чалавек каля паўночы быў заўважаны на Клецкай вуліцы натоўп больш як сто чалавек, які складаўся пераважна з сацыял-дэмакратаў.

Цыркуляр дэпартамента паліцыі губернатарам, граданачальнікам і варшаўскаму обер-паліцмайстру аб недапушчэнні супрацьурадавых дэманстрацый, маніфестацый у час спектакляў, музычных і літаратурных вечароў.

31 ліпеня 1905 г.

Апошнім часам асабліва часта маюць месца выпадкі супрацьурадавых дэманстрацый і маніфестацый, прычым прадстаўнікі нядобранадзейных элементаў грамадства для гэтай мэты карыстаюцца спектаклямі, музычнымі і літаратурнымі вечарамі, якія афіцыйна дазваляюцца. Беспарадкі, якія тут учыняюцца, патрабуюць энергічных мер з боку адміністрацыі, што цягне за сабой ахвяры як з боку ўдзельнікаў, так і чыноў паліцыі.

Улічваючы цяперашні трывожны час, дэпартамент паліцыі лічыць мэтазгодным, каб мясцовыя ўлады з асцярогай давалі дазвол на такія вечары, канцэрты і г. д. У выпадку такога дазволу мясцовая адміністрацыя павінна паклапаціцца аб падтрымцы парадку. Пры малейшых спробах учыніць супрацьурадавыя дэманстрацыі і маніфестацыі на вечарах паліцыя павінна прымаць самыя энергічныя меры да хуткага аднаўлення парадку.

З пастановы віцебскага губернатара аб дэманстрацыі ў м. Колышкі Віцебскага павета.

8 жніўня 1905 г.

9 ліпеня ў м. Колышкі Віцебскага павета на базарнай плошчы ўвечары сабраўся натоўп моладзі, усяго да 60 чалавек, які спачатку спяваў нейкую песню рэвалюцыйнага зместу, а затым пачаў крычаць «Далоў самадзяржаўе!», «Далоў духавенства!», «Далоў вайну!». Дэманстрацыя гэтая працягвалася каля гадзіны.

Тэлеграма полацкага паліцмайстра віцебскаму губернатару аб прысылцы войск з прычыны беспарадкаў.

15 жніўня 1905 г.

Настрой вельмі ўзбуджаны. Патрабуецца тэрмінова ваенная сіла. Вечарам чакаюцца беспарадкі.

Матэрыялы падрыхтавалі навуковыя супрацоўнікі Цэнтральнага дзяржаўнага архіва БССР у г. Мінску А. ГАЛУБОВІЧ і Т. ЛІНІЧ.

МАГІЛЁЎСКАЯ СТАРОНКА

Смаленск — Крычаў — Магілёў... Цяпер хіба што ўцалелыя магутныя бярозы напамінаюць аб тым часе, калі ішоў праз гэтыя месцы старадаўні шлях. Быў ён сумна вядомы тым, што па ім адпраўлялі вязняў з цэнтральных раёнаў краіны ў Магілёўскі турэмны замак. З апошняй чвэрці XVIII стагоддзя да 1917 года па гэтай дарозе прайшлі тысячы барацьбітоў за справядлівасць, непрымірымых праціўнікаў царызму і прыгнёту. У Магілёве былі аддадзены пад суд С. Мураўёў-Апостал і А. Бястужаў-Румін, іншыя дзекабрысты, тут пакутавалі героі «Народнай волі», першыя бальшавікі Магілёўшчыны.

Некалькі гадоў назад я пачаў збіраць матэрыялы аб дзеячах рэвалюцыйнага руху — вязнях Магілёўскай турмы. Пра адну з цікавых знаходак і хацелася б расказаць.

Нядаўна ў смаленскай газеце «Рабочий путь» была апублікавана невялікая заметка аб тым, што ў 1910 годзе ў катаржную турму гэтага горада быў зняволены легендарны герой рэвалюцыі і грамадзянскай вайны Рыгор Іванавіч Катоўскі і што палітка-таржанін Катоўскі быў этапіраваны ў Магілёў. Зацікавіла: для чаго і калі перавялі рэвалюцыянера ў Магілёўскую турму і дзе шукаць сляды?

З біяграфіі Катоўскага вядома, што ў 1910 годзе ён быў прыгавораны да катаргі на страшных Нерчынскіх рудніках, адкуль у 1913 годзе ўцёк. Магчыма, справа паліткатаржаніна засталася ў Цэнтральным дзяржаўным архіве РСФСР? З нецярпеннем чакаў я адказу на свой запыт.

І вось у руках — фотакопія анкеты «ссыльнакатаржнага арыштанта другога разраду Катоўскага», а таксама фотакопіі старонак статыстычнага лістка. 18 кастрычніка 1910 года Рыгор Іванавіч сапраўды быў этапіраваны са Смаленскай у Магілёўскую турму «для слухання справы». Справу Катоўскага слухала Кіеўская судовая палата, вядомая сваімі жорсткімі прыгаворамі палітычным зняволеным. З прысланых дакументаў мы даведаліся таксама, што прыбыў рэвалюцыянер у Магілёў 21 кастрычніка, а выбыў 5 лістапада. Начальнік турмы адзначыў у справе, што зняволены паводзіў сябе спакойна, але быў за нешта пакараны.

Вось, бадай, і ўсё, што стала вядома пра яшчэ аднаго легендарнага вязня Магілёўскай турмы. Але, магчыма, захоўваюцца дзесьці ў архівах справы і пратаколы Кіеўскай судовай палаты. Магчыма, мы і даведаемся, як паводзіў сябе на судзе Катоўскі, за які «проступок» быў пакараны бясстрашны герой рэвалюцыі. Пошукі працягваюцца.

Крычаў.

М. МЕЛЬНІКАЎ,
краязнавец, заслужаны работнік культуры БССР.

Міхась СТРАЛЬЦОЎ

ВУЗЕЛЬЧЫКІ НА ПАМЯЦЬ

ПАКЛОН З ДАРОГІ

НАЙБОЛЬШ СТАЛАЕ з напісанага Уладзімірам Хадыкам належыць пачатку і сярэдзіне трыццатых гадоў, а ягонае нараджэнне як паэта прыпадае на гады дваццатыя, на перыяд незвычайнага ажыўлення ў нашай літаратуры з прычыны бурнага прыходу ў яе здольнай моладзі ад плуга і варштата. «Бурна» — якраз тое слова, што найбольш стасуецца да тагачаснай грамадскай і літаратурнай сітуацыі. Нездарма ж Купала, звяртаючыся пад тую пару да моладзі, пісаў у вядомым вершы: «Гэй, узвейце сваім крыллем, арляняты, буйна, бурна». «Буйна, бурна» гэта было якраз з Купалавай лексікі, і, пішучы так, гэтак заклікаючы, ён не рабіў пад сабой ніякага высілку, тым больш, што найперш меўся на ўвазе пафас агульнаэмацыянальны, грамадскі, а не тая слоўная «бурапеннасць», эмацыянальна-мастацкая безадносная, што так пашкодзілі, як добра відаць сёння, маладой паэзіі дваццатых гадоў. Але віны самога Купалы тут менш за ўсё. І віны саміх маладых паэтаў тут не так і многа, бо мы ведаем, як не адразу даецца сапраўды **новае** слова аб **новым**, ведаем, як цяжка было маладым, зразумеўшы пагрозу штампу, рыторыкі, слізгання па паверхні з'яў, прабівацца да жыццёвай праўды, да ўласнага голасу. Гэткія ж цяжкасці не абмінулі і У. Хадыку, які папоўніў «бурапенны» і «сонцавейны» слоўнік маладнякоўцаў сваімі «буравейнымі далямі» і да т. п.

Паэт пражыў кароткае жыццё, але каб раптам (не слухаецца рука напісаць такое) яму быў наканаваны куды карацейшы век Паўлюка Труса (а яны былі амаль аднагодкі), мы не ведалі б таго выключна самабытнага мастака У. Хадыку, энергічнага ў выказванні, смелалага ў вобразным ладзе верша, суровага і адначасна шчодрага ў слове, сагрэтым «пачуццём паэта, думкай грамадзяніна» (ягоны выраз). Вельмі сімпатычна, па-мастакоўску і па-чалавечы прывабна ва У. Хадыкі тое, што нялёгкі паэтычны шлях, які паспеў ён прайсці ад «маладнякоўства» да адкрыцця ў сабе і ў жыцці ўласна-лірычнай тэмы, ён даверыў сваім вершам, бо быў сапраўдны лірык, чалавек, падлеглы «высокой болезни» споведзі і суперажывання, і гэтае Пастэрнакава азначэнне надзвычай да яго пасуе, да паэта, які не прамінуў, дарэчы, школы своеасаблівай вобразна-лірычнай шыфроўкі, вобразнага лагарыфмавання самога рускага савецкага майстра. Прачытайце вось хоць бы такое:

Не літары, а д'яблы пекла —
Растуць і коцяцца ў радок,
Каб словамі, як шабляй, секла
Старога ходу перадок.

Каб точаным лязом метафар,
Прыняўшы дум маіх прамень,
Перада мной хадзіла шафа,
Як перад сонцам ходзіць дзень.

Гэта ўзровень майстэрства, які не можа не здзіўляць і сёння. Але карані ягоныя, першапачатковыя, спадчынныя, усё ж і глыбей, і бліжэй адначасова. Па-першае, гэта, вядома, Купала з ягонай напружанасцю лірычнай гаворкі, з яго смелай, уздымнай, часам нават фантастычнай вобразнасцю. Нездарма і сам вялікі паэт з паэзіі маладых, можа, найбольш упускаў у сваю душу верш Хадыкі — таму ёсць сведчанні. Далей, не абышлося тут, мусіць, і без уплыву У. Дубоўкі, ці саперніцтва з ім, што заўважна нават паводле перагукання на знешне-стылявым узроўні («крозы», «кармазын» у Дубоўкі, «дэсань», «сузмрок» у Хадыкі і г. д.),

Цікава, што тая паўната лірычнага голасу, тая настойлівая і прынцыповая спавядальнасць, якіх дасягнуў У. Хадыка ў сярэдзіне трыццатых гадоў, загаварыўшы ад імя пакалення на ўзроўні самой духоўнай біяграфіі яго, праз дзесяткі год прыдалася нашай паэзіі пачатку шасцідзесятых, у пару абнаўлення ёю лірычных і вобразных сродкаў — і пераклічкі, хутчэй за ўсё, несвядомыя, тут іншы раз проста ўражваюць. Успомнім такія вось радкі з верша-маналога У. Хадыкі «За строем дат і рубрык» (1934):

І хай было, што сэрцу не далося,
Што згінула ў гадах, як гук пусты,
Я не засмучаны, што прыйдзе восень
І ацярэбіць дрэвы і кусты.
(Хай ў ёй свой лёс варожы зброд кляне!)
Душа такой штогодняй змене рада
І пад суровы вецер лістапада
Мне добра жыць у роднай старане.

Ці не здадуцца яны эпіграфам да «Штодзённага лістапада» (1961) С. Гаўрусёва: настолькі ў гэтых радках знойдзена ўжо як і сама задума сучаснага паэта, так і вобразны ход паэтычнай думкі, і нават рытмічны лад верша. І гэта тым больш дзіўна, што пра нейкае простае запазычванне тут наўрад ці можа ўзнікнуць гаворка. Проста другі паэт, заўважым, таленавіты паэт у пару, калі спавядальнасць стала для паэзіі надзённай патрэбай, унутрана спасціг яе тон, як бы надтачыў ланцужок, забыты ў трыццатых гадах, звёнамі песні новага дня. Скажыце пасля гэтага, што ў паэзіі не існуе пераемнасці!

Той «з краінай кроўнай дагавор», тая «частка ўлады», грамадзянскай і паэтычнай, пра якую пісаў У. Хадыка ў вершы «Сякуць падкованыя коні» (1932), дазвалялі яму быць гранічна шчырым як з уласным сумленнем, так і з уласным вершам, пра што б ні пісаў ён: пра родную вёску, пакінутую дзеля горада («І шкода мне было сяла і музыкі жытнёвай вобак»), пра абвастрэнне класавай барацьбы ў родных яму мясцінах, дзе старое агрызалася «куляю з абрэза, злосцю падкаладнаю». У. Хадыка менш за ўсё спакушаўся воклічным, публіцыстычным вырашэннем балючай для яго тэмы. З яго вершаў пачатку трыццатых гадоў паўстае складаная гама пачуццяў чалавека, які не бяздумна перажывае «вялікі пералом» у вясковым жыцці, усё яшчэ блізкім яму, ужо гараджаніну: тут і спроба задушыць у сабе ўспаміны пра вёску («Скрухі старая плойма згіне, спадзе, забудзецца»), і знарочыстая гаворка пра вёску як пра нешта пазбытае, пераадоленае («Мой смутак навекі сатлеў»), і г. д. Драматызм жывога чалавечага перажывання павяраецца потым цвярозай развагай пра мінулае вёскі, пра свае спадчынныя карані:

Ускапаю дзедаўскі дрывотнік,
Па каліву перабяру...

Там, у старой вёсцы, заставаліся бядота, асуджанасць на цяжкую беспрасветную працу, на хцівасць і сквапнасць («Кіямі баранілі людзі мяжу натрапленай зямлі»), але ж там былі і ўцехі дзяцінства, першапачатковае адкрыццё прыгажосці свету, прыроды, паэзіі, чалавечых адносін, як гэта цудоўна пасведчана ў ранейшым, бадай, хрэстаматыйным цяпер вершы «Снапок аўса»:

Мне сказала маці: выжні
Ты цялятам асані...
Калыхаўся ціха здрыжнік
Ля блакітнае ракі.

Па дарозе невядомай
Беглі кветкі і раса...
І да матчынага дому
Я прынёс снапок аўса.

Вядома, У. Хадыка паводле спосабу рэалізацыі паэтычных уяўленняў і адчуванняў быў найперш лірыкам, менш за ўсё схільным да адкрытых публіцыстычных трансфармацый сваіх разваг пра час у нейкую ўскладнёна-жанравую, сюжэтную сістэму, як гэта рабіў блізка таго часу, напрыклад, У. Дубоўка, вынайшаўшы нават нейкі сінтэтычны жанр «камбайна». Хадыку быў звычнейшы верш-маналог або цыкл вершаў, як узгаданыя раней «За строем дат і рубрык» або проста — «Пяць вершаў» (1936). Гэтыя «Пяць вершаў» належаць да нейкай новай паласы ў творчасці паэта. Пасля лірычных бураў пачатку трыццатых, пасля добра відочнай спрэчкі з самім сабой і са сваімі настроямі і пачуццямі, якія ён хацеў бачыць з «думкамі на ўзровень» («Ручаі ў адталай глебе», 1934), ён прыходзіць да ўсведамлення гістарычнай урачыстасці здзейсненага народам у сучасным паэту дні:

Мы ведаем усё, што робім,
На гранях дзей праводзім век,
У гэтым сэнс вялікай спробы
Знаходзіць новы чалавек.

Таму і нашым сніцца зорам
Блакіт нябачаных паэм,
У каторых проста мы гаворым
Аб тым, што маем, чым жывем.

Або:

Усё больш агніста сонца свеціць,
Усё больш радней удаль дарога.
Усё больш і больш у нашым свеце
Здаровага і маладога.

Так Хадыка пісаў у 1936 годзе. Характэрна, што гэты настрой лагоды, усцешанасці зробленым перабіваецца ў вершах таго часу як бы здалёк пачутай мелодыяй трывогі, можа, нават небяспекі, што выспявала ў хмарах, якія пачыналі наплываць з захаду.

Помнім толькі адно, што зацішак
Перад громам бывае часцей.

У тым жа 1936 годзе Хадыка піша верш «Рэвалюцыі салдат», падрахункавы для яго, для яго пакалення, і ў ім зноў жа прадчуванне будучых выпрабаванняў для сябе і для краіны: «Пройдзем мы гатовым строем, скінем шапкі перад боем». Так, неяк святочна-ўрачыста, малявалася яму будучая вайна, паўставалі будучыя выпрабаванні. Яны прыйшлі — трагічныя для самога паэта, суровыя, неверагодна цяжкія для ўсёй краіны, калі ў полымі ваенных пажараў, здавалася, не відно было золку новага дня... Але новы, мірны дзень заняўся для краіны, чорныя хмары адплылі на захад, каб праліцца там апошнім свінцом пераможнай для нашага народа вайны. Гэтага У. Хадыка не ведаў, гэта ён прадбачыў, прадчуваў:

Чужога свету ляжа прах,
Свой чорны марш дасніць ў магіле.
Ёсць час, каторому ў вяках
Не зналі роўнага па сіле.

А мы, чытаючы сёння гэта, перабіраючы ў думках кароткі жыццёвы і паэтычны шлях паэта, задумваючыся над пасмяротным лёсам ягонага радка, міжволі ўспамінаем трохі зажураны, але такі вабны, такі светлы голас яшчэ дваццацігадовага на той час Уладзіміра Хадыкі:

Паклон з дарогі, паклон з далёкай
Чужым і блізкім — паклон, паклон...
Да зарніцы залатавокай
Іду ў прывабны, іду ў палон.

Гэты палон стаўся ягоным вызваленнем. Паэт прыйшоў да нас, вярнуўся, каб жыць з намі і для нас.

СТАЛЕННЯ СТРОГАЯ ПАРА

ЗДАЕЦЦА, СЦІХЛІ спрэчкі пра паэзію «гучную» і «ціхую», якія ці не аднолькава раздражнялі як чытачоў і паэтаў, так і саміх крытыкаў, чыім неасцярожным вынаходніцтвам гэты падзел, уласна, і быў. Не сказаць, каб ніякіх асаблівых падстаў для такога падзелу не было. Яны, мусіць, былі, як меліся ў наяўнасці і гэтыя дзве крайнасці — можа, гэтак прадракаючы прыход у паэтычную нашу практыку нейкага новага адзінства або сінтэзу, па-свойму дэманструючы момант часовай нязгоды як умову жаданага паразумення ў будучым. Бо паэзія заўсёды імкнецца як да паўнаты самавыяўлення — у межах індывідуальнасці, так і да аб'ектыўнага пазнання (і прызнання) пэўнай жыццёвай дадзенасці — у межах ужо ўласна мастацкіх магчымасцей. Гэта ўсё відавочна, але болей тады, калі сціхаюць спрэчкі.

Уладзіміра Някляева сярод паэтаў ягонага пакалення заўжды вылучала пэўна заяўленая актыўнасць грамадзянскай пазіцыі, арыентацыя на тыя жыццёвыя і паэтычныя з'явы, якія так ці інакш мелі адзнаку навізны і надзённай цікавасці. Яму не чужая была і «гучнасць» самога вобраза пры пэўнай яго рытмічнай узбуранасці і жорсткасці (акрамя рускага А. Вазнясенскага, ён меў прад сабой прыклад нашага Р. Барадуліна), і разам з тым яго прывабліваў прыклад Купалавай высокай прастаты, першаснай нейкай эмацыянальнасці, што, здавалася, прыродна ўласціва і самому беларускаму слову.

Ёсць у Някляева ў кнізе «Знак аховы» і яшчэ сёе-тое. Варта працытаваць:

Наскрозь — дабро і зло,
Цвікамі скрозь далонь.
Хто пойдзе на святло.
Той выйдзе на агонь і г. д.

Бадай, не памылюся, калі пакажу тут на інтанацыю і вобразны ход думкі ў Ю. Кузняцова.

Наогул, сучасны паэт (нават і не пачатковец) менш за ўсё застрахаваны ад скразнякоў чужых уплываў. І часцей за ўсё ён не баіцца, нават з выклікам не баіцца падхапіць на іх «прастуду» — шчыра спадзяецца на сілу свайго паэтычнага «імунітэту». Так і я не баюся прыцішыць творчую арыгінальнасць У. Някляева спасылкай на нечыя імёны, тым больш, што спасылка гэтая на паэтаў «няпростых» паводле фармальных і светапоглядных адзнак на свойму павінна рабіць нават гонар нашаму паэту.

Але больш істотны для аўтара, вядома, Купала. Гэта наогул тыпова для сучаснай маладой беларускай паэзіі: самы вынаходлівы фармальны пошук і — Купала з ягонымі сакрэтамі першаснай, неадменнай, як агонь і вада, паэзіі. Тут зноў жа прысутнічае думка пра сінтэз — думка не аднаго Някляева.

Дарогу ўздымала гара,
І там, дзе дарога знікала,
Над вечнай вадою Дняпра
Стаяў нерухома Купала.
(«Ляўкі»)

У іншым месцы («Словы замовы») ён выкажа гэта яшчэ больш пэўна:

Колас.
Купала...
У гуках імён іх люлянку я чую,
Якую матуля калісь
над калыскай маёю спявала...

Але ўсё гэта не замінае У. Някляеву, а, наадварот, можа, памагае быць самім сабой, упарта весці ў лепшых сваіх вершах уласную тэму і інтанацыю. Сталасць грамадзянскай і паэтычнай думкі ён прадэманстраваў, напрыклад, у нядаўнім вершы пра Варшаву («Варшава-82»), не збянтэжыўшыся складанасцю і вастрынёй тэмы, паэтычна і па-чалавечы далікатна перадаўшы і боль, і трагізм сітуацыі — так, як яна адбілася ў душах сумленных палякаў-інтэрнацыяналістаў і як азвалася ў душы самога аўтара са слоў старога паляка, які кажа, што падобнае здараецца «кожны раз, як людзі выстаўляюць напаказ» ману пад выглядам праўды, а мітусню пад выглядам справы.

Думка пра немітуслівасць, пра самавітасць слова і справы — сталая думка, і яна заўсёды і непазбежна вяртае нас да народных вытокаў маральнага і духоўнага пачатку. Думка гэтая, здараецца, у каторых паэтаў набывае своеасаблівую «почвенную» афарбоўку, у Някляева няма гэтага — і добра. Нудна завучаная, а таму і знарочыстая шчырасць каторых «почвенников» не можа не бянтэжыць — але ці варта пра гэта? У «Рэйсавым аўтобусе» У. Някляеў робіць нас сведкамі як невясёлых людскіх клопатаў, бядотаў, так і «спантаннай» нейкай радасці — настрояў, уласцівых людзям у гурце, дзе выяўляецца іх «роевы», як любіў казаць Талстой, пачатак. Але ў аўтара няма ні залішняй лагоды, ні залішняга замілавання, калі ён услухоўваецца ў чалавечы аркестр, як няма і клятваў у нечым, і няма спробы гаварыць «ад імя і па даручэнні», — ёсць трапятлівасць і даверлівасць, у якіх разам з тым і сацыяльная відушчасць, і настроенасць на «лірычную», так сказаць, тыповасць жывога непрыдуманага, будзённага жыцця.

Павінен агаварыцца — гэта той Някляеў, які падабаецца мне і якога, магчыма, хацеў бы бачыць і прадбачыць у будучай ягонай кнізе. Але мне ніякім чынам не абмінуць Някляева, умоўна кажучы, публіцыста — ён таксама прысутнічае ў сваім паэтычным сёння, у «Ружы вятроў», што мае падназву «Размова з аўтаінспектарам», у «Маланцы» (назва чытаецца яшчэ і як жаночае імя) — у рэчы, таксама з падназвай — «Аповесць пра каханне».

Нельга не адзначыць, што ў абодвух выпадках аўтар ці то занадта сціплы, пазбягаючы выразных жанравых вызначэнняў, ці то не зусім упэўнены сам у «генетычнай» прыналежнасці тут ім створанага. У «Ружы вятроў» гаворка ідзе пра лёс міру ў сённяшнім неспакойным свеце («Адна ў людзей надзея — на людзей»), у «Маланцы» — пра лёс пачуцця ў эпоху апакаліптычных страхаў, што выкліканыя прывідам ядзернай вайны.

Што ж, магчыма, справа не ў вызначэннях, хоць і я назваў бы гэтыя паэтавы рэчы спробай паэмы, маючы на ўвазе непазбежныя ў наш час трансфармацыі гэтага жанру ў нейкія сумежныя з ім вобласці. Але што ж бянтэжыла тут аўтара? Мне здаецца, нейкая ўсё ж адасобленасць тутэйшага пошуку ад тых знаходак, што ёсць у вершах, пра якія была ўжо гаворка. Так сказаць, ці не падалося аўтару, што і «глеба» («почва»), і «публіцыстыка» не надта ў згодзе, калі яны пастаўлены побач, не толькі жанрава, але хоць бы і стылістычна? Сумненні, магчыма, і небеспадстаўныя, але, здаецца мне, могуць быць пераадолены пры наяўнасці большай творчай аддачы, пры дапушчэнні ў сам верш, паэмны ці яшчэ які, у самую ягоную інтанацыю і фактуру ўсё той жа «глебы» — тут Някляеву варта зрабіць яшчэ нейкі высілак, ад якога, здаецца мне, залежыць і ягонае паэтычнае заўтра. «Ціхмянасць» і «гучнасць» павінны прыйсці да згоды. Магчыма, я памыляюся. Але не сказаць пра гэта не магу аўтару, якога паважаю і ў шчырасць пошуку якога веру.

З глыбокай павагай стаўлюся заўсёды да маладых пісьменнікаў, якія да нараджэння першае свае кніжкі ўмудраюцца добра паспытаць жыцця (а яно, як вядома, у кожнага чалавека сваё, непаўторнае, не падобнае ні на чыё іншае), паспяваюць перарабіць нямала работы і не спяшаюцца тут жа, адразу ж (скупіўшы добрую палову тыража на прэзенты) афармляць абходны ліст на звальненне, каб ужо, як і належыць «творцу», прысвяціць сябе выключна гэтаму зманліваму занятку...

Тады і першая кніга (калі, зразумела, напісана яна таленавітым пяром — бо першавыснова творчасці ўсё ж талент і толькі талент!) заўсёды выклікае ў чытача давер і суперажыванне. А гэта і ёсць факт здзяйснення творчай асобы.

Бо дзеля каго і дзеля чаго мы пішам? Якое прызначэнне і абавязак пісьменніка?

«Глаголом жги сердца людей». Хіба не стаіць ён, гэты запавет, на парадку дня і сёння?

АДМЕТНА, ПА-СВОЙМУ

І САПРАЎДЫ — хіба не поўніць непадробным спачуваннем наша сэрца гэты «глагол» пра бяду, якая ўбілася ў чужую нам сям'ю і хату, у чужое жыццё, як быццам такое ад нас далёкае і абыякавае нам? Пра чужую, чужую бяду — на першы погляд.

Я хачу пазнаёміць чытачоў з Марыяй Філіповіч, з яе першай кнігай прозы, якая ўбачыла свет яшчэ ў мінулым годзе пад назвай, што ўжо сама па сабе мне, напрыклад, неяк адразу паабяцала надзею на стрэчу з цікавым пісьменніцкім імем у нашай літаратуры. У адрозненне ад такой часта распаўсюджанай у назвах нашых кніг сумнаватай «абагуленасці» (блізкія знаёмыя, шляхі-дарогі, новы свет...) — раптам нá табе: «Мадонна з Выселкаў»!

...Прашу прабачыць мне міжвольную рэмінісцэнцыю. Успомнілася, як у мастацкай галерэі Уфіцы, у Фларэнцыі, наш гід сіньёр Франчэска, вучонейшы чалавек, знаўца мастацтваў і літаратур (таму сваім хобі, як сам ён нам прадставіўся, і абраў ён і гэты таксама мастакоўскі занятак гіда на час студэнцкіх вакацый, пакуль быў вольны ад лекцый ва універсітэце), водзячы нас, турыстаў, ушчэнт ужо знямоглых і абыякавых да спасціжэння амаль усёй сусветнай культуры за адзін тыдзень (!), сіньёр Франчэска ў зале Рафаэля, водзячы ад адной Мадонны да другой, нават без знаку свяшчэннага замірання, без кроплі піэтэту, з бяскрыўднай насмешкай (а, можа, хутчэй проста з жаданнем падбадзёрыць перад непадступнай вяршыняй — усе мы людзі на зямлі!) расказваў нам:

— Рафаэль писал всех Мадонн со своей подружки — булочкиной девушки..

(У нескладаным перакладзе гэта азначала, што сяброўкай бессмяротнага Рафаэля была юная булачніца).

...Але я пачну гаворку не з аднайменнага з назвай кніжкі апавядання, а з невялікай замалёўкі «Чужая бяда», якая, на мой погляд, пацягне на добрае — часам — па прасторы апавяданне.

Па спецыяльнасці Марыя Філіповіч медык. Пасля заканчэння медыцынскага вучылішча доўгі час працавала ўчастковым фельчарам. А гэта работа — ніхто не запярэчыць!— патрабуе не толькі прызвання, але і вялікай чалавечай душы і спагады. Да другога чалавека. Калі б гэта не было ў характары і натуры самой М. Філіповіч — можна пэўна сцвярджаць,—не было б і яе першае кнігі. Не было б, напэўна, такога светлага і гэтак тонка прачутага з дакладнай псіхалагічнай інтанацыяй апавядання, як «Начное дзяжурства» — пра маладзенькую сястру-практыкантку. Яе шчырае, чулае на чужы боль і пакуту, сэрца кранае бясконца. Чытаеш пра гэту, як чысты, вясновы павеў, Кацю Малышкіну і міжволі сам сабе жадаеш: «Пашлі, божа, і мне ў суцяшэнне ў гадзіну маіх пакут вось гэтакую ж светлую душу». (Як мала іх, на жаль, сёння ў бальнічных сценах такіх вось міласэрных сястрычак!..) Каб гэта душа схілілася і над маёй падушкай, як схіляецца з нязгаснай надзеяй Каця Малышкіна над безнадзейным Гурковым... Як ёй хочацца суцяшальнай весткай узрадаваць яго спакутаваную жонку і смешнага таўсматага хлопчыка — сына...

«Чужая бяда»— гэта лёс і ўласны таксама вопыт існавання самое пісьменніцы, таленавіта перастораны ў старонкі, якім наканавана далучаць чытача і хваляваць яго сутыкненнем з праўдай жыцця, расказанай шчыра і нязмушана.

Чужая бяда глядзіць на нас вачамі старое жанчыны з худым змрочным тварам і яе хворае пяцігадовае ўнучкі Галі, па-старэчы павязанай цёплай хусткай і ахінутай яшчэ і байкавай коўдрай... Чужая бяда б'ецца ў здзеравянелых на марозе і мітусліва разгубленых дрыжачых руках, якія ніяк не саўладаюць з дзверцамі распаленай грубкі, Галінага бацькі Кастуся.

«Здавалася, што людзі, якія жывуць у гэтай хаце, сабраліся некуды ў дарогу, у спешцы пакідалі абы-як рэчы ды так і забыліся на іх. І жывуць так, быццам кожны пражыты ў гэтай хаце дзень — апошні».

Лячыць дзяцей дактарам, хоць і звычна, але і цяжка заўсёды. Аднак куды цяжэй лячыць хваробу, на якую хварэюць дарослыя. Хваробу, якой рэдка калі паставіш дакладны дыягназ і яшчэ радзей знойдзеш патрэбныя лекі.

Дзяўчынка ў гэтай хаце жыве без матчынага дагляду, без матчынай пяшчоты і цеплыні. Маці Ядзя толькі сяды-тады прыязджае даведацца Галі з бацькам, каб сёе-тое перамыць ім і прыбраць у хаце. Маці іх з бацькам пакінула? Ды не... У мацеры ёсць свая маці, якая аўдавела і асталася адна, маючы на руках пяцёра малодшых за Ядзю... Вось Ядзя, забраўшы сваю меньшанькую Наташку («Каб ужо ўсе да кучы...»), і паехала памагаць сваёй маці... А Галю, старэйшанькую, Кастусь не аддаў. «Каб самому не загінуць ад сумоты»... А цяпер вось так і кідаюцца бязладна — не жанатыя, не разведзеныя: то яна да яго, то ён да яе. Яна не мае адвагі пакінуць сваю маці з дзецьмі без помачы, а ён — сваю, хворую і ўжо зусім нямоглую. Так і пакутуюць усе. А з Кастуся яшчэ і ўсё сяло смешкі строіць: як быццам мала баб на свеце, каб самому мужыку ўначы — ад сораму перад людзьмі — запяўшыся цыратай, паласкаць бялізну ля калонкі... Смех! На чужы розум ды на чужы клопат тут і разважаць няма чаго.

«— Ды калі б са мной такое здарылася, я адразу б сказаў: «Не, дарагуша! Вось табе бог, а вось — парог. Хочаш жыць — жыві. А не хочаш, уздумаеш яшчэ раз у падарожжа пускацца, я ў той жа дзень сабе другую бабу прывяду... Хо!»

Вось так бы зухавата развязаў чужую сітуацыю напорысты калгасны шафёр Уладзік.

Так бы — сапраўды? А калі б такое здарылася з самім?..

«Раптам ён запнуўся на паўслове, памаўчаў хвіліну-другую і нечакана ўздыхнуў і дадаў ужо без ранейшай упэўненасці:

— Але д'ябал яго ведае, што б я рабіў... А, можа, яму толькі яна любая? Ды і дзеці... Во сітуацыя...— нявесела ўсміхнуўся і надоўга змоўк Уладзік».

Ні ў адным позірку, ні ў адным душэўным руху ні на волас не знойдзеце вы тут літаратурнай робленасці і прыблізнасці, ніводнага недакладнага жэсту, ніводнага выпадковага слова.

А гэта, па-мойму, і ёсць талент.

Незалежна ад таго, якой плошчай ён валодае: замалёўкай, апавяданнем, можа, нават і... раманам.

Гэткім жа выверанымі і ўзважанымі на шалях мастакоўскай меры і ашчаднасці можна назваць таксама надзвычай прывабнае сваёй непасрэднасцю апавяданне М. Філіповіч «Дзень першы». Пра самыя першыя крокі самастойнага, як мы кажам, працоўнага жыцця гераіні, ад імя якое і вядзецца гэты расказ. Гэта як бы другая ўжо наша стрэча з добра знаёмай нам па «Начным дзяжурстве» Кацяй Малышкінай, якой з гэтага самага першага дня наканавана лёсам (а, дакладней дзяржаўнай камісіяй па размеркаванні маладых кадраў) на крыллях рамантычнай мары пра паўночнае ззянне і запрэжкі аленяў спусціцца вельмі будзённа і празаічна «на маленькай станцыі з запылеными клумбамі і густым кустоўем бэзу і язміну ўздоўж перона»...

Маладзенькая доктарка (пра літаратарку мы сказалі б «пачынаючая») накіравана на работу ўчастковым урачом «заместа паважанага ўсімі доктара Віктара Андрэевіча». І гэта самая вялікая на першых яе кроках трывога. Нібыта па яе гэта віне закрылася «неперспектыўная» тутэйшая сельская бальніца (як быццам не пазакрываліся скрозь «неперспектыўныя» школы, ці не гібеюць гэтак жа «неперспектыўныя» вёскі), ні быта яна сама вінавата, што «яна заместа Віктара Андрэевіча...», як расчаравана перапытвае стары фурман Клім.

Якое зразумелае мне гэта пачуццё нявыгаднага параўнання ўласнае няўмеласці і бездапамогі з тым, на чыё месца ты заступіла! (Гэтак жа вось сама, толькі «замест старшыны Якімчука» прывёў некалі ў маі сорак другога, зусім без энтузіязму прывёў мяне, 19-гадовую, у страявую часць штаба запаснога палка памначштаба лейтэнант Вяткін...).

І тым не менш пачынаць свой першы дзень ты мусіш. І маладая доктарка пачынае яго з таго, што бярэ ў рукі граблі і разам з акушэркай і санітаркай ідзе грэбсці і складваць у копы бальнічнае сена... Нішто не зближае людзей гэтак, як сумесная праца. І сапраўды адбываецца дзіва: гэты няхітры вясковы занятак робіць сваю мудрую справу, зближае гэтых трох, ва ўсім такіх розных, жанчын і неяк адразу нібыта прасвятляе надзеяй і дзень заўтрашні маладой доктаркі. Дзень, у якім, пэўна ж, будзе вельмі звычайнага куды больш, чым тых рамантычных узлётаў, пра якія марылася ў бесклапотных студэнцкіх сценах. Але гэта звычайнае будзённае ўжо не здаецца такім аднастайным і безнадзейным. І тут вельмі дарэчы маладая пісьменніца знаходзіць тонкую цёплую фарбу гумару, якая міжволі выклікае таксама і нашу чытацкую ўсмешку. «Старанна пералічыўшы рэчы, мы выйшлі на двор, каб упэўніцца яшчэ і ў наяўнасці каня, саней і воза, а таксама і павеці і агароджы».

Усё на месцы! Жыццё ў Каці Малышкінай (так адвольна назавём нашу мілую гераіню) несумненна пойдзе наперад.

Такі ён, «Дзень першы». Хоць, можа, лепей было б проста «Першы дзень»— без уяўнай эпічнасці. Тут на месцы самі па сабе ўсе рэаліі, бытавыя і прафесійныя. Узята вельмі дакладная рэалістычная інтанацыя апавядання, неназойлівы гумар.

Зборнік «Мадонна з Выселкаў» складаюць некалькі абразкоў і дзевяць апавяданняў (шкада, што па незразумелай прычыне, некаторыя адметныя апавяданні М. Філіповіч, якія з'яўляліся ў перыядычным друку, не трапілі ў кніжку). Яны не ўсе аднолькавай мастацкай глыбіні, не аднолькавай дакладнасці ў мастацкіх дэталях і распрацоўцы характараў.

Ніяк нельга, напрыклад, убачыць сябе, як вось гэтак: «Урач са здзіўленнем убачыў на маім сонным твары светлую, падзіцячаму бесклапотную ўсмешку...» (Гэта нагадвае мне адну маю добрую знаёмую, якая любіць глядзець на сябе чужымі, не інакш як захопленымі вачыма. «Ад крыўды я плакала на лаўцы, усыпанай пялёсткамі акацыі, і па маіх шчоках ліліся, як жэмчуг, слёзы...» Страшэнна прыгожа! А калі гэта ў мастацкай прозе?)

І наадварот, якая да месца ў тым жа апавяданні «Апошняе слова» дэталь з кофтамі, з якімі да абходу ўрача чамусьці трэба абавязкова хавацца пад матрацамі, а пасля ўжо можна іх выцягваць і адзяваць на сябе... Нібыта нікому не вядома, што ў бальніцы хворым людзям неабходна берагчыся, і што цёплыя кофты ніякі тут не крымінал.

Дарэчы, пра само апавяданне і яго назву. Яна таксама хутчэй тут выпадковая, бо матэрыялу ў гэтым апавяданні смела хапіла б на тры (зноў!) апавяданні-лёсы. Тут жа яны не зліваюцца ніякім чынам, не перакрыжоўваюцца. Тут яны мінаюцца — па чарзе — адзін за адным, як мінаюцца бальнічныя дні. Адсутнічае мастацкая звязка, якая мацуе збудаванне, надае яму трываласць і непарушнасць. А ў «Апошнім слове» можна «перасунуць» Васільеўну, можна Вольку, можна і самую апавядальніцу. Віной гэтаму яшчэ і рыхлая, як вясновая гурба, кампазіцыя, і не ўсюды забяспечаная зместам ахвота да гаворкі...

Найбольш скандэнсаванымі самім матэрыялам і выверанымі ў характарыстыках мне ўяўляюцца апавяданні М. Філіповіч «Дзень нараджэння», «Дзеду на злосць», «І надыходзіць восень». Яны напісаны вельмі шчырай, хоць і відавочна не заўсёды яшчэ ўпэўненай жаночай рукой.

Руку гэту можна ўдзячна паціснуць, можна і высакамерна адвесці ўбок...

Сама я гэту «жаночую руку» не стаўлю пад сумненне.

Пазнаёмімся, аднак, з «Мадоннай з Выселкаў».

...От жа гэтыя сыночкі ў родных сваіх мамачак. Самыя ў свеце прыгожыя, самыя лепшыя, самыя бяскрыўдныя і цнатлівыя. Іх толькі і цікуюць, як ад'едуць ад роднае хаты, вёрткія ды бессаромныя дзеўкі...

Ці не такі ж быў і малодшы сынок цёткі Аксінні Пятрок, які вось ужо два гады як працаваў на заводзе ў Віцебску?

І вось нá табе, як гром сярод яснага неба: паштальёнка прынесла пісьмо.

Ад каго — калі сам Пятрок за два гады не напісаў бацькам ніводнага слова? Ды і навошта тое пісанне, калі ён кожны месяц прыязджае дадому на выхадныя?

А пісьмо было надзвычайнае!

У ціхмянага сыночка — аказалася з пісьма — гадуецца дачка.

«Пісьмо пісала не сама маці іхняй унучкі, а яе бацькі, у якіх яна жыве цяпер з дзіцем. Дзесьці ў Выселках, што аж у Глыбоцкім раёне».

Спачатку гэта вестка прагучала нібы стрэл з-за вугла. Як? Што? Адкуль? У нашага Петручка—дзіця?!

А потым усё закруцілася, «як у кіно»: заявіўся якраз на выхадны сам Пятрок, і маці намаглася неадкладна ж ехаць усім ім разам да ўнучкі і да тае Петручковае дзяўчыны. («Відаць, ціхай ды нясмелай, што трапіла ў такую бяду... Але нічога, дзеванька, я цябе ў крыўду не дам і за дзіця ўпікаць не буду»... Так расчулена рыхтавала сябе да сустрэчы з будучай нявесткай цётка Аксіння).

Адно захапленне чытаць, якія былі тыя зборы да гэтай нечаканай паездкі. Як паводзілі сябе бацькі і сам «імянінік», колькі меркаванняў і прыкідак было, як паглядней ды знатней, з якімі падарункамі з'явіцца на вочы маючай быць новай радні.

Не варта спрабаваць далей пераказваць гэтыя зборы і ўзрушаны нервовы іх настрой, я толькі адным абзацам з самога апавядання праілюструю, на якія нечаканыя штукі здольна само жыццё. Якія неспадзяванкі часам падкідае яно на дарозе нашых самых узвышаных памкненняў і ўседаравання.

«Адчыніліся з сянец дзверы, і на ганак выскачыла вогненна-рыжая дзеўка з голымі лыткамі, і траха не пад ногі гасцям плюхнула вядро бруднай вады... Пырскі паляцелі нават на новую шарсцяную Аксінніну спадніцу. А дзяўчына, не абазваўшыся нават і словам, паласнула ўсіх дзёрзкім позіркам, ляснула дзвярыма і ў момант знікла ў сенцах».

...Такой была стрэча Мадонны з Выселак са сваім выпадковым суджаным і будучай свякрухай і свёкрам. Тыя ад неспадзяванкі нейкі момант з месца не маглі скрануцца. Але не павяртаць жа было аглоблі назад. Тым больш, што сват — Панцялей (і сват ехаў на гэту ўрачыстую падзею ўз'яднання новай сям'і), не зважаючы на брудную лужыну, першым пераступіў парог хаты...

...За што мы павінны, апрача ўсяго, цешыцца часам, у які жывём, дык гэта за поўную адсутнасць (можна пэўна гэта сцвярджаць!) якіх бы там ні было ўмоўнасцей і забабонаў. Ужо не кажучы пра вялікую патрабавальнасць у адносінах паміж людзьмі.

Апавяданне «Мадонна з Выселак»— нязмушанае сцвярджэнне гэтай ісціны. Такой, якою яна надзейна існуе ўжо.

Раніцой маладыя, нібыта між імі і не мільгнулася ніякага чорнага ката, узялі да сябе ў ложак сваю дачушку-прыгажуню, а іх бацькі, як і спрадвеку бацькі, цешачыся шчасцем уласных дзяцей, паводдаль ад іх, таксама адчувалі сябе шчаслівымі...

Такія вось яны, неспрадвечныя, незалежныя, сённяшнія мадонны.

Сучасныя пісьменнікі і мастакі нярэдка пішуць з іх карціны. Марыя Філіповіч напісала сваю мадонну. Напісала пасвойму, прафесійна адметна.

З такім уцешным адчуваннем загортваем першую кнігу нашага маладога празаіка.

Алена ВАСІЛЕВІЧ.

М. Філіповіч. Мадонна з Выселкаў. «Першая кніга празаіка». Мінск. «Мастацкая літаратура». 1984.

КНІГАПІС

С. АЛЕКСАНДРОВІЧ. Тут зямля такая. Выданне другое, дапрацаванае і дапоўненае. Мінск, «Народная асвета», 1985.

Вартасці кнігі вядомага беларускага даследчыка і празаіка Сцяпана Александровіча «Тут зямля такая» змаглі ацаніць ужо многія чытачы — найперш выкладчыкі беларускай літаратуры, старшакласнікі, студэнты філалагічных факультэтаў, краязнаўцы: яна выходзіла ў выдавецтве «Народная асвета» ў 1974 годзе. І вось — другое, дапоўненае і дапрацаванае выданне.

Ёсць магчымасць яшчэ раз прайсціся пуцявінамі тых, хто стаяў ля вытокаў літаратуры, закладваў у яе падмуркі талентам сваім першыя цаглінкі. С. Александровіч з захапленнем, узнёсла-паэтычна расказвае пра мясціны, дзе нарадзіліся Францыск Скарына і Паўлюк Багрым, Адам Міцкевіч і Францішак Багушэвіч, Цётка і Янка Купала, Якуб Колас і Цішка Гартны, Змітрок Бядуля і Кузьма Чорны... Хвалююць нарысы, прысвечаныя нашым выдатным сучаснікам — народным паэтам Беларусі Петрусю Броўку і Максіму Танку, народнаму пісьменніку рэспублікі Івану Шамякіну.

І. ВЕРАСАЎ.

Я. БУДЗІНАС. Дом у сельскай мясцовасці. Нарысы. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1985.

Нарысы Яўгена Будзінаса выклікаюць зацікаўленасць чытача пастаноўкай вострых праблем развіцця сельскай гаспадаркі.

Пытанні, звязаныя з сучасным станам сельскай гаспадаркі, у цэнтры ўвагі аўтара і ў нарысе «Падарожжа з апанентам», якім адкрываецца новая кніга Я. Будзінаса.

Нарыс «Дом у сельскай мясцовасці» таксама закранае праблемы жыцця сучаснай вёскі і адну з галоўных сярод іх—быт сельскіх працаўнікоў.

Е. ДРОМІН.

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

ШЧЫРЫ ДАР ДУШЫ

«Дар» — так коратка, ёміста і сімвалічна назваў Мікола Маляўка сваю новую паэтычную кнігу. Паэт сцвярджае, што дар жыцця, міру, працы, кахання — самы дарагі. У новым зборніку адчуваецца шчаслівая здольнасць адкрыта радавацца жыццю, рабоце, людзям, прыродзе, таму, што бацькі завяшчалі «дар свой — непражытыя гады», «дарогу, вецер і любоў». Дарога паэту «адкрывае свет», тайны планет; вецер, спадарожнік навальніцы, завеі, гартуе цела і душу; «любоў вяртае ў свет жаданы з усіх дарог, складае гімны для каханай і калыханкі для дзяцей».

Жыццё ідзе сваім парадкам.
Пад развітальны шум дуброў
Я перадам, як дар, нашчадкам
Дарогу,
Вецер
І любоў.

Рана ці позна кожны чалавек на жыццёвай дарозе азіраецца, вяртаецца да сваіх вытокаў, каб зразумець, хто ён, з чым прыйшоў у свет, што перадасць нашчадкам.

Паэтычны свет Маляўкі мае свае канкрэтныя вытокі, адкуль паэт чэрпае натхненне, эмацыянальны настрой, з якога тчэцца, пачынаецца вобразны лад верша. Такім вытокам для паэта з'яўляецца Стаўбцоўшчына, родная Мікалаеўшчына. Там упершыню адкрылася акно ў паэтычны свет, там «Нёман — бацька хросны мой», які вучыў трымацца «на вадзе і — у жыцці», там засталося цяжкае пасляваеннае маленства.

Паэт вяртаецца да тых дзён і падзей, каб паказаць чалавечую дабрыню, падтрымку, узаемадапамогу як вартасці маральныя, якіх, бывае, часта не стае цяпер, у век камунікацый і інфармацыйнага буму.

Сапраўды, сённяшняя паэзія многа і часта любіць «успамінаць», атрымліваючы ад гэтага самы моцны натхняючы імпульс. Творы М. Маляўкі, змешчаныя ў «Дары», не выключэнне. Паэт разумее, што нельга і немагчыма «механічна» размежаваць час, падзею на «былое», «сучаснае». У яго вершах арганічна ўжываецца космас і самыя будзённыя зямныя клопаты («Да зорак рэха коціцца ад роднага парога —спяваюць пеўні ў космасе, крычаць званчэй намнога»).

Маляўка разумее, ды і не ставіць мэты, што нельга катэгарычна пакінуць адно, перайсці без страт да якасна другога, новага. Пяро адразу не падымаецца, як і рука з сякерай, каб ссячы старую антонаўку, што «побач з яблынькамі тонкімі дажывае век».

Не квітнее пышна ў маі —
Лішні ствол, лічы,
Ды рука не падымаецца
Яблыню ссячы.

Цяжка нам жылося, бачыла,
І цвіла гусцей —
Памагала маці з бацькам
Падымаць дзяцей.

І цяпер яшчэ, абмацаўшы
Усе свае сучні,
Знойдзе ў кроне яблык смачны
Для маёй дачкі.

Нехта скажа, маўляў, дробязь. Ці варта столькі ўвагі ўдзяляць і звяртаць на гэта? Можа, хопіць элегічных «ахаў» і «охаў» па «старых добрых часах», па бацькоўскім доме, пакінутай вёсцы? Магчыма, і так. Але ці не зарастаюць нашы душы, як зарастае вясковая сцяжына, па якой не ходзяць нашчадкі? І дзе той летуценны «малінавы звон заручальнай крыніцы: дом пабудуем на пяць акон — блакітныя аканіцы»?

Хто вінаваты?
Сярод камянёц
Дом мой высіцца —
Шэры:
Без налічнікаў,
Без аканіц,
Як і ўсе гарадскія кватэры.

Блакітная мара саступіла месца больш празаічнай яве жыцця. Паэт добра ўлоўлівае і перадае нам змены часу і душы. Кожнай кнігай Маляўка дае адчуць здольнасць быць новым, мяняцца.

Б'е гадзіннік...
Б'е гадзіннік часта
І за боем чую:
«Двойчы не ўвайсці ў цячэнне часу,
Як у плынь рачную».

І хоць паэт прызнаецца, што «не ўсё збылося, да чаго імкнуўся», што «травою двор зарос» і «купілі дом на знос», але ёсць надзея на «хлапчука, які запусціў папяровага змея» («Высока, мара, плавай! У свет ляці за трыдзевяць зямель, ляці—каб стаць жаданай явай!..»). А каб не знікалі мары і казкі, трэба быць самому «з душой дзіцячай», каб заўсёды чыстым і ясным заходзіла сонца, «спадарожнік бессмяротны мой», бо «неспакой за шар зямны — адвечны, сонца, спадарожнік твой».

Мы на ім дзяцей пакінем,
І пра лёс унукаў —
Клопат наш.
Не павінен шар блакітны
Растварыцца ў цемры.
Як міраж.
Ты вяртайся,
Сонца.
Ласкай поўні
Свет чаромхі,
рэк,
зязюль,
Каб лавілі ручкай промні
Дзеці, бессмяротныя пакуль.

Асцярога паэта зразумелая, як зразумелая і трывога, калі прысніліся крылатыя ракеты, якія «спалі быццам крумкачы і раптам крылы разгарнулі шырай, і раптам узляцелі — чорны вырай».

Супраць вайны, знішчэння і ганьбавання чалавека накіравана паэма М. Маляўкі «Радзіны». Радзіны—значыць новае жыццё. Наперакор цемрашалам і фашыстоўскім планам знішчэння чалавека. Колькі такіх радзін, жыццяў абарвала мінулая вайна, але памяць зноў і зноў вяртае паэта ў сорак першы крывавы год. («Памяць — гэта той ілюмінатар, праз які відаць і ў цемнаце»). Яна, памяць, прама ці ўскосна прысутнічае «трывогай у салдацкім шынялі» і ў вершах «На вайсковых зборах», «Дзеці на стрэльбішчы», «Апошні аўтограф», «Максім», «Дровы», «Людзі франтавога пакалення». Памяць для таго, каб не дапусціць новай вайны, каб былі «на зямлі вяселлі і радзіны, на зямлі— гарачы сенакос». У гэтых творах лірычная гармонія часцей саступае месца поўнаму горычы, трывогі і перасцярогі публіцыстычнаму напалу, закліку.

Нельга сказаць, што паэзія М. Маляўкі сфакусіравана найбольш у мінулае, у памяць. Хоць у паэта гэта своеасаблівы крытэрый для ацэнкі сучасных з'яў. Пішучы пра вайну, пасляваенны час, ён імкнецца паказаць, падкрэсліць хараство душы чалавека, прыгажосць роднай зямлі, радасць жыцця; гэтай радасці тады было скупа, магчыма, таму і была яна даражэйшая. Ад вяртання ў мінулае выразнейшым становіцца адчуванне сённяшняга дня, відаць страты і знаходкі, трывогі і радасці. Космас у Маляўкі натуральна спалучаецца з амаль язычніцкімі пакланеннямі Сонцу, Дажджу, Зямлі («Працуюць людзі ў космасе спакойна, як у полі»).

Вершу Маляўкі ўласціва прастата (не спрошчанасць), жыццёвасць матэрыялу, але, акунаючыся ў прозу жыцця, дакладна, дэталёва выпісваючы яе, верш не заўсёды мае сілу, каб узняцца да сапраўднай паэзіі. Там, дзе паэт імкнецца да моднай «раскаванай» паэтычнай манеры, яго падсцерагаюць і няўдачы. Тады многае ў вершы выглядае выпадковым. Нярэдка свежы, яркі вобраз слаба «працуе» на задуму верша, а сам верш пачынае раздражняць сваёй цьмянасцю.

Варта зазначыць, што такіх вершаў у зборніку «Дар» у параўнанні з папярэднімі няшмат.

Мікола Маляўка ўвайшоў у пару творчай сталасці, калі адказнасць, цвярозы роздум бяруць верх над юначай задзірыстасцю, максімалізмам, але не ва ўрон паэзіі. Дарэчы, гэта разумее і сам паэт.

Іван РУБІН.

М. Маляўка. Дар. Вершы і паэма. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1985.

«Полымя», 1986

Новымі выданнямі папоўніцца серыя «Па родным краі». Зборнік краязнаўчых нарысаў А. Бароўскага і Ю. Герасіменкі «Цвітуць над Прыпяццю сады» раскажа пра ўчарашняе і сённяшняе жыццё аднаго з прыгажэйшых беларускіх гарадоў Мазыра і раёна, пазнаёміць з гістарычнымі і культурнымі помнікамі. Э. Корзун у кнізе «Гальшаны» знаёміць з вёскай Гальшаны, што на Ашмяншчыне, якая мае сямівекавую гісторыю. У ёй захавалася нямала помнікаў, сярод якіх — старадаўняе гарадзішча, руіны замка, архітэктурны ансамбль касцёла і манастыра XVII стагоддзя. Невядомыя старонкі жыцця некаторых гарадоў і вёсак рэспублікі прыадкрыюцца ў зборніку нарысаў М. Мельнікава «Ішоў край наш дарогай стагоддзяў». Чытач даведаецца таксама пра малавядомыя факты з жыцця П. Лепяшынскага, А. Мяснікова і іншых знакамітых людзей. «Музы Нясвіжа» — кніга М. Шышыгінай знаёміць з гісторыяй гэтага старажытнага горада рэспублікі.

Ілюстраваны даведнік «Гродна» напісалі Я. Мараш і І. Коўкель. Ён выходзіць у серыі «Гарады-пабрацімы», таму адрасуецца і жыхарам французскага горада Ліможа, з якім сябруюць і падтрымліваюць сувязі гродзенцы. У гэтай жа серыі пабачыць свет даведнік А. Шчарбакова «Мінск».

Многіх зацікавяць і такія выданні даведачна-краязнаўчага характару, як «Курорт Нарач» А. Уладзіміра, «Барысаў і яго ваколіцы» Ж. Гілевіч, «Гродна і яго ваколіцы» І. Граблеўскага, «Максім Багдановіч у Мінску» М. Чырскага.

Другім выданнем выходзяць даведнік «Купалаўскі запаведнік «Вязынка» і кніга «Падарожнічайце па Беларусі». Ілюстраванае выданне «Помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва» У. Чантурыя таксама адрасуюцца шырокаму колу чытачоў, у тым ліку і гасцям рэспублікі.

Пабачаць свет табелі-календары на 1987 год — «Залатая ніва», «Помнікі гісторыі і культуры БССР», «Салігорск — горад беларускіх шахцёраў»... Насценны ілюстраваны каляндар «Пад сцягам Кастрычніка» прысвечаны 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і адлюстроўвае шмат якія падзеі, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў час рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, а таксама поспехі, дасягнутыя ў будаўніцтве сацыялізму.

У тэматычным плане на наступны год прадстаўлены таксама раздзелы «Этыка сям'і і шлюбу. Эстэтыка быту», «Дамаводства», «Фізкультура, спорт» і іншыя.

Г. ШЧЭРБІК.

ВІНШУЕМ!

Якубу ЕРМАЛОВІЧУ~75

Пісьменніку Якубу Ермаловічу 7 жніўня споўнілася 75 гадоў. З нагоды юбілею праўленне СП Беларусі накіравала яму прывітальны адрас, у якім гаворыцца:

«Дарагі Якаў Сідаравіч! 75 гадоў мінула з дня Вашага нараджэння. Мы сардэчна рады павіншаваць Вас з гэтай нагоды як празаіка, які таленавіта адлюстроўвае жыццё сучаснай вёскі, даследуе яе сацыяльныя і духоўныя далягляды.

Вы настойліва авалодвалі прафесіяй настаўніка спачатку на педкурсах у Мсціславе, пасля ў Магілёўскім і Мінскім педагагічных інстытутах. Значную частку свайго жыцця Вы аддалі выкладанню беларускай мовы і літаратуры, папрацаваўшы больш за 25 гадоў у сярэдняй школе вёскі Пагост роднага Вам Бярэзінскага раёна на Міншчыне, дзе жывяце і цяпер.

Захапленне літаратурнай творчасцю прыйшло да Вас на пачатку 30-х гадоў. Вашы вершы друкаваліся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах. Сталай літаратурнай дзейнасцю Вы заняліся ў канцы 50-х гадоў. Ужо ў першай кнізе апавяданняў «Над Бярозай», пішучы пра вёску, пра сельскую моладзь, Вы востра ставілі пытанне маральнага ўзвышэння асобы чалавека.

Разам з апавяданнямі Вы плённа працуеце і ў жанры аповесці, выяўляючы ў іх глыбокае веданне жыцця працаўнікоў зямлі, сельскай інтэлігенцыі, іх побыту, іх узаемадачыненняў. Вашы кнігі «Душа чалавека», «Родная зямля», «Твар у твар», «След на зямлі», «Сіняя птушка» — яскравае сведчанне гарачай пісьменніцкай апантанасці паказам працы земляроба, як неадлучнай часткі грамадзянскага і духоўнага пасталення юнацтва нашых дзён.

Знамянальны дзень нараджэння Вы сустракаеце новай кнігай прозы «Акопы не пазарасталі», што ўвабрала ў сябе яшчэ не кранутыя старонкі багатага жыццёвага і творчага вопыту свайго пакалення.

Дарагі Якаў Сідаравіч! Віншуючы Вас з 75-годдзем, мы жадаем Вам на многія гады добрага здароўя, новых сіл для здзяйснення наступных задум».

Супрацоўнікі «Літаратуры і мастацтва» шчыра далучаюцца да гэтага віншавання.

Сяргею МІХАЛЬЧУКУ~60

Пісьменніку Сяргею Міхальчуку 14 жніўня споўняецца 60 гадоў. У віншавальным адрасе СП Беларусі гаворыцца:

«Дарагі Сяргей Апанасавіч! Шчыра, ад усяго сэрца віншуем Вас, вядомага празаіка, заслужанага работніка культуры БССР, з 60-годдзем з дня нараджэння.

Вы належыце да таго пакалення, якое гартавалася ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны. Сын селяніна, Вы, як толькі былі прызваны ў рады Савецкай Арміі, прынялі ўдзел у баях на тэрыторыі Польшчы і Усходняй Прусіі. Былі цяжка паранены.

Пасля дэмабілізацыі Вы паступілі на аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, які паспяхова скончылі ў 1951 годзе. Працавалі ў Дзяржаўным выдавецтве БССР (пазней — «Беларусь»), а з 1972 па 1980 год узначальвалі рэдакцыю літаратуры для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Першае апавяданне Вы надрукавалі ў 1955 годзе. На Вашым творчым рахунку аповесць «Сто прыгод за адзін дзень», кніжкі апавяданняў і аповесцей для дзяцей «Паштальён, шырай крок!», «Зялёны лісточак», «Першы след» і іншыя.

Вашы творы выхоўваюць юных людзей мужнымі, працалюбівымі, высакароднымі. Яны прасякнуты любоўю да зямлі і яе працаўнікоў, да роднай прыроды.

Значныя Вашы поспехі і ў жанры перакладу. Вы пераклалі на беларускую мову асобныя творы і кнігі А. Гайдара, Б. Жыткова, В. Біянкі, А. Конанава, Л. Панцялеева, В. Асеевай, М. Дубава і іншых пісьменнікаў.

Жадаем Вам, дарагі Сяргей Апанасавіч, новых творчых поспехаў, здароўя, шчасця».

Супрацоўнікі «ЛіМа» далучаюцца да цёплых пажаданняў.

Вячаслаў ДАШКЕВІЧ

●

Лёс мой, будзь літасцівы.
Раскрываю з даверам душу.
Я — лячу. Я бясконца шчаслівы.
Не палі мае крылы. Прашу.

Я да ўсіх зараз поўны ласкі.
І пяшчоты, і дабрыні.
Рассыпаюць мне шчодрыя краскі
Нават самыя шэрыя дні.

Згодны з чортам любым напару
Ад работы не высыхаць.
Не збаўляй толькі боскага дару
Безаглядна жанчыну кахаць.

Лёс мой, будзь літасцівы.
Раскрываю з даверам душу.
Я—лячу. Я бясконца шчаслівы.
Не палі мае крылы. Прашу.

Пра хлеб

Хлеб бывае ў нас траякі:
Чорны,
Белы
І ніякі.

Гарэлі хаты.
Гарэлі жорны.
Таму й не дзіўна,
Што хлеб наш — чорны.

Страчаем сёння
Мы свет цэлы.
Таму й не дзіўна,
Што хлеб наш — белы.

Ну, а трэці хлеб, ніякі?
Ён для здрадніка-сабакі.
Роўна з печчу камяні.
Паспрабуй іх, праглыні.

Вандроўніку

Прыемна апяваць каньёны.
Сады падхмарныя і піраміды.
Гвардзейцаў аперэтачных пагоны.
Турніры пеўняў і карыды.

Дзень прыйдзе — знойдзецца
прычына —
Адорыш одай жаб з Галапагосу...
Спявай, бядак! Табе Айчына
Яшчэ не стала разуменнем лёсу.

Балада крыку

Крычы, чалавек, крычы.
Ад болю свайго і чужога.
Сябе нематой не лячы.
Не спадзяваўся на бога.

Крычы, чалавек, крычы,
То нізка бяры, то высока.
Іншых крычаць навучы.
Коціцца рэха далёка.

Крычы, чалавек, крычы.
Нехта заўсёды адкажа.
Запаліць паходню ўначы.
Дарогу к збавенню пакажа.

Таму, чалавецтва, і шлях твой вялікі,
Што ты рэагуеш у час на крыкі.

●

Калі па горла захлыне
жыццёвы бруд,
І з губ сарвецца хрып
замест вясёлай песні,
Зрабі апошняе:
глянь на сябе, нібы на цуд,
Глянь яснымі вачыма
і — ўваскрэсні!
А ёлупням пыхлівым
кінь пальчатку.
Праткні іх позіркам,
што б'е вярней свінца.
Сіл не стае
жыццё пачаць спачатку,
Ну, дык і што?
Пачні яго з канца!

Мастацтва

Кіпа малюнкаў старых і гравюр.
Парахно ці святыя мошчы?
Пакойчык эпохі мадам Пампадур...
Расстрэл на Сенацкай плошчы...
Стыль адмысловы, усё — да драбніц.
Бачны натхнення бляск срэбны.
Няўжо мастаку абрысы спадніц
І контур штыха на роўных патрэбны?

Хіжым шкліў вокны Леанарда да Вінчы,
Гётэ ў абозе вайсковым ішоў...
Затое чуем цяпер: «Я — не вінцік...»
І, каву п'ючы, кпім з мурашоў.

●

Дарагія мае,
сябрукі-аднагодкі.
На мове якой
вам сны ў маленстве сніліся?
Няўжо вы
пра час той салодкі,
Няўжо назаўсёды
забыліся?

Зубр-адзінец

Зубр у горадзе — назва заметкі.
Дзіва няма. Выпадак нярэдкі.
І ўсё ж, па якому закону, якому
Зубры уцякаюць з абжытага дому?

Кажуць адны: «Не хапае ім корму.
Казулі і зайцы з'ядаюць іх норму».
Цвердзяць другія: «Шатун-адзінец —
Зможаны ў бойцы вясельнай самец».

Разваг пра сябе адзінец не чуе.
Дзе хоча пасецца, дзе хоча — начуе.
Голас глыбінны былой Белавежы
Кліча яго на забытыя межы.

ЛЯВОНАВА РАНІЦА

Міхась ПАРАХНЕВІЧ

АПАВЯДАННЕ

Лявон Касец жыў у невялікім пасёлачку. Калісьці пасля вайны гэта была цэлая калгасная брыгада. Потым паступова хаты пачалі радзець: таго на старасці дзеці забралі ў горад, хату прадалі, і цяпер пра былога тутэйшага жыхара хіба напамінаюць здзічэлыя прысады ды куча каменняў і бітай цэглы, зарослай высокім крапіўнікам. Па баках Лявонавай хаты і насупраць праз вузкую вулачку яшчэ мярцвяна-сумнымі пяцісценкамі пасталі тры хаты з забітымі накрыж вокнамі: у іх на першых часінах спыняліся калгасныя спецыялісты, потым, калі ў цэнтры пабудавалі цэлы гарадок белакаменных домікаў, яны пераехалі туды. У адным з такіх домікаў аднойчы пабываў па справе Лявон Касец. Пакуль малады ветурач фыркаўся ў ванне пад струменямі вады, Лявон спакваля агледзеў залу, спальню, кухню. Усюды раскошна, утульна, пафарбаваная падлога, сцены паклеены яркімі квяцістымі шпалерамі. Ветурач яшчэ нядаўна жыў побач з Лявонам у старой Яўхіміхі, а калі тая памерла, пераехаў сюды, аднак не спяшаўся аднекуль здалёку перавозіць жонку з дзвюма малымі дочкамі.

Лявону ўсё спадабалася ў новым доме — самі пакоі з высокімі светлымі вокнамі, ручаёвае бульканне гэтых кранаў, але ўсё ж ён, калі б раптам яму прапанавалі пераехаць вось у такі дом, наўрад ці згадзіўся б, бо ў гэтай камяніцы не было галоўнага, без чаго Лявон не мог уявіць ні на хвіліну свайго жыцця,— раскошнай печы, добра напаленай чарэні, ад якой заўсёды, колькі Лявон жыве на свеце і колькі памятае, стаіць дух сухіх грыбоў, садавіны, тоўстай зляжалай коўдры.

Касцу было дваццаць пяць, калі ён вярнуўся праз год пасля вайны да сваіх старых бацькоў. Вярнуўся проста са шпіталю з рэчавым мяшком за плячамі і з кульцяю правай рукі. І яшчэ ад левага брыва да падбародка цягнуўся сінявата-бурым шнурком шырокі шрам, ад чаго здавалася, што Лявон вечна на некага затаіў злосць. Дарослыя пры сустрэчы з Лявонам спачувальна здароўкаліся, малыя палахліва ўбіралі шыі ў плечы і праходзілі моўчкі міма, апусціўшы галовы.

Лявон доўга не сядзеў без справы, пачаў пасвіць калгасны статак: дзесяткі тры рабых трафейных кароў, якія прыгналі ў раён і выдзелілі калгасу. Жаніцца ж Лявон не спяшаўся, хоць і ў пасёлку і ў вёсцы Выган, дзе была ферма, засталося шмат адзінокіх жанчын. Пра тое, каб Лявону ачалавечыцца, ніхто не гаварыў, ды і яго самога гэта злавала б. Ён лічыў, што справа гэта даволі складаная, не такая ўжо няхітрая, як пра яе думаюць іншыя. Нават тады, калі не стала бацькі і маці (яны раптоўна памерлі ў адно лета), Лявон не спяшаўся прыводзіць маладзіцу ў двор, ніколі ні з кім не дзяліўся, хто ў яго ёсць на прыкмеце. А на прыкмеце ў яго была даярка Домна з гадавалай дачушкай. Яшчэ да вайны Лявон неяк паспрабаваў прытрымаць Домну за руку, калі тая вярталася з лесу з поўным вядром чарніц. Яны выпадкова сустрэліся на скрыжаванні баравых дарог, і загарэлая, на доўгіх моцных нагах Домна абрадавалася сустрэчы з Лявонам, паставіла каля пня вядро, кранула Лявона за локаць:

— От жа добра, што сустрэла цябе, Лявон. Куды ж гэта нам цяпер? Дальбог, ніяк не скумекаю...

Ад дотыку яе рукі Лявону раптам зрабілася горача ў грудзях. Тая, якую ён пасля кожнай вечарынкі, стаіўшыся каля чыйго-небудзь плоту, са шчымлівым замiраннем сэрца чакаў у начных прыцемках, раптам праходзіла ў акружэнні дзяўчат, і тады Лявон, крадучыся следам, лавіў кожнае яе слова, пакуль Домна, нарэшце, не бразгала дзвярамі сваёй хаты. Часам Домну, прыкрыўшы крысом пінжака, праводзіў дадому гарманіст Іван Макаёд, да якога кожная дзяўчына гарнулася, і тады Лявону нічога іншага не заставалася рабіць, як вяртацца адзінока дадому. І вось гэта недаступная нават у думках Домна ўзяла раптам яго, Лявона, за плячо, ліслива-ласкава пытае, як патрапіць дадому. Касец добра ведаў дарогі. Самая карацейшая да вёскі — менш выхаджаная людскімі нагамі, прысыпаная сасновымі шышкамі. Даўжэйшая — дзе ў далечыні стаіць слуп і каля яго жаўцее шапка пясчанага пагорка. Астатнія два развілкі вядуць на самы край свету, упіраюцца ў непраходныя балоты. Лявон і сам не ведаў — куды, таму ён махнуў на далёкі слуп, і Домна пакорліва пайшла за ім. Яны пратупалі вярсты са дзве пакуль не ўзышлі на пясчаны пагорак, стаптаны звярынымі лапамі. Пад стваламі старых сосен узвышаліся мяккія выспачкі, з-пад якіх цёмнымі пашчамі выглядвалі норы.

— Ага, колькі гэтых лісаў тут напладзілася!—прыглядаючыся, сказаў Лявон.— Уся гара на норах. От зімою такую ўпаляваць ды на каўнер! Табе на каўнер, Домна...

Пры гэтых словах Лявон знянацку прыхінуў да сябе дзяўчыну, яна не супраціўлялася — і пясчаны пагорак раптам захістаўся перад Лявонам. Гэта было адно толькі імгненне, адна мімалётная спакуса. Потым Лявон, як у сне, адчуў моцны штуршок у грудзі, ад чаго ён ледзь утрымаўся на нагах, і з Домніных вуснаў вырвалася строгае і кароткае: «Хадзем!»

Далей Лявон моўчкі вёў Домну напрасткі праз лес да Якімавай паляны. Адтуль трохі па кладках прайсці балаціну — і з-за алешніку пакажацца вёска.

Па дарозе ў маладым асінніку ім раптам трапілася шмат маладых падасінавікаў—тоўсценькіх, з агністымі шапкамі. Лявон не ведаў, што і рабіць з імі, бо яго кош быў паўнюткі грыбоў. Домна зняла хусцінку, і яны ў адзін міг напоўнілі яе.

— Лепшыя, чым мае, — сказаў Лявон, калі Домна звязала рагі хусткі. — Бач, якія мы з табой і грыбнікі, і ягаднікі... Так што ты, Домна, часцей са мной у лес хадзі... І з вечарынкі не ўцякай... А то цікую за табой, а ты нават у той бок не глядзіш...

— Добры ты, Лёня, — глыбока ўздыхнула Домна. — Але ж ты сам ведаеш...

— Ведаю... А твой Іван такі ўжо казак, што ў свеце быццa такога няма!

Яны падышлі да кладак. Лявон падкасаў штаніны вышэй калень і ступіў першы ў балаціну. Домна асцярожна ступала за Лявонам. Лявон, зрабіўшы некалькі крокаў, спыніўся, узяў вядро з Домнінай рукі. Не спяшаўся ісці далей. Мімаходзь глянуў на Домніны ногі, на яе загарэлы прыгожы твар, на сінія вочы з-пад тонкіх чорных броваў, сказаў на поўным сур'ёзе:

— Выходзь за мяне, Домна. Ты ж ведаеш—ніколі не пакрыўджу.

— Тады ты мяне не ведаеш, Лёнечка,—нечакана для Лявона загадкава ўсміхнулася Домна. — Навошта я табе такая?

— Якая?

— А вось такая. У мяне дзіцё хутка будзе...

Ён не са злосці так грозна рыкае.
Сляды вольных продкаў сваіх шукае.
У чуйна-магутнай, як звон, галаве
Зялёная памяць стагоддзяў жыве.

Позірк прымглёны, амаль невідушчы.
Далей ад пушчы — бліжэй да пушчы.
Дарогу абраў у адзін канец...
І я разумею цябе, адзінец.

●

Лес ажыў здубелы.
Скуль бралася сіла?
Гурбаў порах белы
Поўня запаліла.

На дубы і сосны,
Што сышліся згодна,
Лёг агонь дзівосны
І гарыць лагодна.

На кожнай былінцы
Палае цуд-свечка.
Дорыць ноч гасцінцы.
Кладзе пад вечка.

●

Дні мае не хітаюцца вехамі.
Кожнаму пра сябе не вякаюць.
Выспяваюць арэхамі
І на пульхнае лісце чмякаюць.

Не скажу, каб усе — залатыя.
Каб былі ядро у ядро.
Надараюцца часам пустыя.
Але й поўных набраў вядро!

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Бондар

Амерычкі, Еўропкі —
Адзінства не стае.
Вы згубленыя клёпкі
Бочкі аднае.

А на шляхах шаленства —
Іх паспрабуй злічы!
З ляшчыны і жалеза
Згубілі абручы.

Як не сваё згубілі,
А чортава майно.
Абкамянелі ў пыле
І накрыўка, і дно.

Не выспеліць арэшкі
На абручах кара.
На згубленыя рэшткі
Няма гаспадара.

Вам трэба у спажытку
Быць схоўняй назаўжды
На мёд, віно і жыта,
І на алей руды.

Або жытлом часовым —
Дзвярэй не зачыняць!
Для юнакоў вясёлых,
Што з Дыягена кпяць.

Сабраць вас трэба... зрэшты,
Усё пакуль дарма,
На згубленыя рэшткі
І бондара няма...

А бондар быў і хвацка
Рабіў работы ўсе —
Максімавіч па бацьку,
Па імю Аляксей.

Усё цаніў, не грэбваў
І спевам вераб'я.
Даёнкі, бойкі, цэбры
І жлукты вырабляў.

Ахвочую на моду
Да пеўневых галоў,
Дубовую калоду
На клёпкі ён калоў.

У працы ведаў меру
І для танчэйшых спраў,
Адсунуўшы сякеру,
Шаршэтку-гэблік браў.

У рухах нетаропкі,
У стружкі пот зганяў,
Да аднае — ўсе клёпкі
На спусту падганяў.

І клёпкі ў крузе шчыльным
Адна адну плячом
Сціналі пад ляшчынным,
Надзейным абручом.

Пусціўшы пры даробку
У бочку «схіл», ці «роў»,
Хапаўся ён за склобку
І вычышчаў нутро.

Каб не цякла, не лішне
Набоічам наўскос
У шчыліну на днішчы
Утрамбаваць рагоз.

У шчыліну-разору...
І днішча наўскасы
Прыладжваў у атору
На доўгія часы.

Сцякала стома з цягляў
На тванныя карчы.
Нацягічам нацягваў
Тугія абручы.

Па абручах, па новых,
Як глухаваты гром —
Набоічам кляновым,
Драўляным малатком!

Усё рабіў, як цацку
На продаж, ці ў музей —
Максімавіч па бацьку,
Па імю Аляксей.

Праз чэрвеньскія травы
Салдацкаю ступой
Дайшоў да пераправы
На чорны бераг той...

І жалю цень пярэсты
Паслаўся ў дол яму:
«Каму сваё майстэрства
Ты перадаў, каму?»

І чулася: «Нікому...
Вайна так неўспадзеў...
Ні хлопчыку малому,
Ні дзеду не паспеў».

Амерычкі, Еўропкі...
Вайна так неўспадзеў...
На згубленыя клёпкі
Цень атаму асеў.

Ужо выразным край стаў
Бяды, таму крычы,
Каб нейкі новы майстар
Сцяў клёпкі ў абручы.

Крычы, каб паяднацца
У шчыльныя рады
З бунтоўнасцю юнацкай
Супроць тае бяды.

Такому верны бунту
І ўсёй зямной красе
Мой дзед, палескі бондар
І воін — Аляксей.

У тое лета на вайну іх пабралі разам — Івана Макаеда, Несцера Кутавога і яго, Лявона Касца. Пры першай жа бамбёжцы эшалона Іван загінуў — асколкам яго перарэзала напалавіну, і гэту жудасную смерць свайго таварыша, аднавяскоўца ён не мог забыць усю вайну. Ваяваў Лявон побач з Несцерам Кутавым у адной стралковай роце. І ў якіх толькі ні бывалі пераплётах — і кулі і асколкі мінулі іх.

Баі ўжо ішлі пад Будапештам, на вуліцах аднаго маленькага гарадка, назву якога Лявон, хоць забі, не мог выгаварыць. І вось у гэтым гарадку Лявон Касец быў цяжка паранены. Не памятаў, чым яго параніла, хто і куды яго вёз. А калі да яго вярнулася развага, убачыў спярша на правай руцэ кульцю, потым у люстэрку — глыбокі шрам на твары. Два асколкі франтавыя хірургі вынялі з голені нагі і цяпер на іх месцы перакрыжавана ружавелі шрамы.

Вярнуўшыся дадому да бацькоў, Лявон добра разумеў сваё становішча. Кульгавы, без рукі, ён слабы памочнік у гаспадарцы. Адно толькі і заставалася — пасвіць калгасны статак. Часам, калі каровы бліжэй падступалі да лугу, Лявон, зайшоўшы наперад статка з доўгай пугай, каб жывёла не нарабіла патравы, з болем у сэрцы слухаў вострае жыгане кос на затуманеным лузе, дружны звон мянташак — усё гэта родныя і блізкія гукі, якія запалі ў ягонае сэрца яшчэ з юнацтва.

Домна працавала даяркай. У яе групе было дзесяць кароў. Лявон беспамылкова пазнаваў кожную з іх у статку, пры магчымасці стараўся бліжэй падпусціць яе каровы да палявога ўзмежка, дзе было больш сакавітай травы.

На ферму да Домны часам прыходзіла танканогая, у буйных вяснушках дзяўчынка. Пакуль Домна цыркала струменямі малака ў вядро, дзяўчынка гладзіла то адну, то другую карову, падавала жменю травы. Ён моўчкі наглядаў, і ў такія хвіліны ў яго нараджалася думка сказаць Домне пераходзіць жыць да яго на пасёлак, аднак гэтыя словы былі недзе глыбока ў душы.

Прыгнаўшы з пашы кароў, Лявон памагаў Домне раскідаць траву па яслях, хоць гэта яму было нялёгка з адной левай рукой. Домна яго ўпрошвала лепш адпачыць, але гэтыя словы нават злавалі Лявона. Ляўшой ён падчэпліваў ладны ахапак капюшыны, потым, падтрымліваючы вілы куксай, з цяжкасцю перакідваў траву за яслі. Не, так яму, Лявону, толькі адно і застаецца, што пасвіць калгасны статак. На астатняе ён ані не здатны. Тады навошта ён такі і Домне? А, можа, дарэмна ён так думае? Можа, якраз і пойдзе цяпер за яго? Вунь у вёсцы колькі пераспелых адзінокіх дзяўчат, не кажучы ўжо пра былых салдатак, такіх, як яна, Домна!

Гавораць жа, што нерашучасць часам горш за нахабства. Пакуль Лявон так і гэтак выношваў свае планы, Домну разам з дачкой нечакана забраў да сябе ў суседнюю вёску адзінокі мужчына, у якога пасля смерці жонкі засталося трое малых дзяцей. На першым часе цяжка было Лявону. Нават ногі неахвотна ішлі на ферму. Цяпер Домніну групу кароў даіла Тамара—жонка Несцера Кутавога. Тамара была з гумарком жанчына, любіла пакпіць не толькі з жанчын-удоў, але і з Лявона. Аднойчы яна пасля дойкі, збіраючыся дадому, сказала Лявону:

— Досыць ужо, чалавеча, бабылём хадзіць. Усё яму каровы, каровы, а на жанчын зусім і ў той бок не глядзіць. Бяры от Матруну Яворскую, век і накормлены і ў кашулі свежай будзеш.

— Пасватай хіба, то і вазьму, — ні то жартам, ні то сур'ёзна адказаў Лявон.

Матруна Яворская жыла ў невялічкай хатцы ў тры акенцы. Адзіная яе дачка пасля сямігодкі з'ехала ў горад, працавала швачкай і жыла ў інтэрнаце. Гаваркая Тамара, прывёўшы да Матруны Лявона, сама ўсё вырашыла за дваіх: узяць на ланцут Шарыка, пакласці на воз трохпудовага парсюка — адзіную жыўнасць, што была ў Яворскай, а яе хаціну, калі не знойдзецца купец, перавезці ў пасёлак на дровы. З таго дня і стаў Лявон жыць з Матрунай. Матруна працавала на полі, куды загадваў ісці брыгадзір, Лявон па-ранейшаму пасвіў калгасны статак. Часам у Лявона на плячах была каса, і вяскоўцы здзіўляліся, навошта яна чалавеку без правай рукі. А ў Лявона наконт гэтага быў свой план — вельмі цяжкі, клопатны, які не даваў яму спакою ні ўдзень, ні ўначы. Ён добра разумеў, што жыць у вёсцы і не брацца за касу—гэта паўчалавек, а такім сябе Лявон нават у думках не мог дапусціць. Да яго з сельсавета часам заглядваў страхавы агент Сярмяжка. Той таксама правую руку страціў на фронце, яе ампутавалі па самы локаць, і цяпер у Сярмяжкі была скураная рука-пальчатка, якую яму зрабілі ў Мінску. У пальчатцы нават варушыліся пальцы, аднак гэта пальчатка хутчэй была дзеля формы, бо Сярмяжка ўсё роўна пісаў левай рукой. «А ў мяне ж толькі па куксу адхапіла моц у руцэ ёсць,—разважаў Лявон. — Калі ж ёсць моц, то яе трэба не цурацца, выкарыстаць трэба...»

Пасучы кароў, Лявон даставаў са сваёй пастуховай сумкі кавалкі лямцу, халяў, гумавых трубак розных памераў. Калі ўсё гэта хораша злучыць, прымудрагеліць, то правая рука, мусіць, зможа надзейна ўтрымліваць кассё. Толькі б трымалася гэта рука, толькі б не выслізгвала пры касьбе, то ў плячах хопіць сіл цягаць яе сюды-туды.

Цэлымі днямі Лявон усё нешта адразаў нажніцамі, нешта падточваў, сшываючы правошчанай дратвай. Калі, нарэшце, штуковіна ўласнай канструкцыі была гатова, Лявон прыклаў куксу да касся. Не, куксу трэба надзейна абматаць мяккай анучай, а вось анучы якраз і не было. Лявон у роспачы адкінуў убок касу, не мог дачакацца, калі трэба будзе гнаць кароў на ферму.

Дома ён тайком ад Матруны сунуў у сумку яе старую паношаную хустку. Хустка была паркалёвая, мяккая, якраз такая, якая і патрэбна Лявону. Гонячы зноў кароў, Лявон не пераставаў думаць над простым жыццейскім пытаннем: вось у раённай газеце пішуць, як у адным калгасе падканструявалі сеялку, каб у зямлю не прасыпалася лішне насенне, там пабудавалі сушылку, куды проста з-пад дажджу засыпаюць збожжа, а вось каб хто хоць слова напісаў, як аднарукаму чалавеку стаць касцом, — такога Лявон не вычытаў.

Каровы ўздоўж рачулкі дружна пачалі скубсці росную траву, а Лявон прысеў на купіне, узяўся за сваю ранейшую справу. Калі ўсё было скончана, ён некалькі разоў, устаўшы, да болю ў плячах махнуў у паветры касою. Махнуў і адразу адчуў, што цяпер яго ні каса, ні кульця не павінны падвесці. Не, не павінны.

Лявон прайшоў за алешнікавыя кусты, дзе зараней аблюбаваў ладную латку атавы. Над палянай курыўся мяккі туман, толькі птушкі абуджалі ранішнюю цішыню, і Лявон быў вельмі рады, што тут яго ніхто не бачыць. Як бывала ў маладыя гады, ён цвёрда ўпёрся нагамі ў травяністы дол, зрабіў першы ўзмах касою. Сталёвае лязо да самых карэньчыкаў

(Заканчэнне на стар. 10—11).

У ЭКСПАЗІЦЫІ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

Другі год дзейнічае ў Клімавічах раённы краязнаўчы музей. Размясціўся ён у драўляным, аздобленым адмысловай разьбой будынку, дзе калісьці знаходзіўся дом графаў Мяшчэрскіх, узяты пад ахову дзяржавы.

Экспазіцыі чатырох залаў знаёмяць з багатай гісторыяй горада, якому больш за 400 гадоў. П. М. Лепяшынскі, У. Д. Бонч-Бруевіч — гэтыя слаўныя бальшавікі-ленінцы — ураджэнцы былога павета, цэнтрам якога з'яўляліся Клімавічы. Гэта таксама радзіма сямі Герояў Савецкага Саюза, двух поўных кавалераў ордэнаў Славы.

Тут змагаўся з ворагам журналіст-патрыёт А. Гардзіевіч, чыё імя выбіта ззлятымі літарамі ў Саюзе журналістаў БССР.

На Клімаўшчыне нарадзіўся і вырас камсамолец-герой І. Паўлючэнка, які здзейсніў у 1982 годзе свой подзвіг і пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Сёння Клімавічы — горад будоўляў. Зараз тут узводзяцца буйнейшы ў Беларусі камбінат хлебапрадуктаў, раённая бальніца, камбінат грамадскага харчавання, іншыя аб'екты народнагаспадарчага і сацыяльна-культурнага прызначэння.

Земляробы раёна штогод спаборнічаюць за права заваяваць ганаровыя прызы імя Героя Савецкага Саюза Д. Цірубіна, Д. Жмуроўскага, С. Раманца — сваіх землякоў.

А ў музеі прымаюць школьнікаў у акцябраты, піянеры, уручаюць камсамольскія білеты, моладзь тут сустракаецца з перадавікамі вытворчасці. Нядаўна з'явілася экспазіцыя, прысвечаная клімаўчаніну, паэту Івану Бурсаву, для якой ён прыслаў свае творы, выдадзеныя ў нашай краіне і за рубяжом.

М. ГЛУЗДОЎ.

ГОЛАС НАТХНЕННЯ

Голас Аркадзя Саўчанкі пазнаеш заўсёды. Мяккі лірычны барытон, асаблівая выразнасць выканання, пранікнёнасць адразу захопліваюць слухача — гучыць у выкананні спевака раманс, народная песня ці оперная арыя.

УПЕРШЫНЮ ГЭТЫ ГОЛАС я пачула па радыё. Аркадзь Саўчанка выконваў арыю Раберта з оперы П. Чайкоўскага «Іяланта». І сама музыка, і яе выкананне зрабілі вялікае ўражанне. У мяне дасюль засталося тагачаснае адчуванне святочнасці, узнёсласці, хараства сустрэчы з цудоўным.

А потым у нашым тэатры оперы і балета я ўбачыла спевака ў ролі Анегіна. Зноў — сустрэча з музыкай П. Чайкоўскага ў адметнай інтэрпрэтацыі А. Саўчанкі.

Нядаўна я перагледзела сваю «калекцыю» праграмак спектакляў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР за апошнія дзесяць гадоў. У такім «сканцэнтраваным» выглядзе паспрабавала ўявіць сабе гэўны этап творчага шляху спевака, час, поўны пошукаў, няспыннай напружанай працы. Вось толькі некаторыя з партый, якія выканаў А. Саўчанка за 10 гадоў: Лістрат у оперы Ц. Хрэннікава «У буру», Малатэста ў «Дон Паскуале» Г. Даніцэці, Фаскары ў оперы С. Картэса «Джардана Бруна», Радрыга ў «Дон Карласе» Д. Вердзі, граф Альмавіва ў «Вяселлі Фігара» В. Моцарта, Кізгайла ў «Сівой легендзе» Д. Смольскага, Ляўчук у оперы Г. Вагнера «Сцяжынаю жыцця», Мізгір у «Снягурачцы» М. Рымскага-Корсакава, Міхал у оперы Ю. Семянякі «Новая зямля». Адзін толькі пералік зробленага спеваком пераконвае ў разнастайнасці сцэнічных вобразаў А. Саўчанкі. Пераконвае ў тым, што кожная новая роля давала артысту магчымасць выяўляць нават кантрастныя грані свайго таленту.

Не буду падрабязна аналізаваць канкрэтныя ролі — пра кожную з іх неаднаразова пісалі. А паспрабую з дапамогай калег А. Саўчанкі па тэатры вызначыць тое галоўнае, што сёння вылучае гэтага саліста беларускай оперы як майстра сцэнічнага пераўвасаблення.

У адным з інтэрв'ю Аркадзь Маркавіч сказаў: «Я люблю выступаць у оперных спектаклях. Опера — гэта сапраўднае, сур'ёзнае мастацтва, якое мне асабіста прыносіць вялікую асалоду, бо сустракаешся і з цудоўнай музыкай, і з багатым літаратурным матэрыялам. Бывае заўсёды прыемна і радасна, калі ты знаходзіш партнёраў, здольных зразумець цябе, адчуць тваю імправізацыю і падтрымаць яе».

Такі партнёр А. Саўчанкі на працягу многіх гадоў — народны артыст БССР Віктар Чарнабаеў.

— Саўчанка — гэта акцёр натхнення, — гаворыць В. Чарнабаеў. — І мы з ім настолькі добра ведаем адзін аднаго, што, напрыклад, у спектаклі ці на рэпетыцыі я думаю: вось зараз Саўчанка павернецца — так і ёсць, ён паварочваецца. А вось зараз, думаю, зробіць «праходку» і... ён робіць «праходку». Я амаль ніколі не памыляюся, бо адчуваю, як ён будзе дзейнічаць у той ці іншы момант. Я спяваў з ім разам у многіх спектаклях, і тое, што ён выдатны партнёр, мне заўсёды дапамагала ў выкананні ўласнай партыі.

Размаўляючы з калегамі А. Саўчанкі па опернай сцэне, я чула неаднойчы, што ў партнёрстве з ім артысты заўсёды адчуваюць упэўненасць у сваіх сілах. Напрыклад, народная артыстка БССР Людміла Златава расказвала:

— З Аркадзем Маркавічам мы сустракаліся ў многіх спектаклях, пачынаючы з «Травіяты», потым былі «Шукальнікі жэмчугу», «Севільскі цырульнік», «Дон Жуан», «Вяселле Фігара», «Рыгалета», «Снягурачка». Ён заўсёды працуе з вялікай аддачай. На рэпетыцыях у Саўчанкі не бывае пустых хвілін. Кожная рэпетыцыя для яго — амаль спектакль. Як з партнёрам з ім працаваць цікава і прыемна, бо ён у кожны спектакль нясе душу і шчырасць.

Праца опернага спевака — гэта перш за ўсё штодзённыя, шматгадзінныя заняткі. Асноўнае тут, безумоўна, старанная апрацоўка, шліфоўка дэталей вакальнай лініі ролі, спасціжэнне логікі характару персанажа, праца над яго сцэнічным увасабленнем. І нават калі здаецца, што зроблена ўжо ўсё, заўсёды да артыста прыходзіць нешта новае ў трактоўцы вобраза. Менавіта такая творчая незаспакоенасць уласцівая А. Саўчанку. Ці не таму ён проста, здаецца, не ўмее на сцэне быць фальшывым, заўсёды пераканальна праўдзівы яго оперны вобраз, які, пры ўсёй умоўнасці жанру, павінен узрушваць гледачоў? Кожную сваю ролю сагравае А. Саўчанка чалавечнасцю. Тут і Радрыга з «Дон Карласа» Д. Вердзі, і зусім іншага часу і месца дзеяння, іншай псіхалогіі чалавек — Ляўчук з оперы «Сцяжынаю жыцця» Г. Вагнера...

Зусім нядаўняя работа спевака — Андрэй Балконскі ў новым спектаклі «Вайна і мір» С. Пракоф'ева. Сваімі ўражаннямі ад сумеснай працы з А. Саўчанкам над гэтым спектаклем падзяліўся музычны кіраўнік пастаноўкі, галоўны дырыжор тэатра, народны артыст РСФСР Генадзь Праваторaў:

— На сённяшні дзень няма патрэбы асабліва прадстаўляць спевака Аркадзя Маркавіча Саўчанку. Само званне «народны артыст СССР», нададзенае яму нядаўна, гаворыць пра тое, што крытэрыі яго выканаўчага майстэрства—усесаюзныя. Мяне прываблівае ў Аркадзю Маркавічу многае. Але, перш за ўсё, хочацца адзначыць далікатнасць ягонага абыходжання з творчым матэрыялам, пранікнёнасць падыходу да кожнай ролі. Вялікая адказнасць за сваю працу — вось тое, чым вызначаецца сёння мастацтва Саўчанкі. Яго прыемна бачыць на сцэне і слухаць, вабяць адметныя акцёрская і вакальная пластыка, прыгажосць голасу. Да таго ж ён тонкі і ініцыятыўны акцёр. Апошняя якасць не часта сустракаецца ў артыстаў. Тут магу адзначыць здольнасць Аркадзя Саўчанкі да самарэжысуры — надзвычай інтэнсіўнага працэсу карпатлівай унутранай працы над роллю.

Яго здабыткі бываюць у нейкай меры нечаканымі, бо сам пошук сродкаў выразнасці да часу схаваны ад старонняга вока. Я зразумеў гэта і заўсёды заахвочваў такі самастойны пошук акцёра. Аркадзь Маркавіч не спяшаецца з творчым рашэннем, але заўсёды дакладна і ўпэўнена ідзе да канчатковай мэты — да стварэння цэласнага, яркага, выразнага опернага характару.

Шчаслівы артыст, мастацтва якога вабіць і радуе людзей. Няхай жа і надалей адкрываецца слухачам і гледачам шчодрасць таленту Аркадзя Саўчанкі, няхай новыя работы на опернай сцэне прынясуць і самому спеваку і нам, яго слухачам, сапраўдную радасць дакранання да цудоўнага.

Таццяна ПЕСНЯКЕВІЧ.

На здымку: народны артыст СССР А. Саўчанка — Лістрат у оперы «У буру».

Фота Ул. КРУКА.

ЛЯВОНАВА РАНІЦА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8—9).

выбрывала траву, і Лявон з нейкай дзіцячай гарэзлівасцю ўсё налягаў на касу, не звяртаючы ўвагі на тое, што нешта быццам патрэсквала ў ключыцы, у паясніцы, а запясце штосьці пачало прыпякаць, быццам там, пад жончынай хусткай, ён забыўся патушыць акурак. Задыхаўшыся, Лявон гнаў пракос за пракосам, ён нават забыўся, што недзе побач ходзяць каровы, а за імі, шэльмамі, трэба ды трэба пастухова вока.

— Ага! От так! — сам сабе гучна сказаў Лявон, выпрастаўшыся, каб памянташыць касу.

Лявон ужо канчаў латку, калі з-за кустоў з «казою» вынырнуў брыгадзір Несцер Кутавы. Ён не спяшаўся падыходзіць да Лявона. Стаяў, як зачараваны, наглядаў за касцом. Потым, калі Лявон зноў выпрастаўся, каб мянташыць, Кутавы непрыкметна наблізіўся, пляснуў шырокай далонню па спацелым Лявонавым плячы:

— Забілі б, а не паверыў, што гэта ты, Лявон Паўлавіч, тут пракосы ганяеш!.. Ну, ну, проста здзівіў ты мяне!..

Лявон выцер рукавом спацелы твар і, вызваліўшы кульцю з касся, зазначыў:

— Пакуль цяжкавата, халера яго. Але думаю, Васільевіч, што скора змагу папрацаваць і віламі і граблямі... Хопіць ужо бяспомачным быць...

Мяняліся старшыні ў калгасе, мяняліся брыгадзіры, загадчыкі фермаў, а Лявон Касец паранейшаму пасвіў статак, падвозіў на ферму зялёную падкормку ды так спрытна завіхаўся віламі, што не кожная даярка магла з ім справіцца.

На розныя святы, на Дзень Перамогі яго, Лявона Касца, як і іншых былых франтавікоў, заўсёды выклікалі на праўленне калгаса, гаварылі пра яго добрыя словы, уручалі прэмію. Лявон на такія ўрачыстасці пастаянна прыходзіў у сваім нязменным зялёным касцюме ў шэрую палоску, гладка паголены і нікольки ў душы не крыўдаваў, што ў ягонага былога франтавога сябра Несцера Кутавога на лацкане пінжака ордэн Чырвонай Зоркі, а вось у яго, Лявона, няма нават медаля.

Усе доўгія пасляваенныя гады Лявон дружна пражыў з Матрунай. Вырасціў вакол хаты малады сад, нават развёў некалькі вулляў пчол. Дачцэ Тані памог пабудаваць у Мінску кааператыўную кватэру, купіў добрую мэблю і ўсё ніяк не мог зразумець, чаму дасюль трыццацігадовая Таня не знойдзе сабе харошага чалавека. Матруне не падабаліся такія Лявонавы развагі, і яна гаварыла:

— Ты, Лявонка, лепш пра што-небудзь іншае. А ў Тані свая галава на плячах, хай сама думае.

Тады Лявон выводзіў жонку на вуліцу, усаджваў яе на лаўку побач пад маладой бярозай і летуценна гаварыў:

— Хачу, Матруна, у падарожжа падацца... У той горад, што скалечыў мяне... Я тады пад танк цэлую звязку гранат кінуў, а мяне па руцэ, па галаве. Так што і я ў цябе смелы быў... Не толькі ж той смелы, у каго ордэн, медаль... От пайду праз год на пенсію — і паеду. З табой разам паедзем, свету белага паглядзім...

Назаўтра якраз была субота. Усіх франтавікоў сабралі ў калгасным клубе. Іграў духавы аркестр, франтавікоў віншавалі школьнікі, уручалі букеты кветак. Несцер Кутавы сядзеў побач з Лявонам Касцом, і ў іх руках гарэлі аднолькавыя букеты гваздзікоў.

— Зойдзем, Паўлавіч, да мяне, — сказаў Кутавы, калі яны выйшлі з клуба. — Мы ўсё ж не толькі з аднаго калгаса, а ўсю вайну плячо ў плячо прайшлі. Жонка чакае, да смерці пакрыўдзім яе, калі не зойдзеш.

Стаяў цёплы надвячорак, і яны павольна ішлі вуліцай вёскі. Лявон расказаў Несцеру пра сваю ўчарашнюю размову з жонкай — з'ездзіць у той горад, дзе быў паранены.

— А я вось усё ўспамінаю той польскі гарадок, дзе з другога паверха па нас страчыў немец з кулямёта. Ты бліжэй быў каля дома, я бачыў, як ты ў акно гранату кінуў. Я тут жа падняўся і ў пад'езд. Кулямётчыка штыком закалоў... Так што, Паўлавіч, мой ордэн, лічы, і твой...

— Але, гранату я кідаў, — згодна паківаў галавой Лявон. — І ў пад'езд пабег бы разам з табою, каб у пятку не свіснула куля. Адна дробязь, а не пабяжыш...

На парозе іх сустрэла Тамара Сідараўна. Яна была ў новай сукенцы, на стале ўсё было па-святочнаму ўпрыгожана.

— Што будзем, Паўлавіч? — усаджваючы госця на покуце, спытаў Несцер. — Белую ці чырвоную настойку з райскіх яблычак?

— Давай па кілішку настойкі, — сказаў Лявон.

Несцер напоўніў усім чаркі.

Удзячнасць узаемная

Клуб сяброў оперы: першы сезон

Гэтым летам завяршыўся першы сезон Клуба сяброў оперы. Няцяжка здагадацца: клуб неад'емны ад Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, таму і век яго мы будзем вымяраць па-тэатральнаму — не гадамі, а сезонамі.

За пяць з лішкам месяцаў — клуб адкрыўся 10 снежня творчым вечарам салісткі оперы Н. Галеевай — адбылося 12 пасяджэнняў. Гэта ўжо факт таго, што клуб працуе рэгулярна і інтэнсіўна. А ў якой абстаноўцы праходзяць яго пасяджэнні! Глядзельная зала або гасціная Дома работнікаў мастацтваў аказваюцца цеснымі для ўсіх наведвальнікаў. Пануе напружаная цішыня ў час выканання музыкі і выступленняў вядучых, а якія апладысменты пасля кожнага нумара праграмы, мноства кветак, жывая патрэбнасць абменьвацца ўражаннямі нават з незнаёмымі!

Узаемная ўдзячнасць аўдыторыі і выканаўцаў. Слухачы ўзрадаваныя сустрэчай тут, «дома», з артыстамі высокага прафесійнага ўзроўню, удзячныя ім за сур'ёзнасць і складанасць праграм, за гатоўнасць аддаваць клубу свой вольны час. Артысты, не надта спешчаныя гарачым прыёмам на спектаклях у сваім тэатры, рады бясконца спяваць перад такой чулай, культурнай, эмацыянальнай публікай. Вось бы штовечар у тэатры была такая публіка!

З гэтага якраз усё і пачалося — з жадання выхаваць для опернага тэатра сваю аўдыторыю. Ініцыятыва стварэння Клуба сяброў оперы зыходзіла ад БТА, канкрэтней — ад гарачай прыхільніцы опернага мастацтва, рэдактара бюлетэня «Тэатральны Мінск» С. Клімковіч. З ліку сваіх сяброў, такіх жа, як сама, сталых наведвальнікаў оперных спектакляў, яна і пачала фарміраваць актыў клуба. Дзейсным быў афіцыйны зварот да тагачаснага парторга Акадэміі навук БССР П. Прахарэнкі: ён прапанаваў ва ўсіх акадэмічных інстытутах, СКБ, бібліятэцы вывесіць аб'явы пра адкрыццё клуба, паведаміць для даведак тэлефоны БТА і тэатра. Гэта спрыяла прытоку ў клуб новых членаў, з якіх многія аказаліся не толькі ўдзельнікамі ўсіх клубных мерапрыемстваў і частымі гасцямі тэатра, але і гарачымі прапагандыстамі оперы.

Аказалася: гораду такі клуб быў неабходны. Той, хто прыходзіў на яго першыя пасяджэнні, «вербаваў» на наступныя сваіх сяброў. Узрастаў попыт на запрашэнні ў клуб. К канцу сезона ўзнікла праблема пошукаў больш прасторнага памяшкання для сустрэч. Думаем, ці не праводзіць клубныя мерапрыемствы ў глядзельнай зале опернага па панядзелках, калі ў тэатры выхадныя? У перспектыве могуць быць і выязныя пасяджэнні, у арганізацыі якіх значны ўдзел возьмуць актывісты клуба. Пэўны вопыт у нас ужо назапашаны. Напрыклад, на адным з пасяджэнняў дырыжор тэатра Я. Вашчак прадставіў наведвальнікам клуба лаўрэатаў нядаўняга Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя М. Глінкі — маладых салістаў беларускай оперы М. Мурадзян, А. Дзічкоўскага, М. Рысава. Затым усе прысутныя былі запрошаны на спектакль «Дон Карлас», дзе гэтыя выканаўцы дэбютавалі ў галоўных партыях, а праз некалькі дзён было наладжана абмеркаванне спектакля ў актавай зале Інстытута эканомікі АН БССР. Двойчы праграмы, падрыхтаваныя для клуба, пазней былі паказаны студэнтам Мінскага педагагічнага інстытута.

Дарэчы, у наступным сезоне мы маем намер удзяліць асаблівую ўвагу студэнцкай аўдыторыі. І тут спадзяёмся на дапамогу актывістаў клуба.

Як праходзяць пасяджэнні Клуба сяброў оперы? Пакуль што пераважалі творчыя вечары салістаў. З аматарамі оперы сустракаліся М. Майсеенка, Н. Касценка, Н. Руднева, В. Скорабагатаў, У. Эснадзіёсаў, В. Цішына... І каментарый вядучага, і праграмы гэтых вечароў былі падпарадкаваны адной мэце: даць як мага больш поўнае ўяўленне пра артыста як адэкватную творчую асобу. Артысты не абмяжоўваюцца выкананнем оперных фрагментаў: творы камерныя — дадатковая магчымасць для іх прадэманстраваць сваю музычную культуру, густ, інтэлект. Як правіла, выконваюцца і ансамблевыя сцэны: ва ўзаемаадносінах з партнёрамі артысты раскрываюцца нейкімі новымі гранямі, і прафесійнымі, і чалавечымі. Пры гэтым і тыя, хто не меў яшчэ ўласнага творчага вечара ў рамках клуба, становяцца «сваімі» для яго членаў. Гэта Н. Казлова, І. Адзінцова, А. Кеда, М. Жылюк...

Ад пасяджэння да пасяджэння расце аўтарытэт клуба ў нашым тэатральным калектыве. А вось што гавораць пастаянныя наведвальнікі:

Г. АЛЯХНОВІЧ, доктар эканамічных навук, прафесар БДУ:

— Чалавек — галоўная прадукцыйная сіла. А гэта значыць, што ад яго розуму, таленту, ад ягоных рук, здольнасцей, яго духоўнасці, яго ўсебаковасці залежыць не толькі яго асабісты лёс, але і ўзровень развіцця ўсяго нашага грамадства. І таму не толькі яго праца, але і тое, як ён праводзіць вольны час, яго захапленні, яго інтарэсы, — усё гэта ўжо глыбока сацыяльны фактар. У гэтым плане сістэму клубаў цяжка пераацаніць. Клуб сяброў оперы — не толькі самы надзейны спосаб далучэння нашых людзей да музычнага, да вакальнага мастацтва. Важна, што клуб набліжае да нас артыстаў, дазваляе зазірнуць у іх творчы свет, пазнаць іх эстэтычныя погляды, іх тытанічную працу. Далучэнне да гэтага свету адкрывае нам шлях да ўдасканалення саміх сябе, робіць больш інтэнсіўным наша духоўнае жыццё.

А. БОГУШ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар:

— Мы ходзім на пасяджэнні клуба з жонкай, выкладчыкам матэматыкі. Прыемна было даведацца, што ў тэатры працуе такая вялікая група таленавітых маладых спевакоў. Самай высокай адзнакі вартыя вядучыя: С. Штэйн, Я. Вашчак, В. Скорабагатаў. Вабіць і ўтульная, свабодная, раскаваная абстаноўка, цесны кантакт паміж выканаўцамі і слухачамі. Але ёсць у мяне пажаданне на будучае: больш уключаць у праграмы беларускай музыкі, і опернай, і камернай...

У наступным сезоне членаў клуба чакае паведамленне прафесара Г. Барышава пра музычна-тэатральную культуру Беларусі XVIII стагоддзя. Музыказнавец Н. Іўчанка знайшла партытуру камічнай оперы Вардоцкага «Рэфармаваны Апалон», якая ў канцы XVIII стагоддзя была пастаўлена ў Забельскай дамініканскай калегіі. Напэўна, аматарам оперы цікава будзе пачуць у жывым выкананні твор, напісаны на нашых землях у такі час. З сучасных беларускіх опер плануем паказаць «Францыска Скарыну» Д. Смольскага. Будзем знаёміць слухача і з беларускай камернай музыкай.

Беларускае тэатральнае аб'яднанне, тэатр оперы і балета гатовыя прыкласці шмат намаганняў, каб Клуб сяброў оперы і надалей спрыяў павышэнню опернай культуры ў нашым горадзе.

А. САЛАМАХА,
памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР.

У БЯСКОНЦЫМ СВЕЦЕ ГУКАЎ

Яго свет — агромністы і складаны свет музыкі. Для віяланчэліста Алега Алоўнікава інструмент — сродак найбольш поўна і шчыра выказваць свае думкі, пачуцці, эстэтычныя памкненні.

У дзяцінстве Алег гадзінамі праседжваў на рэпетыцыях і канцэртах з удзелам аркестра, якім кіраваў яго бацька Глеб Уладзіміравіч Алоўнікаў. Пазней, ужо набыўшы належную практыку, Алег некаторы час працаваў віяланчэлістам у гэтым аркестры — аркестры Дзяржаўнага ансамбля танца БССР. А затым — у Дзяржаўным сімфанічным аркестры рэспублікі.

Добрай школай для А. Алоўнікава была работа ў Мінскім камерным аркестры. Побач — цікавыя музыканты, у рэпертуары — цудоўныя ўзоры творчасці А. Вівальдзі, П. Хіндэміта, А. Карэлі, І.-С. Баха, Г. Пёрсела, І. Стравінскага, Д. Шастаковіча, савецкай, беларускай музыкі.

Работа з аркестрамі і сольныя выступленні, вучоба ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі мелі важнае значэнне ў станаўленні А. Алоўнікава перш за ўсё як саліста-віяланчэліста. Ён пашырае свой рэпертуар, выступае ў складзе розных калектываў на такіх канцэртных пляцоўках краіны, як Вялікі тэатр, Крамлёўскі Палац з'ездаў, Канцэртная зала імя П. Чайкоўскага, Вялікая зала Маскоўскай кансерваторыі, зала Ленінградскай філармоніі, Домскі сабор у Рызе і інш. Нястомны прапагандыст віяланчэльнай музыкі, А. Алоўнікаў так тлумачыць свой выбар, сваю прыхільнасць менавіта да віяланчэлі:

— Гэты інструмент для мяне найбольш цікавы сваёй вялікай «радаслоўнай», невычэрпнымі выканаўчымі магчымасцямі. Пранікнёны тон, багатыя тэмбравыя і кантыленныя магчымасці, дыяпазон больш за пяць актаў выяўляе ўсе віды чалавечага голасу ад басу да каларатурнага сапрана: ён іх аб'ядноўвае, гэты дыяпазон. Вось што такое віяланчэль. Тэхнічны ўзровень сённяшняга выканальніцтва на віяланчэлі не саступае ўзроўню ігры ні на адным струнным і духавым інструментах. Кампазітары ўсіх часоў звярталіся і звяртаюцца да віяланчэлі...

Алегам Алоўнікавым падрыхтавана нямала канцэртных праграм з твораў А. Вівальдзі, І.-С. Баха, І. Брамса, С. Пракоф'ева, А. Анегера. Ён выступае на Беларускім тэлебачанні ў перадачах пра Э. Грыга, В. Моцарта, П. Казальса, А. Блока, Д. Шастаковіча. І актыўна прапагандуе віяланчэльныя творы беларускіх кампазітараў. Яму як першаму выканаўцу сваіх твораў прысвяціў віяланчэльны канцэрт Г. Вагнер, А. Янчанка — свой Канцэрт для віяланчэлі з арганам, С. Картэс — Прэлюдыю і такату.

Алег Алоўнікаў. Работа мастака А. Дэмарына.

— Цікавы і сам працэс работы над творам у супрацоўніцтве з кампазітарамі, — гаворыць А. Алоўнікаў. — Такое супрацоўніцтва радуе, бо ў выніку яго пашыраецца рэпертуар беларускай віяланчэльнай музыкі.

Пераможца рэспубліканскіх і міжрэспубліканскіх конкурсаў музыкантаў-выканаўцаў, удзельнік фестываляў і дэкад беларускага мастацтва ў краіне і за мяжой, А. Алоўнікаў удасканальвае цяпер сваё выканаўчае майстэрства ў асістэнтуры-стажыроўцы пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры музычна-педагагічнага інстытута імя Гнесіных заслужанага артыста РСФСР дацэнта Л. Яўграфава. Значнае месца ў творчасці А. Алоўнікава займае і аркестравае дырыжыраванне: ён рыхтуецца да дыплома, заканчваючы оперна-сімфанічнае аддзяленне нашай кансерваторыі (клас Ю. Яфімава). Дырыжорскае мастацтва захапіла маладога музыканта пад час работы ў сімфанічным аркестры Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Там з ліку маладых музыкантаў А. Алоўнікаў арганізаваў камерны аркестр, які выступаў з канцэртамі ў Доме літаратара, у Саюзе архітэктараў, у Доме кіно, у Саюзе мастакоў БССР, у фае тэатра оперы і балета, зрабіў некалькі запісаў на Беларускім радыё. Як дырыжор А. Алоўнікаў працаваў у вучэбных калектывах Сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры кансерваторыі і ў БДК.

Зусім нядаўна, у канцы сезона, Алег Алоўнікаў упершыню стаяў за пультам сімфанічнага аркестра Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР: дырыжыраваў спектаклем «Кармэн-сюіта». А ў зале Палаца культуры Белсаўпрофа пад яго кіраўніцтвам прагучала ў канцэртным выкананні опера Г. Пёрсела «Дзідона і Эней» (у выкананні ўдзельнічалі Мінскі камерны аркестр і Камерны хор Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі пад упраўленнем Л. Яфімавай).

Шматграннай робіцца дзейнасць маладога музыканта.

А. ВАЙНШТЭЙН.

— За Перамогу, дарагія мае! За наша самае вялікае свята!

Яны ўтраіх доўга засядзеліся за сталом. І пра што б ні заходзіла бяседа, яна зводзілася да тых далёкіх франтавых дарог, па якіх разам праходзілі Лявон з Несцерам.

Ужо заходзіла сонца, калі гаспадар праводзіў Лявона да калгаснага саду, адкуль дарога вяла проста ў пасёлачак. У густым арэшніку стракаталі дразды, паабапал кусціўся бэз. На верхніх галінах, бліжэй да сонца, ужо ружавелі буйныя гронкі.

— Сёлета, бач, рана зацвіў бэз, — зазначыў Лявон, углядаючыся ў кожны куст. — І ў Польшчы, калі ляжаў у шпіталі, на Дзень Перамогі цвіў бэз.

— А я ў гэты дзень каля самай Прагі быў, — сказаў Несцер. — Ну, са святам яшчэ раз цябе, даражэнькі!

— І цябе са святам! — Лявон падаў Несцеру на развітанне левую руку. — От прыйду дадому, пераапрануся ды на ферму збегаю. Лысуха з Тамарынай групы не сёння-заўтра павінна цяліцца. Лепшая карова ў статку. Бухматая, як капа, мусіць, два цяляці прынясе...

Лявонава высокая, ледзь сутулая постаць пагойдвалася па дарозе. Вячэрняе сонца хавалася за нізкай хмаркай, што ружавела над далёкім лесам, і яго чырвоныя праменні асколкамі рассыпаліся па вострых вяршалінах.

Вяртаючыся дадому, Несцер расшпіліў каўнер кашулі, і шыю ласкаў цёплы ветрык. Заўтра будзе добрае надвор'е, і Несцер прыкінуў, што з самай раніцы трэба будзе паслаць людзей сеяць лён ва ўрочышча Высялкі: там ужо даўно паспела глеба. Прысеўшы каля хаты на лаўку, ён яшчэ доўга ўглядаўся ў вячэрняе неба, у якім пачыналі ўжо запальвацца бледныя зоркі. Несцераў позірк спакваля слізгануў па варотах, на якіх была прыбіта паштовая скрынка. З цёмнай скрынкі тырчэла белая палоска — газеты. Несцер устаў, выцягнуў пошту са шчыліны. Сёння ў душы ён пахваліў паштарку Марыю, што не засунула глыбока ў скрынку газеты і што не трэба ісці па ключ.

Жонка ўжо спала. Несцер кінуў газеты на стол у пярэдняй, распрануўся і ціха прайшоў у спальню.

Раніцою, п'ючы з кварты малако, Несцер узяў у рукі раённую газету. Паглядзеў на першую старонку, але на ёй не было зводкі. Зводка аб ходзе сяўбы была на трэцяй старонцы. Іх калгас значыўся на другім месцы ў раёне, і гэта абрадавала Несцера. Пад зводкай у звілістай рамцы была заметка пад загалоўкам: «Ордэн знайшоў салдата». Несцер бліжэй падставіў акуляры да газеты і не паверыў сваім вачам: у заметцы расказвалася пра паядынак радавога Лявона Паўлавіча Касца з фашысцкім танкам, за што адважны воін быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і цяпер гэту высокую ўзнагароду даслалі ў ваенкамат.

Несцер сунуў газету ў кішэню курткі, трушком выбег з хаты. Настылы за ноч «ІЖ» не адразу заводзіўся, і Несцер ад злосці ажно стукнуў кулаком па бензабаку.

Матацыкл абагнуў звілісты бераг рачулкі, выскачыў на цвёрдую сцежку праз луг. Статак пасвіўся па дробным алешніку. Несцер выключыў матор, пагукаў Лявона.

Плыў ранішні туман над лугам, узыходзіла сонца, чырвонае, нібы макаў цвет.

ПРЫСЛУХАЙСЯ ДА СУМЛЕННЯ

Драма «ВОСЕНЬ СЛЕДЧАГА» балгарскага пісьменніка Г. ДАНАІЛАВА ў Брэсцкім абласным тэатры імя Ленінскага камсамола Беларусі

ДЛЯ ДЭБЮТА ў якасці рэжысёра-пастаноўшчыка ў брэсцкім калектыве лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Уладзімір Забела абраў п'есу сучаснага балгарскага драматурга Георгія Данаілава «Восень следчага». Нашы тэатры наогул усё часцей звяртаюцца да драматургіі сацыялістычных краін, і гэта — натуральны вынік паглыблення працэсаў духоўнай інтэграцыі братніх народаў. Мабыць, памыляюцца тыя рэцэнзенты, якія лічаць выпадковым зварот нашых тэатраў да гэтай драматургіі (гэта выказвалася, напрыклад, на старонках часопіса «Мастацтва Беларусі» № 12 летась). Нядаўнія пастаноўкі п'ес балгарскіх аўтараў у нас — цікавыя старонкі ў летапісе літаратурных і культурных узаемасувязей СССР і Балгарыі ўвогуле. Такое пашырэнне далягляда ў патрэбнае і карыснае для нашай нацыянальнай сцэны. Да таго ж Г. Данаілаў, які прыйшоў у драматургію з дзіцячай літаратуры, сваімі п'есамі «Канец застаецца вам» і «Восень следчага» заняў месца сярод вядомых сваіх калег — такіх, як І. Радзічкаў, Н. Іярданаў, С. Страцієў, В. Пятроў і іншых.

Для рэжысёра У. Забелы, у актыве якога назапашаны вялікі вопыт пастаноўчай работы на тэлебачанні, такая работа давала магчымасць праверыць некаторыя свае творчыя прынцыпы на тэатральнай сцэне. У пастаўленых ім тэлевізійных спектаклях па творах А. Куляшова, І. Мележа, П. Броўкі, І. Чыгрынава, Я. Сіпакова і іншых пісьменнікаў выявілася ўменне рэжысёра працаваць з артыстамі, імкненне да непадробнай натуральнасці і арганічнасці паводзін герояў, беражлівыя адносіны да пафасу і зместу літаратурнай першакрыніцы.

Сюжэт п'есы Г. Данаілава не складаны. У следчым упраўленні здымаюць з пасады аднаго следчага, на яго месца прыходзіць новы, малады. Ён і заўважае, што сярод няскончаных спраў ёсць адна вельмі няясная. Ды яшчэ з дасье нехта забраў важныя паперы і дакументы...

Пачынаецца спектакль, і адразу ж адчуваецца, што рэжысура вылучае тое, што рухае не толькі сюжэт, а і ход разважанняў і ўчынкаў герояў. Пачынаецца псіхалагічнае даследаванне характараў двух цэнтральных персанажаў — маладога следчага Андрэева (артыст А. Гаманюк) і былога следчага Пятрова (А. Логінаў). Ёсць тут свая дыялектыка ўнутранай барацьбы ў кожным персанажы, у развіцці іх пачуццяў і перажыванняў, у выспяванні і гартаванні ідэйнай і духоўнай сталасці. Нібы эпіграф да спектакля гучаць у пралогу словы Андрэева пра тое, што ў жыцці кожнага чалавека бываюць выпадкі, калі трэба сказаць «так» альбо «не», і адно з гэтых рашэнняў становіцца яго лёсам.

Засяроджана і паслядоўна вядзе лінію паводзін свайго персанажа А. Гаманюк. Для следчага Антонава справа са старонкамі, якія нехта выкраў, — першае сур'ёзнае і не толькі службовае, але і жыццёвае, маральнае выпрабаванне. І ў паводзінах другіх дзейных асоб удзельнікі спектакля акцэнтуюць увагу менавіта на маральным аспекце. Вышэйшыя ідэалы дабрыні, гуманізму — вось асноўны крытэрый ацэнак учынкаў і дзеянняў усіх персанажаў. Таму і А. Гаманюку так верыш: яго Андрэеў — шчыры, сумленны, сціплы. Адначасова артыст знаходзіць і жанравыя фарбы ў абмалёўцы бытавога праўдападабенства ў паводзінах героя. Праўда, часам выканаўца як бы любуецца персанажам, знойдзенай для яго манерай рухацца, гаварыць. У такіх сцэнах непасрэднасць выглядае какетліва, і гэта псуе агульную строгую рэалістычную манеру акцёрскага жыцця ў вобразе.

Неадназначны вобраз следчага Пятрова стварае адзін з вядомых майстроў нашай сцэны А. Логінаў. Ён глыбока матывуе ўчынкі свайго персанажа і тады, калі той ідзе на парушэнне службовай інструкцыі, каб адвесці падазрэнні ад сябра дзяцінства — ад Сарафава, і тады, калі асэнсоўвае сваю памылку. Яна ж — не толькі службовае злачынства, а і парушэнне норм сацыялістычнай маралі. Сарафаў — не толькі блізкі сябра Пятрова, ён — чалавек, які займае даволі адказную пасаду ў горадзе, чалавек вонкава бездакорнай рэпутацыі, таму так лёгка «мець з ім справу». Пераадольваючы жыццёвыя і псіхалагічныя цяжкасці, следчы Пятроў перамагае перш-наперш сваю слабасць, хісткасць, двоістасць. У акцёрскай палітры А. Логінава — каларытныя артыстычныя фарбы, і разам з тым яго персанаж не пазбаўлены тонкіх нюансаў як даволі складаная чалавечая асоба. Хацелася б пажадаць артысту ў сцэнах, дзе нараджаецца яго ўзаемнае пачуццё да Марыі, пашукаць большага псіхалагічнага грунту, каб і глядач адчуў, што следчага Пятрова такая жанчына, як Марыя, пакахала не выпадкова.

Артыстка Н. Кафанава паказвае Марыю трапяткой, неспакойнай. Сакратарка Сарафава, яна добра разбіраецца ў тым, што адбываецца, і ведае, хто і чаму на самой справе пайшоў на службовае злачынства. У спектаклі ёсць вельмі важная сцэна, дзе Марыя міжволі становіцца сведкай сустрэчы старых сяброў — Пятрова, Сарафава і Пракурора. Нам здаецца, што ў гэтай сцэне рэжысёр і выканаўцы мужчынскіх роляў нібыта забыліся на тое, што побач — Марыя, што яна кахае Пятрова, што многае, аб чым гавораць персанажы, тут павінна ўспрымацца перш за ўсё яе вачамі, праз яе перажыванні. Тады глядач з большым хваляваннем сачыў бы за развіццём узаемаадносін Марыі і Пятрова, за гісторыяй іх кахання, насуперак значнай розніцы ва ўзросце. Тады больш эмацыянальна прагучыць і фінал спектакля — сумная вестка пра смерць Пятрова.

Сярод цікавых акцёрскіх работ у гэтым спектаклі, безумоўна, вылучаецца вобраз Сарафава ў выкананні С. Еўдашэнкі. Яго персанаж жанрава даволі каларытны, неадназначны ў выяўленні сваёй сутнасці. Тыц вельмі хітры, ён хаваецца пад маскай прыстойнасці і дабрачыннасці, таму так цяжка маладому следчаму знайсці важкія і канкрэтныя доказы яго віны. Да таго ж артыст арганічна вядзе лінію паводзін Сарафава, дзе і шчырасць, і ліслівасць, і шантаж, і знешні бляск, і дэмакратызм, і такая ўвага да тых, хто побач... Выкрыць такога злачынцу нават з юрыдычнага пункту гледжання даволі складана, таму вынік следства, якое вядзе Андрэеў, набывае ў спектаклі гучанне сапраўднага службовага і маральнага подзвігу маладога спецыяліста.

Жорсткія патрабаванні пастаноўчай стылістычнай еднасці спрыяюць стварэнню акцёрскага ансамбля. Пошук адметнай характарнасці прыкметны ў работах артыстаў Л. Дойбан (Пятрова), Т. Маісеенка (Алена), Г. Токарава (Іваноў), А. Цецярчук (Хрыстава), А. Грозева (Алексіеў). На гэтым фоне схематычна выглядае персанаж артыста В. Кулішава (Пракурор). Праўда, у яго даволі абмежаваны тэкставы матэрыял; аўтар нават не называе прозвішча персанажа, ён так і значыцца — Пракурор. Ды аўтарская пазіцыя, відаць, не выпадковая, і, нам здаецца, далейшая праца над гэтым сцэнічным вобразам павінна ісці па лініі ўзмацнення яго псіхалагічнай значнасці. Артысту ні на хвіліну нельга забываць, што яго Пракурор — і начальнік, і старэйшы калега для следчага Андрэева. Адкуль жа тады неўласцівыя літаратурнаму персанажу слязлівыя інтанацыі, якія зусім не ў характары вобраза і не вынікаюць з тэксту?

У асноўным адпавядае агульнай задуме спектакля сцэнаграфія мастака Віктара Лесіна, дзе параўнаўча ўдала спалучаецца і тэатральная ўмоўнасць і метафарычнасць; праўдзіва выглядаюць канкрэтныя дэталі. Усе сцэны па-за межамі «чатырох сцен» кабінетаў і кватэр мастак смела выносіць на галерэю, на своеасаблівы «другі паверх». Лёгкасць усёй канструкцыі, каларыстычная гама сцэнічнай прасторы выклікаюць адчуванне цёплай балгарскай восені. Цяжка, праўда, пагадзіцца з буйным бутафорскім лісцем на аванцэне і на крэслах у кабінеце следчага на пачатку спектакля. У гэтым лісці — нейкая штучнасць, якая не адпавядае агульнаму пастановачнаму прыёму і стылістыцы відовішча.

Дэбют рэжысёра адбыўся. Прадстаўнікі розных акцёрскіх пакаленняў, магчыма, і розных школ сустрэліся ў спектаклі «Восень следчага» ў прапанаваных рэжысёрам У. Забелам умовах амаль дакументальна строгай, арганічнай і псіхалагічна змястоўнай драмы. Глядач успрымае відовішча як павучальны жыццёвы прыклад. Сумленне падказвае нам самыя верныя крокі, не зважаючы на сяброўскія і іншыя сувязі і пачуцці. Хай сабе зрэдку бачыш і спробы асобных выканаўцаў роляў іграць «як раней», па законах старой ужо сёння тэатральнай стылістыкі, спектакль жыве і ўдасканальваецца з кожным новым паказам. Ён хвалюе, прымушае задумацца пра тыя ў нашым жыцці хвіліны, калі трэба выбраць адзіны правільны адказ, калі ад таго, што ты скажаш — «так» альбо «не», — залежыць твой лёс.

Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ.

Алігасан Шырванлы (Наджараў) парадніўся з Беларуссю пад час сумеснай барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Баявое пабраціцтва, нават праз гады і адлегласці, знайшло водгук у яго творчасці.

Адзін з вершаў азербайджанскага паэта прысвечаны камсамолцы Рыме Кунько — удзельніцы партызанскага руху на Магілёўшчыне. У свае няпоўныя семнаццаць гадоў яна была сувязной партызанскага атрада, арганізатарам і кіраўніком маладзёжнай дыверсійнай групы. Загінула ў бай 1 ліпеня 1944 года. Пахавана ў вёсцы Ліпень. Адна з вуліц у Асіповічах носіць яе імя.

Сёлета Алігасан Шырванлы зноў наведаў нашу рэспубліку, каб яшчэ раз прайсціся незабыўнымі сцежкамі. Разам з азербайджанскім госцем былі зроблены падрадкоўнікі двух вершаў, якія я і прапаную чытачам «ЛіМа» ў сваім перакладзе.

Сяргей ПАНІЗНІК.

Алігасан ШЫРВАНЛЫ

Беларускаму сябру

Брат, здалёку прыйшоў прывітаць
я цябе,
пакланіцца змагарнаму краю.
Ты праславіў айчыну сваю
ў барацьбе:
тую бітву я сам добра знаю.

Ваявалі адважна краіны сыны,
разам білі мы ворага злога.
Чую сёння я порах той страшнай
вайны,
чую кліч пераможнага слова.

Помню шчырасць тваю і усмешку
вачэй,
і любоў беларускага сэрца.
Варта Янку Купалу пазваць мне
грамчэй —
між герояў імя адгукнецца.

І прыпомню я зноўку дубровы, лясы,
партызанскія рэйды, засады...
Не скарылі захопнікі смелай красы:
выручаў тут брат роднага брата.

І каб воля хутчэй азарыла зямлю,—
гнаць прышэльцаў усё памагала:
хвоі, ліпы стоасалі фашысцкую тлю...
І канала у багне навала.

Не забыць нам з табой баявы наш
хаўрус.
Не разлучыць ніхто нас на свеце!
Верны сябар, адданы мой брат —
беларус,
мой сусед на зялёнай планеце.

Незабыўная Рыма

Памяці Рымы КУНЬКО, харобрай беларускай партызанкі з Магілёўшчыны

На урокі нядаўна
Бегла ў школу яна.
А цяпер — партызанка,
Бо лютуе вайна.

Рыма ў пушчу на сувязь,
Як у школу, ідзе,
Бо не можа іначай:
Родны край у бядзе.

Ў берасцянцы не кніжкі,
А патроны і тол,
Прыхаваны грыбамі...
Ягад — поўны прыпол.

І шалеюць фашысты:
Зноў узрывы грымяць.
Гэта Рыма з сябрамі
Нішчыць ворага рать.

Ды чаму так жалобна
Бор сустрэў змагароў?
Па зямлі — як суніцы —
Кроплі... Рыміна кроў...

Я вяртаюся ў Ліпень,
Дзе Кунько Рыма спіць.
Над магілай дзяўчыны
Зорка ярка гарыць.

А на мармуры — словы:
Прадаўжэнне жыцця.
Рыма, ведай: усе мы
Уздымаем твой сцяг.

Сцяг чырвоны — над намі.
Памяць — слава вякоў.
Зноў іду я па вуліцы
Рымы Кунько.

У даўгу перад ёю,
Перад гэтай зямлёй...
Ў Асіповічах — рэха
Маладосці маёй.

ПОШУКІ, ЗНАХОДКІ

НА АФІШЫ—ІМЯ МАРЦІНКЕВІЧА

На жаль, пра творчасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, які адыграў вялікую ролю ў станаўленні новай беларускай літаратуры XIX ст., аднаго з заснавальнікаў нацыянальнай драматургіі і сцэнічнага мастацтва, дасюль мы маем вельмі скупыя звесткі. Асабісты архіў, які пісьменнік захоўваў у сваёй сядзібе, паводле сведчання Ядвігіна Ш., загінуў у час пажару ў Люцінцы. Апошнім часам выяўлена значная колькасць новых дакументаў, якія дапамаглі ўдакладніць многія факты творчай біяграфіі В. Дуніна-Марцінкевіча. Аднак дасюль нямала ягоных твораў вядомыя нам толькі па назвах. Прынамсі, першыя музычна-драматычныя творы: «Яўрэйскі рэкруцкі набор», «Спаборніцтва музыкаў» і «Чарадзейная вада» — напісаныя ў 40-х гадах XIX ст. Тэксты названых п'ес не публікаваліся і да гэтага часу не знойдзены. Праўда, кароткі змест «Яўрэйскага рэкруцкага набору» пераказваецца ў невялікай рэцэнзіі, апублікаванай 10 кастрычніка 1841 г. у «Минских губернских ведомостях». Лічыцца, што музыку да тэксту В. Дуніна-Марцінкевіча напісалі выдатны польскі кампазітар С. Манюшка і мінскі музыкант К. Крыжаноўскі.

У фондах Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіву БССР нам удалося нядаўна знайсці арыгінал афішы 1841 г. аб спектаклі і канцэрце, збор сродкаў з якіх быў перададзены на карысць дзіцячага прытулку ў Мінску. З дабрачыннымі мэтамі былі паказаны тры п'есы, у тым ліку і «Яўрэйскі рэкруцкі набор» В. Дуніна-Марцінкевіча.

Афіша складаецца з дзвюх склееных, аднолькавых па памеры, частак (46×36 см.). Тэкст афішы змешчаны паралельна на рускай і польскай мовах. Вось найбольш цікавыя яго фрагменты: «23 Сентября 1841 года по приглашению Попечительства детского приюта, который утверждается в Минске под всемилостивейшим ЕЕ ИМПЕРАТОРСКОГО ВЕЛИЧЕСТВА ГОСУДАРЫНИ ИМПЕРАТРИЦЫ покровительством, благотворительные особы представляют, в пользу кассы детского приюта, благородный на здешнем Театре спектакль: две комические п'есы на русском и оперу на польском языках...

3. ЕВРЕЙСКИЙ РЕКРУТСКИЙ НАБОР. Комическая Опера в одном действии, сочинения Гг. Марцинкевича и Крижановского.

ДЕЙСТВУЮЩИЕ ЛИЦА.
Мирослав, Полковник — г. Мединский
Вильгельм, солдат — г. Рассадовский
Иоганн Беннатан, еврей — г. Марцинкевич
Сора, его дочь — д-ца В. П. Волотовская
Янкель, жених ее — г. Ю. И. Семенкевич
Израиль, вдовец — г. Крижановский
Хор евреев — гг. Корбут Бернард, Петропавловский, Домашевич, Кучинский
Солдат — Шембель

Начало в 7 часов...»

Знаходка афішы дазваляе вызначыць дакладнае месца пастаноўкі твора В. Дуніна-Марцінкевіча. Опера была паказана ў мінскім гарадскім тэатры, будынак якога ў XIX ст. месціўся на паўднёва-ўсходнім баку цяперашняй плошчы Свабоды.

Уладзімір ДЗЯНІСАЎ.

Кадр з фільма «Інтэрнат ты наш...»

ТВАРЫ БАЦЬКОЎ І ТВАРЫ ДЗЯЦЕЙ

ШКОЛЬНІКІ рэпеціруюць сцэну з бессмяротнага твора, які стагоддзі хвалюе сэрцы і абуджае чалавечы розум. Ён — Рамэа, яна — Джульета. Каханне...

— Дзеці? — спытае чытач.— Ці не зарана ім?

І на такое пытанне адказваюць аўтары дакументальнага фільма «Інтэрнат ты наш...» — сцэнарыст Васіль Гігевіч, рэжысёр Дзмітрый Міхлееў і аператар Юрый Плюшчаў. Яны жывуць і вучацца ў Радашковіцкай школе-інтэрнаце пад Мінскам. Грамадства вымушана браць на сябе ўсе клопаты па выхаванні юных грамадзян. Школа воляй лёсу замяняе ім бацькоў. «Замяняе...» Вось тут і вузел маральных праблем, над якімі сур'ёзна задумваюцца сёння ўсе — і самі бацькі, і школа, і псіхолагі, і сацыёлагі...

Чаму дзеці апынуліся тут, у інтэрнаце, пры жывых у большасці бацьках? З якой прычыны пазбаўлены бацькоўскай ласкі, мацярынскай пяшчоты?

У першую чаргу вінаваты ва ўсім бацькі, — так сцвярджае фільм. Гэта яны, здрадзіўшы сабе, законам чалавечага жыцця і нормам нашага грамадства, робяць няшчаснымі, у нечым назаўсёды пакрыўджанымі, духоўна і маральна «не такімі», як большасць дзяцей, сваіх сыноў і сваіх дачок.

Калі глядзіш фільм, пераконваешся, што ў інтэрнаце створаны ўсе ўмовы для змястоўнага і цікавага жыцця, для вучобы і адпачынку, для развіцця здольнасцей і пазнання свету. Усё — акрамя бацькоўскай ласкі, якую нічым не замяніць!

З чаго ўсё пачынаецца? Напэўна, не з гэтага, не з марша Мендэльсона, пад гукі якога маладыя клянуцца ў каханні і вернасці. Правамерна, што аўтары фільма, думаючы пра гэта, задаюць толькі што ўступіўшым у шлюб адно і тое ж пытанне:

— Вы любіце?

— Вядома! Што за пытанне... — гэта муж кажа.

— А вы?

— Так! Інакш сюды не прыйшла б, — кажа маладая жонка.

А ці падрыхтаваны яны да сапраўднага сямейнага жыцця, ці здолеюць перанесці і засмучэнні, і радасці, і абавязкі, і канфлікты няпростых будняў сямейнага саюза? Нездарма ж праз пяць, нават праз год, бывае, чуеш наступнае: «Якая ўжо любоў? Ён мне столькі дрэннага зрабіў... Дзяцей не шануе... Б'ецца...» Або: «У нас няма нічога агульнага ў разуменні самога жыцця...» Сям'я разбураецца.

Аўтары фільма не імкнуцца павучаць нас, як жыць і як сябе паводзіць. Яны стараюцца, расказваючы пра школу-інтэрнат, пра жыццё ў ім дзяцей, выклікаць гледача на роздум. Тое, што мы бачым на экране, не можа не ўсхваляваць, бо дзіцячыя твары і дзіцячая непасрэднасць заўсёды ўражваюць, асабліва ў такім «сюжэце».

У пераважнай большасці выпадкаў, як паказвае практыка —і гэта падкрэслівае фільм!— усё пачынаецца вось тут, ля прылаўка магазіна, адкрыцця якога з вялікім нецярпеннем чакаюць аматары спіртнога.

«Досыць! — можа запярэчыць іншы чытач. — Гэта агульнавядома. Пра гэта гаварылі і пісалі шмат...»

— Патрэбна! — сцвярджаюць аўтары фільма. Бо за кожным з дзяцей толькі вось у Радашковіцкай школе-інтэрнаце стаіць пакалечаны лёс самага дарагога, што мы маем, — будучыні нашай.

Угледзімся ў твары тых, хто стаіць у чарзе па віно або гарэлку. Ці кожны з іх з'яўляецца сапраўдным бацькам або маці? Такое пытанне, знарок завостранае аўтарамі фільма, сёння гучыць надзвычай актуальна. Вядома, можна было б больш падрабязна расказаць пра жыццё дзяцей у школе-інтэрнаце, стварыўшы досыць прыгожы фільм, без значнага сацыяльнага пафасу. Атрымаўся б буклет. І мы зноў былі б усцешаны: кінутае бацькамі дзіця знойдзе ў нашай краіне прытулак. Ды само існаванне такіх інтэрнатаў для дзяцей, бацькі якіх справядліва пазбаўлены права іх выхоўваць з прычыны сваіх антыграмадскіх паводзін, — трывога. Нельга мірыцца з тым, што маладая мама і малады тата добраахвотна губляюць права выхоўваць дзіця.

Маленькае інтэрв'ю, якое ўзялі аўтары фільма ў бары. Пытанне пастаўлена прыкладна так: ці падабаецца маладым дзяўчатам, якія неўзабаве выйдуць замуж, быць гаспадынямі ў доме? Даверлівая размова за шклянкай бяскрыўднага кактэйля. Верыш у яе шчырасць. Аказваецца, той (або — тая) сумуе, што шмат часу аддае рабоце на вытворчасці, і яму (ёй) не хочацца абцяжарваць сябе хатнімі клопатамі. Лепш і больш прыемна бавіць час так, як таго жадаеш сёння, зараз: жыццё ж трэба рэбіць «разнастайным». Для гэтага, не зробім адкрыцця, у нас ёсць усе магчымасці: ад стадыёнаў да тэатраў, ад бібліятэк да турысцкіх падарожжаў. Бары — таксама. А ці адпавядаюць яны сёння свайму прызначэнню? Ці не з «маленькай» чаркі пачынаецца тая сцежка для некаторых людзей, якая ў рэшце рэшт прыводзіць чалавека, мякка кажучы, да нечалавечага стану... Вось як гэту жанчыну (вы яе ўбачыце ў фільме): на пытанне, колькі ў яе дзяцей і як іх завуць, маці доўга не можа даць упэўнены адказ. Адрасы бараў яна помніць!..

Аўтары фільма фарбы не згушчаюць. Усе кадры — дакументальныя. Абліччы «герояў» пазнавальныя: мы з такімі яшчэ сустракаемся. Такія людзі не маюць права называцца бацькамі. Правільна! А ці разумеюць яны гэта самі, людзі з сярэдняй адукацыяй, жыхары цывілізацыі канца XX стагоддзя? Адкуль у іх сілы спакойна назіраць, як калечыцца лёс іх дзяцей?..

Дык хто ж жыве тут, у інтэрнаце? У аднаго маці памерла, бо піла; у другога бацька п'е... У трэцяга... гучыць адказ як прысуд — ва ўсім вінавата гарэлка.

Хвіліначку! А яны самі, бацькі? Хай паглядзяць на дзяцей. Яны на поўным дзяржаўным забеспячэнні, пра іх клапоцяцца высокакваліфікаваныя настаўнікі і выхавацелі, але ніякі інтэрнат не можа даць ім тую бацькоўскую ласку і пяшчоту, пра якую яны мараць, якой яны чакаюць. Гэта бачыш і гэта адчуваеш. Няўжо людзі, якія законам пазбаўлены бацькоўскіх правоў, не ўспрымаюць нават такіх урокаў? Мабыць, па-сапраўднаму задумаюцца над лёсамі сваіх дзяцей, над сваім уласным лёсам, калі паглядзяць фільм. Хацелася б верыць у гэта. Бо якія выразныя кадры з дзецьмі! Ім тут добра, нават бесклапотна. Але на іх вясёлых і такіх розных тварах, якія свецяцца жыццялюбствам і радасцю, мільгае цень смутку... З вуснаў, здаецца, зараз сарвуцца словы балючай крыўды на тых людзей, якія ад прыроды прызваны быць самымі дарагімі і блізкімі ў жыцці...

Ёсць пра што задумацца. І менавіта так уздзейнічае на гледача новая стужка аб'яднання «Летапіс» студыі «Беларусьфільм».

Уладзімір САЛАМАХА.

З КАНЦЭРТАМІ — НА СВЯТА ЎРАДЖАЮ

Тураўскі народны ансамбль танца «Прыпяць» вядомы далёка за межамі Жыткавіцкага раёна. За гады свайго існавання ён даў больш за тысячу канцэртаў. Майстэрству самадзейных артыстаў апладзіравалі гледачы Масквы, Бранска, Мінска, Гомеля. Калектыў ансамбля прадстаўляў нашу рэспубліку на ўрачыстасцях у Грузіі, прысвечаных 200-годдзю Георгіеўскага трактата аб дружбе рускага і грузінскага народаў, выязджаў у Чэхаславакію на Дні чэхаславацка-савецкай дружбы.

А нядаўна танцоры «Прыпяці» пабывалі ў Малдавіі, дзе прынялі ўдзел у свяце ўраджаю ў горадзе Крыулянэ. Цікавую канцэртную праграму падрыхтаваў ансамбль да гэтых выступленняў: беларускія народныя танцы «Кука», «Тураўская полька», «Палескія падскокі», «Ля кузні», абрадавы карагод «Няхай жыта родзіць» і іншыя. Харэаграфічныя кампазіцыі, танцы пастаўлены кіраўніком «Прыпяці» балетмайстрам М. Котавым.

А. СУЛКОЎСКАЯ.

У ГОСЦІ ДА СЯБРОЎ

Нядаўна народны тэатр з Пінска наведаў горад Уладзімір-Валынскі (УССР). У праграме «Знаёмцеся: вашы суседзі» госці паказалі ўрыўкі са спектакляў, мініяцюры, эстрадныя маналогі. Рэжысёр тэатра З. Драп расказала гледачам аб творчых дасягненнях калектыву, іх планах на будучыню.

Пінчане наведалі музей пагранічнай славы, мемарыяльны комплекс ахаярам фашызму, пазнаёміліся з гістарычнымі месцамі горада і раёна.

А. ЛЯЛІКАЎ.

ВІНШУЕМ!

За заслугі ў развіцці выяўленчага мастацтва, вялікі ўклад у ідэйна-эстэтычнае выхаванне моладзі Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў члену Саюза мастакоў Беларускай ССР, кіраўніку народнай самадзейнай выяўленчай студыі Слуцкага Дома піянераў і школьнікаў САДЗІНУ Уладзіміру Сцяпанавічу ганаровае званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР.

●

За заслугі ў развіцці музычнага мастацтва, актыўны ўдзел ў грамадскім жыцці і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў народнага артыста СССР ЦІТОВІЧА Генадзя Іванавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Часопісы ў жніўні

«ПОЛЫМЯ»

«Жывыя жывуць» — аповесць Т. Бондар.

Змешчаны вершы маладых паэтаў В. Шніпа, В. Аколавай, У. Пецюкевіча, Л. Галубовіча, Л. Дранько-Майсюка, Г. Булыка, А. Жыгунова, Л. Паўлікавай, В. Жданко, Т. Дзмітрусёвай, А. Лісіцкага, С. Бесталай.

З аповесцю «Чужы сваяк» выступае М. Капыловіч.

Пад рубрыкай «З літаратурнай спадчыны» прапануюцца вершы А. Сербантовіча, «Новыя пераклады» — вершы А. Малдоніса (пераклаў А. Разанаў).

У раздзеле «Публіцыстыка» — артыкул Я. Бабосава і М. Горлача «Стаханаўскі прыклад» і ўрывак з кнігі А. Вярцінскага «Нью-йоркская сірэна».

«Рэзерв камбата» — нарыс І. Скарынкіна.

«Задачы вынікаюць з самога жыцця...» — дыялог І. Навуменкі і У. Гніламёдава, «Пошукі слова» — артыкул Р. Шкрабы.

Публікуюцца запісы з «Англійскага дзённіка» А. Мальдзіса.

Артыкул М. Пазнякова «Эпітэт — душа паэзіі» закранае пытанні паэтычнага майстэрства.

Кнігі рэцэнзуюць А. Малочка, І. Росман, А. Марціновіч і М. Яфімава.

Завяршае нумар «Наш каляндар».

«МАЛАДОСЦЬ»

Паэзія прадстаўлена вершамі Д. Бічэль-Загнетавай, Т. Зіненка, В. Сахарчука, Т. Бондар, А. Грачанікава.

Змешчаны аповесці «Рагал» М. Гіля, «Цяжкі хлеб» А. Жалязоўскага, апавяданні А. Макоўскага.

Пра рэформу агульнаадукацыйнай школы разважае А. Сачанка — «Заўтрашнія клопаты».

«Зямныя сімвалы» — нарыс У. Саламахі.

З запаветнымі мясцінамі рэспублікі знаёміць фотарэпартаж В. Ждановіча «Воўча».

«Па дарозе да чытача» — дыялог крытыка Т. Грамадчанкі і празаіка У. Арлова.

Штрыхі да творчага партрэта А. Сербантовіча напісаў С. Кавалёў — «Глыток жыцця».

Пра знаходжанне Я. Купалы ў Чувашыі расказвае М. Юхма — «Цеплыня ў халады».

М. Гайцюкевіч рэцэнзуе зборнік вершаў А. Жыгунова «Матчына вышыванка».

«БЕЛАРУСЬ»

Пад рубрыкай «Актуальны погляд» — роздум начальніка цэнтральнай лабараторыі пластмас Мінскага аўтамабільнага завода І. Дзямідава «Стаханаўцы».

Яшчэ адну старонку ўсенароднай барацьбы з фашызмам прыадкрываюць у нарысе «Інакш яны не маглі...» А. Літвін і Ж. Літвіна.

Змешчаны вершы Я. Янішчыц, апавяданне М. Барэйшы «Світанне», фантастычнае апавяданне Л. Дзімава «Палёт у будучыню» (пераклад з балгарскай В. Маслоўскай). Падборцы вершаў Л. Геніюш папярэднічае слова Д. Бічэль-Загнетавай.

У гады першай рускай рэвалюцыі вяртае чытача М. Іоська — «Хто вы, доктар Русель?».

Да 75-годдзя з дня нараджэння народнага артыста СССР Г. Цітовіча — артыкул А. Фядосіка «Песня ад шчырага сэрца».

Актуальныя праблемы паўсядзённага жыцця закранаюцца ў выступленні слесара - інструментальшчыка вытворчага аб'яднання «Мінскі трактарны завод» імя У. І. Леніна, члена ЦК КПСС Я. Клімчанкі «Каб кожны стаў гаспадаром».

Слова дырэктара Блужскай сярэдняй школы імя М. П. Чэпіка Б. Зубкоўскага «Хлопец з вёскі Май» — пра Героя Савецкага Саюза М. Чэпіка, які гераічна загінуў, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

Чытача зацікавяць нарыс Л. Левановіча «Глыбокія карані», карэспандэнцыя В. Арловай «Кліча арган у Сафію», рэцэнзія В. Анішчука «Дарога цяжкаю была...», у якой разглядаецца кінатрылогія «Нэру», падборкі «Рэзананс», «Спорт. Гумар. Красворд», іншыя матэрыялы.

«НЕМАН»

З вершамі выступаюць С. Законнікаў (пераклад Р. Казаковай) і П. Кошаль.

Проза прадстаўлена апавяданнем М. Кругавых «Алена з Забалоцця», аповесцю М. Кацюшэнкі «Сустрэча пасля развітання» (пераклад У. Гніламёдава), працягам рамана Ж. Сімянона «Справа Фершо» (пераклад Т. Грачовай).

У раздзеле «Публіцыстыка і нарысы — разважанні С. Курылёвай «Энергія пераадолення».

Артыкул М. Тараткевіча «Прастора запатрабаванняў» прапануецца пад рубрыкай «У свеце навукі».

Д. Бубноўскі, А. Краўцэвіч і А. Трусаў расказваюць пра Мір.

Згадкі В. Гапавай пра Ф. Абрамава «Адна зіма» і артыкул Э. Загарульскага «Слова і заходнія землі Русі» аб'яднаны ў раздзеле «Запіскі. Успаміны. Дакументы».

Змешчаны артыкул В. Нікіфаровіча «Масты дружбы», рэцэнзіі С. Саладоўнікава і Г. Коласа.

ЯШЧЭ РАЗ ПРА ЭНТУЗІЯЗМ

Любая важная і патрэбная справа, калі яна не на дзень і не на два разлічана, энтузіяста любіць і з энтузіязму пачынаецца. Асабліва, калі хочацца зрабіць нешта такое, што выходзіць за межы непасрэдных абавязкаў чалавека. Але раскажам па парадку...

Было гэта гадоў дваццаць назад. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры з вёскі Гудзевічы, што ў Мастоўскім раёне, Алесь Мікалаевіч Белакоз загарэўся жаданнем сабраць разам з вучнямі як мага больш матэрыялаў, якія б расказалі і пра мінулае краю, і пра культуру яго, пра людзей, што жылі тут раней і жывуць цяпер.

Захапіўшыся сам, настаўнік пачаў шукаць гэткіх жа аднадумцаў сярод школьнікаў. Адкрываў дарогу да дзіцячых сэрцаў не праз паўтарэнне на ўроках прапісных ісцін. Разумеў— празмерная «правільнасць» у выхаванні ніколі і нікому карысці не давала. Адчуваў: з малога можна зрабіць вялікае.

Алесь Мікалаевіч шмат расказваў вучням пра літаратурнае жыццё на Гродзеншчыне ў розныя часы, прыводзячы нямала звестак, пра якія ў падручніках нават і не ўпамінаецца. Называў прозвішчы знакамітых людзей, што нарадзіліся тут ці жылі альбо бывалі праездам. А яшчэ пастаянна напамінаў, што трэба беражліва, рупна збіраць усё, што тычыцца мінуўшчыны, каб захаваць найбольш каштоўнае для нашчадкаў.

Настаўнік пеставаў сваю даўнюю задумку—стварыць літаратурна-краязнаўчы музей. Няхай спачатку не музей гэта будзе, а пакойчык ці два — школа ж размяшчаецца ў непрыстасаваных драўляных будынках. І экспанаты для яго патрэбны самыя розныя.

Лісты з Гудзевічаў пачалі атрымліваць адрасаты Мінска і Масквы, Вільнюса і Гродна. Нават за мяжу адпраўляліся пісьмы — у Варшаву, Прагу. Не сам А. Белакоз пісаў, а вучні. І не пад яго дыктоўку. Шчырыя, непасрэдныя просьбы школьнікаў не маглі пакінуць абыякавымі і вядомых даследчыкаў беларускай літаратуры і краязнаўцаў, і знакамітых літаратараў. Адразу старэйшымі сябрамі і вопытнымі кансультантамі сталі для дзяцей мастак Пётра Сергіевіч, славутая Зоська Верас, пісьменнікі Адам Мальдзіс, Генадзь Кісялёў, Сцяпан Александровіч і іншыя...

Гэты ж ліст асабліва ўсхваляваў усіх. Пісаў у Гудзевічы Іван Мележ. Аўтар «Палескай хронікі» знайшоў час, каб уважыць просьбу юных краязнаўцаў: «Дарагія таварышы! Кожная мова ствараецца народам. Ствараецца на працягу многіх гадоў, многіх стагоддзяў. Мова — гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць як нельга не паважаць родны народ. Той, хто не паважае родную мову, не паважае роднага народа. Трэба любіць і вывучаць родную беларускую мову. Трэба любіць і ведаць беларускую літаратуру — літаратуру, што стварыла нямала выдатных твораў, якія праславілі наш народ на ўвесь Савецкі Саюз».

Напісаў гэта І. Мележ у 1966 годзе, за тры гады да адкрыцця музея. Падахвоціў да важнай справы, пажадаў поспехаў. Прыйшлі ўхвальныя лісты і ад іншых пісьменнікаў, а з імі — кнігі з аўтографамі, чарнавікі рукапісаў. Дасыраліся унікальныя выданні, што выходзілі на пачатку стагоддзя ці перад вайной, нават такія, якіх засталіся лічаныя экземпляры... Гэтыя і многія іншыя экспанаты размясціліся ў адным з пакояў школы.

Год 1969 стаў годам нараджэння ў рэспубліцы яшчэ аднаго школьнага музея — Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага... Тады не многія ведалі, што пры ўсёй сваёй звычайнасці — колькі музеяў спрабуюць стварыць энтузіясты!— ён усё ж незвычайны. І па колькасці сабраных матэрыялаў, і па значнасці іх, і па размаху работы. Першым адчуў гэта А. Мальдзіс. На адной са старонак кнігі «Таямніцы старажытных сховішчаў», выдадзенай у 1974 годзе, гаворачы пра рупнае захаванне ўсяго, што звязана з гісторыяй народа, ён не хаваў захаплення: «Тое, што я пабачыў у Гудзевічах, называць музеем у пэўным сэнсе гэтага слова, можа, яшчэ і гучнавата. Адзін пакой, просценькія стэнды... Але экспанаты ёсць. Я ўпэўнены, што літаратуразнаўцы XXI стагоддзя ды і больш блізкага часу не раз будуць выкарыстоўваць матэрыялы, сабраныя ў Гудзевічах, спасылацца на іх».

Пра самі экспанаты — крыху ніжэй. А цяпер пра тое, што магло б стаць з гэтым музеем у далейшым і што з ім стала... У пакойчыку было цесна. Размясцілі на сценах, на самаробных стэлажах самае неабходнае. Цяжкасці не ў тым, што не хапала памяшканняў. Будзем шчырымі — дзеці адразу зразумелі свайго настаўніка, а вось некаторыя дарослыя дзядзькі і цёткі ў раёне, ды і ў школе — не. Сёй-той не хоча разумець гэтага і па-сённяшні дзень. Зразумела, энтузіязм А. Белакоза патухнуць не мог—не той чалавек Алесь Мікалаевіч, каб адступіцца ад задуманага. Але ў краязнаўчай рабоце, які і ў любой іншай справе, да энтузіязму яшчэ грошы патрэбны: каб заплаціць за афармленне стэндаў, набыццё паасобных экспанатаў.

І тут з'явіўся ў Гудзевічах... Не добры чараўнік, вядома, а новы старшыня калгаса Міхась Сцяпанавіч Пронька. Тутэйшую гаспадарку «Гудзевічы» вырашылі аб'яднаць з суседняй «Іскрай» — так узнік новы калгас імя Карбышава, які і ўзначаліў «іскраўскі» старшыня Пронька. Ці А. Белакозу захацелася пашукаць аднадумца, ці душой адчуў, што старшыня якраз той чалавек, хто і дапаможа ў стварэнні музея. Завітаў ён да Міхася Сцяпанавіча і... найшоў падтрымку.

З той першай сустрэчы і пачалося, калі можна так сказаць, краязнаўчае сяброўства Белакоза і Пронькі. І па сённяшні дзень працягваецца. Выпрабаванне — першае, найбольш значнае — яно вытрымала тады, калі трэба было перавезці старую хату з суседняй вёскі Семярэнкі ў Гудзевічы, каб размясціць у ёй этнаграфічны музей. Грошы калгас выдзеліў і цесляў знайшоў. Пасля ўзвядзення 1982 годзе новага будынка сярэдняй школы ўзнікла пытанне: як быць з музеем? На працягу двух гадоў экспанаты размяшчалі ў чатырох пакоях старога памяшкання, а ў 1984 годзе літаратурна-краязнаўчы музей перажыў сваё другое нараджэнне. Амаль трыццаць тысяч рублёў каштавала калгасу гэтае перасяленне.

— Спачатку і падумаць не маглі,— прызнаецца Пронька,— што калгаснікі будуць хадзіць у музей. Вучні — гэта зразумела... А цяпер — звычайная з'ява. Асабліва любяць заходзіць вяскоўцы ў старую хату, дзе размешчаны этнаграфічны музей, каб каторы ўжо раз паглядзець, як жылі людзі раней. І наведванне гэтага музея, і літаратурна - краязнаўчага ўзнімае чалавечую годнасць сучаснага селяніна.

ТАКОЕ ЎБАЧЫЦЬ — ДУШУ ЎЛАГОДЗІЦЬ

Каця Ланцэвіч і Люда Навіцкая — экскурсаводы добрыя, дасведчаныя. Алесь Мікалаевіч сам мог пра ўсё расказаць, але даручыў гэтую справу дзвюм сціплым дзяўчынкам. Экскурсіі Каці і Людзе не ўпершыню праводзіць. Абедзве члены савета музея, абедзве цікавяцца роднай літаратурай. Асабліва Каця Ланцэвіч, якая спрабуе пісаць вершы.

У этнаграфічны музей...

ГУДЗЕВІЦКІ ВАРЫЯНТ

Дзяўчаткі расказваюць па чарзе: пра адну залу — адна, пра другую — другая. Нельга не здзіўляцца, колькі ведаюць яны пра кожны экспанат. Нават у гэтым выяўляецца школа Белакоза. Усё, што сабрана ў залах літаратурна-краязнаўчага музея вымагае да сябе зацікаўленага стаўлення. А. Мальдзіс не памыліўся, калі яшчэ тады, пасля першых знаёмстваў і з Белакозам, і з яго памочнікамі, прадказваў, што літаратуразнаўцы неаднойчы будуць завітваць сюды. І гісторыкі таксама, і краязнаўцы. Такое ўбачыць — толькі душу ўлагодзіць. Экспанатаў нямала — каля шасці тысяч. У іх — і гісторыя Гудзевічаў, і тыя дарогі, якія ў розныя часы прыводзілі сюды знакамітых людзей.

Школьнікі разам з Алесем Мікалаевічам устанавілі паходжанне сваёй вёскі. Аказваецца, балтаў і ліцвягаў, якія асімілiраваліся прыкладна ў чатырнаццатым стагоддзі, мясцовае насельніцтва называла «гудас». Гудзевічы — вёска старая. Аб існаванні паселішча ўпамінаецца ўжо ў грамаце, пісанай у 1539 годзе. У музей яна трапіла ажно з Кракава. А пад стэндам яшчэ адзін унікальны экспанат: арыгінал маніфеста Аляксандра II аб адмене прыгоннага права. Тут жа ўспаміны пра тую даўнюю часіну. Сведка колішніх падзей Язэп Шэмет з вёскі Дубляны шмат расказваў аб гэтым сваім дзецям, тыя ўнукам. Так і трапілі запісы ў музей. Была праведзена не проста пошукавая — даследчыцкая праца.

Шмат зрабілі вучні, каб сабраць звесткі пра жыццё М. Арла, беларускага паэта, творчасць якога высока ацэньвалі яшчэ Максім Багдановіч і Максім Гарэцкі. Праўда, М. Гарэцкі ў «Гісторыі беларускае літаратуры», выдадзенай у 1920 годзе, меркаваў, што псеўданімы М. Арол і Д. Янук належаць аднаму і таму ж чалавеку. З таго часу і ўсталявалася гэтая думка. Гудзевіцкія школьнікі ўстанавілі, што гэта розныя людзі. Вучаніца М. Белакоз працягвала цікавіцца абставінамі жыцця М. Арла і тады, калі стала студэнткай. Прысвяціла яму спачатку курсавую, а потым і дыпломную работу.

А звесткі пра заходнебеларускага паэта Міхася Явара? Дзеці адшукалі магілу яго каля вёскі Міневічы. Самі зрабілі і паставілі помнік, а жыццю М. Явара прысвяцілі ў музеі асобны куточак. Сярод экспанатаў — рукапіс верша Міхася Машары «Міхасю Явару. Замест вянка на магілу», датаваны 1933 годам, скульптурны партрэт паэта, зроблены С. Быкам, тэксты пяці вершаў, раней невядомых.

Калі ўжо гаворка зайшла пра вяртанне з небыцця імёнаў творцаў, нельга не згадаць і пра пяснярку Агату Тарасевіч. Чалавек няпростага лёсу, яна нарадзілася ў 1888 годзе ў вёсцы Пілкі цяперашняга Гудзевіцкага сельсавета. Застаўшыся без мужа, адна выхоўвала траіх дзяцей. Вершы А. Тарасевіч былі знешне някідкія, але шчырыя і непасрэдныя, таму вяскоўцы завучвалі іх, пераказвалі.

Да самай смерці падтрымлівала сувязь з музеем Ларыса Геніюш. У Гудзевічах яна калісь вучылася ў школцы, тут жылі блізкія і дарагія ёй людзі. Рупна сабралі школьнікі матэрыялы аб паэтэсе. На відным месцы яе верш «Гудзевічы», пазначаны 1966 годам:

Гудзевічы, род мой незабыты,
беларуская мая сям'я.
Дождж змывае з
надмагільнай пліты
дарагое дзедава імя...

Поруч — здымкі лётчыкаў-касманаўтаў СССР Пятра Клімука і Уладзіміра Кавалёнка. Такое суседства — апраўдана. Клімук прыслаў у музей кніжку вершаў Л. Геніюш «Невадам з Нёмана» з даравальным надпісам, Кавалёнак — свой здымак, які пабываў у космасе. Каб у Гудзевічах не пабываў, дык наўрад ці ўведаў бы, што Клімук чытаў і чытае вершы Л. Геніюш.

Хочацца называць усё новыя і новыя экспанаты. Хіба можна не нагадаць, што ў музеі ёсць такія унікальныя выданні, як брашура К. Маркса «Барацьба класаў у Францыі 1848—1850 гг.», выпушчаная Беларускім сялянска-работніцкім клубам у Вільні ў 1929 годзе, нумары дзіцячага часопіса «Заранка» і штомесячніка «Беларуская борць» з аўтографамі іх рэдактара Зоські Верас (пра яе Алесь Мікалаевіч можа расказваць шмат, бо так многа дапамагла і дапамагае З. Верас музею). А дзе яшчэ можна пабачыць зборнік вершаў Цёткі «Скрыпка беларуская» — яго падарыў музею пісьменнік А. Пяткевіч?! Ды і не многія школьныя музеі могуць пахваліцца аўтографамі Расула Гамзатава, Алеся Ганчара, Пятра Панча, Якава Хелемскага, іншых вядомых савецкіх пісьменнікаў.

Аднак не трэба думаць, што ў Гудзевічах ганяюцца за арыгінальнымі экспанатамі, а збор іх ператвараецца ў самамэту. Наадварот, тут беражліва збіраюць і захоўваюць і ўсё тое, што мае адносіны да сённяшняй беларускай літаратуры. Падобных матэрыялаў нават большасць. І ўсё да месца. Скажам, аўтаручка, якой Уладзімір Караткевіч пісаў свой раман «Каласы пад сярпом тваім» (яе прыслаў А. Мальдзіс), знаходзіцца на стэндзе, які апавядае пра паўстанне 1863 года. Стэнд пра пісьменнікаў, што нарадзіліся на Гродзеншчыне, няблага дапаўняюць рукапісы, кнігі з аўтографамі, паасобныя публікацыі А. Карпюка, Д. Бічэль-Загнетавай, Я. Брыля, В. Адамчыка,

З аўтографам Зоські Верас.

У адной з залаў.

А. Пяткевіча... Падобных матэрыялаў у музеі шмат. Бачыш кнігі, пазнаеш почырк К. Крапівы і М. Танка, А. Асіпенкі і А. Кулакоўскага, І. Навуменкі і С. Грахоўскага, В. Быкава і Я. Скрыгана, Р. Барадуліна і І. Чыгрынава, Н. Гілевіча і А. Петрашкевіча, Б. Сачанкі і А. Вярцінскага...

Матэрыялы літаратурныя добра суседнічаюць з экспанатамі гісторыка-краязнаўчага характару. Нямала папрацавалі школьнікі, каб устанавіць імёны актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў былой Заходняй Беларусі, якія змагаліся на тэрыторыі цяперашняга Гудзевіцкага сельсавета. Так з'явіўся стэнд «Жыхары вёскі Ляткі — члены Беларускай сялянска-работніцкай грамады».

Ёсць у музеі зала народнага мастацтва, дзе прадстаўлены ўзоры ткацтва, кавальства, вышыўкі, ганчарства, вырабаў з саломы і лазы, узоры гудзевіцкіх строяў...

Асобна размешчаны работы прафесійных і самадзейных мастакоў. Сярод аўтараў—М. Купава і А. Марачкін, А. Кашкурэвіч і Я. Шунейка, а таксама

Пра народнае мастацтва расказвае А. БЕЛАКОЗ.

Так жылі нашы продкі.

Г. Мазураў, А. Багустаў, Л. Трахалёва. Выкананы партрэты вядомых пісьменнікаў і дзеячаў культуры, блізкіх ім людзей, прадстаўлены пейзажы. Гаворка пра жыццё краю, пачынаючы з пятнаццатага стагоддзя, набывае сваё лагічнае завяршэнне. І наведвальнікі, пазнаёміўшыся з літаратурна-краязнаўчым музеем, кіруюцца ў этнаграфічны, са знешнім выглядам якога знаёмы многія— Міністэрства сувязі СССР выпусціла нядаўна спецыяльны канверт з малюнкам хаты.

ДАПАМОЖАМ... БЕЛАКОЗУ

Прадбачым, як сёй-той з чытачоў скептычна ўсміхаецца. Маўляў, калі і дапамагаць, дык тым музеям — і школьным, і калгасным, якія знаходзяцца на пачатку сваёй дарогі. Аднак менавіта гэта мы і маем на ўвазе. Дапамагаць трэба не толькі Алесю Мікалаевічу і яго выхаванцам, якія робяць добрую, карысную справу. Дапамогі чакаюць у с е Белакозы — гэткія ж энтузіясты, якіх у рэспубліцы нямала. Яны клапоцяцца не аб звычайным «накопительстве», калі хочацца мець у сваім музеі ўсё пад рукой. Яны дбаюць, каб вясковыя людзі мелі магчымасць штодня далучацца да гісторыі краю, каб школьнікі вырасталі, разумеючы патрэбнасць працы — стваральнай, творчай, незалежна ад таго, якую спецыяльнасць яны выберуць у далейшым.

Ухвалы заслугоўвае і спецыяльная ткацкая майстэрня, якая створана ў Гудзевіцкай школе. Дзеці ткуць паяскі, гальштукі. Вырабы вызначаюцца арыгінальнасцю, блізкасцю да народных традыцый. Пасобныя з іх пасланы вядомым пісьменнікам, дзеячам мастацтва. А рукапісны часопіс «Праменьчык», што колькі гадоў выпускаецца тут?!

Чаму б і ў іншых школах не праводзіць, як гэта робіць у музеі А. Белакоз, этнаграфічна-фальклорныя вечары? Можна і ў звычайным класе. Гэтаксама трэба, каб сустрэчы з ветэранамі вайны і працы сталі тымі ўрокамі грамадзянскасці, якія вучаць любіць Радзіму, быць вернымі рэвалюцыйным, баявым і працоўным традыцыям свайго народа, як гэта робяць у Гудзевічах.

Нядаўна прынятая пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнні выкарыстання клубных устаноў і спартыўных збудаванняў» якраз і скіроўвае ўвагу ў гэтым кірунку. У важным партыйным дакуменце адзначаецца: часам «недастаткова ўдзяляецца ўвагі ідэйна-маральнаму выхаванню, прапагандзе савецкага ўкладу жыцця, выкрыццю буржуазнай ідэалогіі і маралі, пераадоленню спажывецкай псіхалогіі, рэлігійных перажыткаў, барацьбе з п'янствам і іншымі антыграмадскімі праяўленнямі», падкрэсліваецца, што «яшчэ не ў поўнай меры выкарыстоўваецца наяўная матэрыяльная база ў мэтах камуністычнага выхавання, арганізацыі вольнага часу, развіцця творчых здольнасцей і фізічнай загартоўкі насельніцтва».

Усё гэта тычыцца і работы музеяў. Школьных — таксама. Тое, што ўдалося ў Гудзевічах, варта пераймання. Памятаеце, як радаваўся Пронька, што і калгаснікі пачалі часта заходзіць у этнаграфічны музей. Нават некаторыя з выпівох... Разумеем, што толькі стварэннем музеяў гэтае сацыяльнае зло не выкараніш, і ўсё ж...

У Гудзевічах жывуць новымі планамі. Як заўсёды, ініцыятыву праяўляе Алесь Мікалаевіч. Насустрач ахвотна ідзе Пронька. Мяркуецца стварыць, няхай спачатку і не музей, пакой баявой і партызанскай славы. Працоўнай таксама. І музей камянёў. Ён размесціцца пад адкрытым небам. А хіба не цікавая задума — мясцовы музей лёну?! Ды і стары вятрак, які ўдалося адшукаць ля адной з вёсак, варта перавезці ў Гудзевічы. Ля этнаграфічнага музея будзе размешчаны свіран...

Правільна зрабіў сакратарыят праўлення Саюза пісьменнікаў рэспублікі, які заслухаў на адным з пасяджэнняў справаздачу Васіля Віткі (ён летась узначальваў прадстаўнічую дэлегацыю літаратараў, што выязджала ў Гудзевічы) і прыняў рашэнне шырока прапагандаваць вопыт работы мясцовага музея. Тады ж Бюро прапаганды мастацкай літаратуры было даручана дапамагчы яму шэрагам матэрыялаў для пашырэння і ўзбагачэння экспазіцыі. Прыемна, што многія пісьменнікі працягваюць дасылаць у Гудзевічы свае кнігі з аўтографамі, іншыя матэрыялы. ...Тое, што робіць А. Белакоз і яго аднадумцы, можна і трэба назваць гудзевіцкім варыянтам далучэння вучняў і ўсіх жыхароў да гісторыі краю, літаратуры. Магчыма, у гэтай рабоце ёсць і штосьці спрэчнае, ды толькі шмат чаму можна і трэба павучыцца. Будзеце ў Мастах ці Гродне — не пашкадуйце часу, завітайце ў Гудзевічы. Балазе, зрабіць гэта не цяжка — у вёску рэгулярна ходзяць аўтобусы і з раённага, і з абласнога цэнтра.

Ул. КРУК (фота),
Алесь МАРЦІНОВІЧ,
спецыяльныя карэспандэнты «Літаратуры і мастацтва».

КОНКУРС КНІГАЛЮБАЎ

З 1 жніўня 1985 года па 1 жніўня 1986 года калегія Дзяржкамітэта БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні, сакратарыяты Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў БССР, прэзідыум Рэспубліканскага праўлення добраахвотнага таварыства аматараў кнігі БССР праводзяць рэспубліканскі конкурс на лепшае апавяданне, нарыс, верш, артыкул, карэспандэнцыю для друку, тэле- і радыёперадачу аб кнізе, аб яе ролі ў жыцці савецкага чалавека, аб рабоце арганізацый і актывістаў таварыства кнігалюбаў па прапагандзе кнігі, павышэнні эфектыўнасці выкарыстання кніжных фондаў масавых, спецыяльных і асабістых бібліятэк.

Конкурс праводзіцца пад дэвізам «Кніга ў нашым жыцці».

Пераможцамі конкурсу будуць прызнаны аўтары апавяданняў, нарысаў, вершаў, артыкулаў, карэспандэнцый, радыё- і тэлематэрыялаў, якія адлюстравалі прыклады актыўнай работы па прапагандзе літаратуры, прысвечанай выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС, пленумаў ЦК КПСС, выкананню Харчовай праграмы СССР, 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне; мэтанакіраваную і плённую дзейнасць кнігалюбаў па прапагандзе грамадска-палітычнай, мастацкай, навукова-тэхнічнай, сельскагаспадарчай літаратуры; вопыт работы клубаў кнігалюбаў, грамадскіх бібліятэк, народных кніжных магазінаў, кіёскаў, школьных кааператываў «Юныя сябры кнігі», іншых грамадскіх фарміраванняў кнігалюбаў па прапагандзе кнігі сярод моладзі; прыклады шэфскай дапамогі інвалідам Вялікай Айчыннай вайны, ветэранам працы, партыі і іншым катэгорыям заслужаных людзей (дастаўка кніг на дом, аказанне дапамогі ў выбары кніг і г. д.); яркія прыклады па аказанні шэфскай дапамогі кнігалюбам сяла, жыхарам аддаленых населеных пунктаў у сустрэчы з кнігай (збор і адпраўка бібліятэк, арганізацыя кніжнага гандлю, лекцый і г. д.); высакародны пачын уладальнікаў уласных бібліятэк, што даюць свае зборы для грамадскага карыстання; шырокае выкарыстанне розных форм і метадаў прапаганды кнігі (правядзенне літаратурных вечароў, дыспутаў, чытацкіх канферэнцый, кніжных выставак, віктарын, сустрэч з аўтарамі кніг і г. д.); высокі арганізацыйны і ідэйна-выхаваўчы ўзровень кнігалюбных мерапрыемстваў.

Для пераможцаў конкурсу ўстаноўлены наступныя формы заахвочвання: **за лепшае апавяданне** — дыплом Саюза пісьменнікаў БССР і грашовая прэмія ў суме 100 рублёў; **за лепшы верш** — дыплом Саюза пісьменнікаў БССР і I грашовая прэмія ў суме 100 рублёў; дыплом Саюза пісьменнікаў БССР і II грашовая прэмія ў суме 60 рублёў; дыплом Саюза пісьменнікаў БССР і III грашовая прэмія ў суме 40 рублёў; **за лепшы нарыс у друку** — дыплом Саюза пісьменнікаў БССР і грашовая прэмія ў суме 80 рублёў; **за лепшы артыкул у друку** — дыплом Саюза журналістаў БССР і грашовая прэмія РП ДТК у суме 70 рублёў; **за лепшую карэспандэнцыю ў друку** — дыплом РП ДТК і прэмія ў суме 60 рублёў, дыплом Саюза журналістаў БССР і II грашовая прэмія ў суме 30 рублёў, дыплом СЖ БССР і III грашовая прэмія ў суме 20 рублёў; **за лепшы радыёматэрыял** — дыплом СЖ БССР і грашовая прэмія ў суме 60 рублёў; **за лепшы тэлесюжэт** — дыплом СЖ БССР і грашовая прэмія РП ДТК БССР у суме 80 рублёў.

Літаратурныя матэрыялы, надрукаваныя ў прэсе, копіі матэрыялаў, якія прагучалі па радыё і паказаны па тэлебачанні, дасылаць у Рэспубліканскае праўленне ДТК БССР (Мінск, Ульянаўская, 22).

НА ЦЭНТРАЛІЗАВАНУЮ СІСТЭМУ

Увесь час пашыраецца сетка масавых бібліятэк у індустрыяльным Барысаве. За апошні час яны адкрыліся ў раённай бальніцы, вучылішчы лесаводаў, яшчэ ў дзвюх сярэдніх школах. Цяпер штодзённа ў горадзе расчыняюць дзверы для наведвальнікаў 67 бібліятэк. Агульны кніжны фонд іх дасягае амаль паўтара мільёна кніг.

Новай формай работы стала цэнтралізацыя масавых бібліятэк. Дзякуючы ёй барысаўчане маюць магчымасць паўней карыстацца багатым кніжным скарбам і перыядычнымі выданнямі, якія маюцца ў наяўнасці ва ўсіх філіялах і падраздзяленнях цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм.

За дасягнутыя поспехі, высокія паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве Барысаўская цэнтральная бібліятэка ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Яна па праву носіць званне «Бібліятэка выдатнай работы», з'яўляецца рэспубліканскай і абласной школай перадавога вопыту, базай для правядзення абласных і рэспубліканскіх семінараў бібліятэчных работнікаў.

Цяпер бібліятэкары плённа працуюць над ажыццяўленнем нядаўна прынятай пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнні выкарыстання клубных устаноў і спартыўных збудаванняў», дастойнай падрыхтоўцы да XXVII з'езда партыі. Гэтаму адпавядаюць разнастайныя масавыя мерапрыемствы: літаратурныя агляды навінак і дыспуты аб прачытаных кнігах, сустрэчы з паэтамі і празаікамі, выступленні на прадпрыемствах, установах, у бібліятэках разгорнуты тэматычныя стэнды і выстаўкі, кніжныя вітрыны.

П. БАРОДКА.

ДАПАМАГАЕ Ў ПРАЦЫ

Дамагчыся высокіх паказчыкаў у рабоце працаўнікам калгаса імя Калініна Драгічынскага раёна дапамагае кніга. Актывісты пярвічнай арганізацыі таварыства кнігалюбаў знаходзяць новыя шляхі, каб прыцягнуць да чытання вяскоўцаў — праводзяць агляды навінак, збор папярэдніх заказаў па тэмпланах выдавецтваў, кніжныя базары. Асаблівую ўвагу надаюць кнігалюбы прапагандзе і распаўсюджванню кніг па паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу ў сельскай гаспадарцы, выкананні Харчовай праграмы краіны.

З гэтай мэтай праводзяцца літаратурныя вечары, сустрэчы з вучонымі, спецыялістамі, супрацоўнікамі выдавецтваў. Кожную новую кнігу па прапагандзе перадавога вопыту актывісты, бібліятэчныя работнікі абавязкова данясуць да спецыялістаў, калгаснікаў, пазнаёмяць з яе зместам проста ў полі, у час абедзеннага перапынку, нават на ранішніх планёрках. І ўсё самае лепшае тут стараюцца прыстасаваць да мясцовых умоў, укараніць у вытворчасць. Вялікая работа праводзіцца таксама па прапагандзе і распаўсюджванні мастацкай літаратуры.

М. КРУКОЎСКІ.

АДНАЎЛЕННЕ СТАРОГА ГОРАДА

Рэстаўрацыяй помніка беларускага дойлідства XVII стагоддзя — трохпавярховага Езуіцкага калегіума, у якім размесціцца экспазіцыя Рэспубліканскага музея сацыялістычнага пераўтварэння Палесся, у Пінску пачалася рэканструкцыя старадаўняй — цэнтральнай часткі горада. Старажытны Пінск займае па колькасці помнікаў гісторыі і архітэктуры адно з першых месц у рэспубліцы. Ён стаў другім, пасля беларускай сталіцы, горадам, для якога распрацаваны і ўключаны ў генеральны план развіцця праект рэгенерацыі гістарычнага цэнтра.

Адметнасць праекта ў тым, каб максімальна зберагчы індывідуальнасць горада, архітэктурныя і гістарычныя помнікі. Яго аўтары — спецыялісты навукова-вытворчых майстэрань Міністэрства культуры БССР. Па іх задуме ў старым горадзе адкрыецца мноства гандлёвых устаноў, салонаў, кафетэрыяў.

Рэканструкцыя пройдзе пад знакам не толькі максімальнага зберажэння старажытнасці, але і яе выкарыстання. Пад шахматна-шашачны клуб, напрыклад, адноўлены дом мінулага стагоддзя. У пустуючым касцёле Карла Бараміўша, пабудаваным у XVII стагоддзі, які да гэтага часу захаваў цудоўную акустыку, размесціцца канцэртная зала. Вядуцца работы па рэстаўрацыі палаца Бутрымовіча, помніка свецкай архітэктуры XVIII стагоддзя, куды пераедзе гарадскі Палац піянераў.

М. ГОРСКІ.

«ГОРАД МОЙ — БЯССОННІЦА МАЯ!..»

ГЭТА БЫЛО НЕ проста здарэнне. Гэта была катастрофа. Але звернемся да фактаў.

У нумары за 11 чэрвеня 1885 г. «Кур'ер Варшаўскі» чытачоў сваіх насцярожыў наступнай нататкай: «Гродна, 10 чэрвеня. Тут нечакана ўзнік і ўсё больш разгараецца пажар. Даць рады стыхіі не хапае рук. На дапамогу выкліканы пажарныя каманды Беластока. Падрабязнасці ў наступным нумары».

Пакуль чытачы папулярнай тады ў нашым краі газеткі, атрымаўшы такую інфармацыю, гадалі, што ж там, у Гродне, адбываецца, агонь знішчаў новыя і новыя кварталы.

УЖО 22 ЧЭРВЕНЯ ў маскоўскіх «Осколках» (нум. 25 за 1885 г.) пад загалоўкам «НА ЛУНЕ» з'яўляецца такі фельетон А. П. Чэхава:

«Первый лунный астроном. Посмотри-ка, коллега, какой на Земле яркий свет на том месте, где город Гродно находится! Это, должно быть, громадный пожар... Вероятно, горит целый город.

Второй лунный астроном. Что вы, помилуйте! Просто где-нибудь блестящая увеселительная иллюминация.

Первый лунный астроном. Почему вы так думаете, коллега?

Второй лунный астроном. Я полагаю, что случись такой страшный пожар, то люди забегали бы, засуетились, начали собирать подписки на помощь погорельцам, образовались бы благотворительные комитеты, появился бы кружечный сбор в пользу лишившихся крова... А этого ничего нет; на Земле все тихо, спокойно и все предаются крепкому, мирному сну. Очевидно, что всё обстоит благополучно».

Пакуль Антон Паўлавіч едкай сатырай падбіваў грамадскасць да дзеяння, у Гродне ўжо працаваў камітэт дапамогі пагарэльцам. Душой яго стала Эліза Ажэшка. «Камітэтчыкі» ў першую чаргу звярнуліся да мясцовых багацеяў, але адгукнуцца яны не спяшаліся. У тэатры выконваліся потым куплеты «дывертысмента»: «Князь, дык вы дасце штонебудзь?» «Ах, так, пагарэльцы! Даў бы з вялікай радасцю, але ж учора давялося заплаціць за дзве ложы ў оперы». «Зразумела... А вы, барон? Самі ведаеце, колькі людзей начуюць пад голым небам на Фолюшы!» «А няхай сабе начуюць! Хто ім, скажыце, калі ласка, забараняў сваю маёмасць аформіць у страхавых кампаніях?»

Тады Ажэшка вырашыла дзейнічаць інакш.

Пані Эліза была ўжо добра вядомая сваімі творамі, надрукаванымі ў пецярбургскіх газетах і часопісах. Яна тэрмінова адправіла знаёмым рэдактарам зварот да чытачоў, а рэдактары яе пісьмы зараз жа змясцілі на старонках сваіх выданняў.

З УСІХ КАНЦОЎ неабсяжнай Расіі «камітэтчыкам» у Гродне пацяклі грошы. Нейкая жанчына з Украіны пісала: «7 руб. я сабрала ў суседзяў. Вельмі мала — амаль нічога, калі параўнаць іх з бядой Вашага горада. Але калі ўсе мы працягнем так руку дапамогі пагарэльцам...»

З Заходняй Сібіры другая звярталася з такімі словамі: «Муж мяне кінуў, жыву з дачушкай, сама краўчыха. Сёння, праглядваючы «Край» нум. 28, наткнулася на Ваш, паважаная Елізавета Пятроўна, зварот і так захацелася Вам памагчы! Высылаю 3 руб. На жаль, больш не магу. Разумею, такая дапамога — нішто, але хай і гэтая кропля майго і дачушкі маёй сэрцаў хоць крыху змякчыць долю шматпакутных гродзенцаў».

Гімназістка з Казані: «Калі мы ў «Заре» прачыталі Ваш зварот, а ў «Осколках» фельетон «НА ЛУНЕ», адразу вырашылі цэлым класам арганізаваць латарэю і выручаныя грошы адправіць Вашаму камітэту. Пасылаем 8 руб. і 46 кап.» і г. д.

Пісьмы такія ішлі з Уфімскай, Екацярынаслаўскай і іншых далёкіх губерняў. Ішлі з Якуціі і Сухум-Кале. У іх сустракаюцца такія ўзоры чалавечай чуласці, што і цяпер без хвалявання пісем тых чытаць нельга. Архівы нам захавалі каля 500 такіх пасланняў, а тысячы іншых сардэчных водгукаў члены камітэта разнеслі па сваіх кватэрах.

НЕЎЗАБАВЕ «КАМІТЭТЧЫКІ» валодалі ўжо фондам добраахвотнай дапамогі памерам у 190 000 рублёў — сумай для таго часу вялікай.

Праз дзесяць гадоў, па сведчанні старажылаў, ад пажару не засталося і следу. Але ў памяці гродзенцаў пажар жыў яшчэ доўга-доўга.

А яшчэ з той пары гродзенцаў быццам хто назаўсёды звязаў дружбай з усёй Расіяй. Стары і малы ведаў, каму ён абавязаны. У школах, установах і кватэрах з'явіліся партрэты маладога Чэхава не толькі з-за яго апавяданняў і п'ес; а калі здаралася Элізе Ажэшка захварэць, гараджане перад домам «Елізаветы Пятроўны» стыхійна высцілалі брук саломай, каб не грукацелі вазы і карэты.

ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ зноў уся краіна прыйшла на дапамогу Гродну.

На вачах аднаго пакалення з чыноўнага, купецкага, дробнасаматужнага Гродна ператварыўся ў буйны прамыслова-культурны, навуковы цэнтр з універсітэтам, філіялам Акадэміі навук, інстытутамі, арыгінальнымі сілуэтамі новых мастоў, гасцініц, жылых блокаў, тэатра, вакзалаў, з насельніцтвам у чвэрць мільёна чалавек.

Горад мой, бяссонніца мая,
Як мне не спяваць табе, скажы!
Свеціш ты краіне, бы маяк,
На яе заходнім рубяжы!

Кожнаму гродзенцу вельмі прыемна чуць водгукі гасцей аб густах мясцовых архітэктараў, будаўнікоў, аб дакладнай рабоце грамадскага транспарту, аб ахайнасці гродзенскіх вуліц, тратуараў, двароў, паркаў і сквераў, аб ззянні вітрын магазінаў і універмагаў. Старажылы ведаюць, што толькі «зеленгасаўскіх» ружаў у горадзе даводзіцца па кусту на сям'ю, што прамысловасць Гродна сваю прадукцыю зараз пасылае ў дзесяткі краін. Але гродзенцы памятаюць і тую, стогадовай даўнасці трагічную часіну, памятаюць тых, хто тады падаў гораду руку братняй дапамогі.

Аляксей КАРПЮК.

Навочны сведка Эліза Ажэшка так апісвае той жах:

«...Ашалелая віхура агню знішчае на попел сялібы... Паветра напоўнена горкім дымам, панічным гудзеннем званоў, стогнам і жахлівымі крыкамі. На вялізным Сенным рынку (сёння аўтастаянка па вул. Кашавога. — **А. К.**) — горы хатняга скарбу і клункаў. Мітусяцца звар'яцелыя натоўпы напалоханых насмерць людзей. Але агню яшчэ не відаць. Тут гавораць аб ім, як аб жывой істоце: «Ці прыйдзе Ен сюды?» «Куды ж уцякаць тады?» «Ці можна затрымаць Яго?»

Раптам пранізлівы крык заглушае гул званоў і трывожныя гукі вайсковых труб: «Прыйшоў!!!» «Вось яго ўжо бачым!» Над нізкімі дахамі Сеннага рынка выстраліла яркая свечка, вецер пагойдвае яе ў бакі і яна набухае, расце, вырыгаючы агромністыя клубы дыму. Грыміць выбух, падобны на гарматны стрэл, затым грымнула серыя выбухаў, і ўсё агортвае полымем. Якісьці мужычок у абгарэлай вопратцы, са счарнелым ад дыму тварам скача праз куфэркі, клункі і перакуленыя сталы. Хапаю яго за плячо, пытаюся: «Што там абрынулася з такім грукатам?» — «Дом Баторыя!» — кідае чалавек і бяжыць далей...»

АБ ПАЖАРЫ У ПЯЦІДЗЕСЯЦІТЫСЯЧНЫМ ГОРАДЗЕ пачалі пісаць кожны дзень газеты ўсёй Расійскай імперыі. А стыхія ўсё бушавала, ахопліваючы новыя вуліцы і кварталы — ёй не маглі ўжо даць рады пажарныя каманды ні ўсяе губерні, ні нават віленскія, што прыйшлі на дапамогу, ні кінутыя на тушэнне салдаты. У віхуры вогненных пратуберанцаў зажыва гарэлі людзі і хатняя жывёла. Скучанасць будынкаў і недасканаласць супрацьпажарнай тэхнікі таго часу прывялі да таго, што раз'юшаная стыхія з кожным днём набірала сілу.

Пажар бушаваў да тае пары, пакуль на чацвёртыя суткі не выдахся сам, ператварыўшы ў месяцападобны ландшафт добрыя дзве трэція горада. Разам з жылымі будынкамі былі знішчаны розныя ўстановы, малельні, бальніцы, школы, майстэрні, банкі і фабрыкі.

З-за антысанітарыі і летняй гарачыні над пагарэльцамі навісла пагроза эпідэміі. Дзесяткі тысяч гараджан засталіся без даху над галавой, вопраткі, сродкаў для існавання. «Разваротлівасць і гуманнасць» царскіх чыноўнікаў агульнавядомая. Роспачы гродзенцаў не было мяжы.

НА ЭКРАНЕ

з 12 па 18 жніўня

12 жніўня, 20.35

Музычная праграма з удзелам лаўрэата ўсесаюзных конкурсаў, салістні Белдзяржфілармоніі С. Кульпы і ансамбля народнай музыкі «Свята».

13 жніўня, 20.05

«ШЧОДРАСЦЬ ТАЛЕНТУ».

Выдатны савецкі паэт А. Твардоўскі. У перадачы прымаюць удзел народны пісьменнік Беларусі В. Быкаў і лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа М. Лужанін.

16 жніўня, 19.45

«НА ПРЫНЕМАНСКІХ ПРАСТОРАХ».

Літаратурна-мастацкі часопіс, падрыхтаваны Гродзенскай студыяй тэлебачання, расказвае аб памятных мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Ф. Багушэвіча.

17 жніўня, 13.05

«ЦІ ЛЮБІЦЕ ВЫ АПЕРЭТУ?»

Музычная праграма з удзелам артыстаў Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР. Вядуць перадачу А. Кузьмянкоў і А. Касцецкі.

17 жніўня, 14.05

Л. ЛЯВОНАЎ. «НАШЭСЦЕ».

Спектакль Калінінскага дзяржаўнага драматычнага тэатра.

17 жніўня, 20.30

Канцэрт Дзяржаўнага народнага аркестра БССР імя І. Жыновіча.

17 жніўня, 23.10

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

Музычная праграма з удзелам майстроў латвійскай эстрады.

18 жніўня, 11.00

«НАШЫ ГОСЦІ».

Томскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатр драмы.

18 жніўня, 12.00

«ЭКРАН, ЯКІ ЗМАГАЕЦЦА».

Па матэрыялах сімпозіума «Антыфашысцкая тэма ў кінамастацтве».

18 жніўня, 13.05

«ТАЯМНІЦЫ МАЙСТЭРСТВА».

Сустрэча з народным артыстам СССР А. Папанавым.

У «КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА»

АПАВЯДАННІ ПРА ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 2 р. 40 к.

П. БРОЎКА. Мая Радзіма. Вершы. Мн., «Юнацтва», 1985. — 20 к.

П. ГЛЕБКА. Шчаслівы май. Вершы. Мн., «Юнацтва», 1985. — 25 к.

М. ДУКСА. Твая пара сяўбы. Вершы. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 45 к.

Я. ЕРМАЛОВІЧ. Акопы не пазарасталі. Аповесці. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 1 р. 30 к.

І. МУРАВЕЙКА. Я прыдумаў казку. Вершы. Мн., «Юнацтва», 1985. — 30 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04334 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.